ЛІТАРАТУРА
І МАСТАЦТВА

ЛіМ

ГАЗЕТА
ТВОРЧАЙ ІНТЭЛІГЕНЦЫІ
БЕЛАРУСІ

12 верасня 1997 г. № 37/3913 Кошт 3 000 руб.

"СЭНС ЖЫЦЦЯ — У САМІМ ЖЫЦЦІ..."

Святлана АЛЕКСІЕВІЧ: "Спачатку мы павінны былі заняцца дэмакратычнымі пераўтварэннямі, а потым ужо спакваля гаварыць пра нацыянальныя ідэі... Мне не падабаецца, калі беларускі народ падаюць як нейкую міфічную істоту, — давайце ж вылазіць са сваіх акадэмій і разглядаць яго! Што гэта за народ і чаго ён хоча? У нас жа ўсё наадварот — і ў выніку, падабаецца нам тое ці не, — з народам гаворыць толькі Лукашэнка, а той яго слухае... Таму зараз я магу з упэўненасцю сказаць: нішто столькі шкоды не прынесла нацыянальнай ідэі, як фанатызм і сектанцтва Зянона Пазняка..."

5

ДВА ПОЛЮСЫ АДНОЙ КУЛЬТУРЫ

Погляд Навума ГАЛЬПЯРОВІЧА, Алеся АРКУША і Сержука ШЫДЛОЎСКАГА на сучасную літаратуру з Наваполацка

6—7

ЗАБОЙСТВА ПА-ТУТЭЙШАМУ

Апавяданне Алеся ДРАЯНКОВА

9, 12

ЧАЛАВЕК РАСКРЫВАЕ ЧАЛАВЕКА

Данатас БАНІЁНІС: "Трукі, фокусы, вонкавыя значнасці, дымавая заслона на сцэне — гэта не мой стыль. Калі хочаш вывучыць прыроду чалавечую, не прамінеш ні старажытных, ні Фрэйда, ні Фрома, ні Дастаеўскага, але ж усе яны толькі спрабавалі яе вывучыць, толькі падступаліся. А чалавека ведае хіба Спадар Бог..."

10—11



Людна было ў старажытным нясвіжскім парку 7 верасня. Сюды завітала штогодняе свята пісьменства і друку. Тут дзіўна перапляліся мінулае з сучасным, царкоўнае са свецкім, класічнае з народным. Угледзьцеся ў гэтыя твары: засяроджаны — айца Сергія, які нясе непагасны агонь ад Гроба Гасподня, усмешлівыя — дзяўчатак і жанок. Кнігі захоўваюць для нас назапашанае душой і жыццёвым досведам, здымкі — перажытыя імгненні...

Фота Віт. АМІНАВА

Матэрыял пра свята чытайце на 2-ой старонцы

БУДЗЬМА РАЗАМ!

Шаноўныя чытачы, да 17 верасня працягнута падпіска на "ЛіМ" на чацвёрты квартал 1997 года. Падпісацца можна ў любым паштовым аддзяленні.

Кошт падпіскі на квартал — 30 тысяч рублёў, на месяц — 10 тысяч.

Наш індэкс — 63856.

КОЛА ДЗЁН

Падобна на тое, што "Справа Шарамета" з аднолькавым поспехам можа як закончыцца заўтра, так і цягнуцца яшчэ некалькі месяцаў, калі не гадоў. І ніхто не зможа сказаць, ад чаго (не ад каго, а ад чаго) залежыць хутчэйшае яе завяршэнне. Але, пэўна ж, цяпер ужо не ад пазіцыі Расіі. Бо чым далей, тым болей паводзіны расійскіх лідэраў у гэтай сітуацыі выглядаюць хісткімі. Надта ж геапалітычна патрэбная ім Беларусь, калі яны дазваляюць гэтак абыходзіцца з імі. Ужо двойчы Б. Ельцын пасля размоў з А. Лукашэнкам абяцаў, што вызваленне Шарамета — справа "аднаго-двух дзён". А. Лукашэнка нібыта не супярэчыў яму, але рабіў па-свойму. І Ельцын у адказ — адмоўчваўся, "інтэграцыя" даражэй?.. На гэтым "слабым месцы" Расіі можна яшчэ доўга гуляць і з расійскім кіраўніцтвам, і з расійскай апазіцыяй. Кожны баіцца падацца адступнікам "вялікай ідэі", бо гэта адразу ж скарыстае супрацьлеглы бок. Прэзідэнт Беларусі зноў заявіў, што на расійскі "трон" не прэтэндуе — і ні "каманда Ельцына", ні "каманда Зюганава" пакуль нібыта ўсур'ёз яго ў разлік не бяруць. І дарэмна, як паказваюць менавіта апошнія падзеі.

САМІТ ТЫДНЯ

5—6 верасня ў Вільні адбылася прадстаўнічая Міжнародная канферэнцыя "Суіснаванне нацый і добрасуседства — гарантыя бяспекі і стабільнасці ў Еўропе". У канферэнцыі прынялі ўдзел кіраўнікі 11 краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, вядучыя палітычныя дзеячы міжнародных арганізацый, эканамісты і палітыкі самага высокага рангу з розных краін свету. Беларусь прадстаўляў прэзідэнт краіны А. Лукашэнка, запрашэнне якога на сустрэчу не ўсімі было ўспрынята адназначна. Канферэнцыя закончылася не падпісаннем нейкіх пагадненняў ці камюніке, а тым, што прэзідэнты краін усе разам пасадзілі ў Вільні дубок, які надалей будзе сімвалізаваць дружбу і добрасуседства...

ПАПУЛЯРНАСЦЬ ТЫДНЯ

Галоўнай "зоркай" Віленскага саміту стаў, як і чакалася, прэзідэнт Беларусі. І не столькі з-за скандалаў, што папярэднічалі яго прыезду на сустрэчу лідэраў краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, колькі з-за скандалаў, што суправаджалі ягонае знаходжанне ў Вільні. Прэзідэнт Беларусі быў адзіным, супраць прыезду каго быў наладжаны пікет "мясцовых беларускіх нацыяналістаў", і адзіным, супраць каго была выкрыта спроба... замаху на жыццё. На некалькі дзён першыя палосы ўплывовых летувіскіх газет былі аддадзены А. Лукашэнку, газета "Рэспубліка" нават назвала яго "чалавекам тыдня". І хай сабе адразу пасля саміту ўсе сем афіцэраў з летувіскай службы аховы краю, якіх арыштавалі за падрыхтоўку замаху на жыццё А. Лукашэнкі, былі выпушчаны на волю "з-за адсутнасці складу злачынства", і няхай сёння пішуць, што спробы замаху і блізка не было — "справа" ўжо зроблена і прагрымела на ўвесь свет. Таму міністр замежных спраў Беларусі І. Антановіч займеў усе падставы, каб заявіць, што на сустрэчы ў Вільні "наш прэзідэнт быў самым папулярным і прыцягальным".

АДТЭРМІНОЎКА ТЫДНЯ

Трохбаковыя перамовы паміж дэпутатамі Вярхоўнага Савета 13-га склікання і прадстаўнікамі Адміністрацыі прэзідэнта Беларусі пры пасрэдніцтве Савета Еўропы, якія павінны былі прадоўжыцца з 9 верасня, адкладзены на няпэўны тэрмін. Фармальнай прычынай адтэрміноўкі стала змена старшынства ў Еўрапейскім Саюзе: цяпер узначальвае яго міністр замежных спраў Люксембурга. А сапраўднай — ліст кіраўніка МЗС Беларусі І. Антановіча на адрас новага кіраўніка ЕС, у якім ёсць прапановы аб зменах "фармату і зместу" перамоў. Еўрапейскія пасрэднікі аказаліся не гатовымі да гэтага і ў Мінск не прыехалі.

СЕНСАЦЫЯ ТЫДНЯ

У другой палове кастрычніка (мажліва, 23—24) Беларусь наведае генеральны сакратар НАТА Хаўер Салана. Падчас візіту будзе канчаткова ўзгоднены, можа, нават і падпісаны, двухбаковы дакумент, у якім будзе адзначана сутнасць узаемаадносінаў Беларусі і НАТА. Не так даўно ў нечым падобныя дамовы былі падпісаны між Украінай і НАТА, а таксама Расіяй і НАТА. Але тады яшчэ Беларусь была катэгарычна супраць не толькі пашырэння НАТА на Усход, але ўсялякіх кантактаў з гэтай "капіталістычнай" арганізацыяй.

САЛІДАРНАСЦЬ ТЫДНЯ

Жаночы хрысціянска-дэмакратычны рух правёў 10 верасня ля помніка Ф. Дзяржынскаму насупраць будынка КДБ пікет у падтрымку былога старшыні Нацбанка Беларусі Т. Віннікавай, якая ўжо больш за паўгода знаходзіцца за кратамі. Удзельніцы пікета звярталі ўвагу ўлад на крытычны стан здароўя Т. Віннікавай і патрабавалі змяніць меру ўтрымання.

ЛІЧБА ТЫДНЯ

На 30 мільёнаў рублёў аштрафаваны старшыня БСДП (Народная Грамада) Мікалай Статкевіч за арганізацыю і правядзенне шэсця ў Дзень Незалежнасці. Нагадаем, што шэсце было санкцыянавана Мінгарвыканкамам, але ў самы апошні момант дазвол на праход па цэнтральнай паласе дарогі быў зменены на праход па тратуары, што дэманстранты, урэшце, і не выканалі... М. Статкевіч сёлета стаў абсалютным лідэрам па велічыні штрафу, але ў тых апазіцыянераў, суд над якімі не закончыўся (А. Лябедзька, В. Шчукін), ёсць магчымасць абысці лідэра ля самага фінішу.

ЗДАРЭННЕ ТЫДНЯ

У 7 гадзін раніцы 10 верасня адбыўся выбух у будынку народнага суда Савецкага раёна г. Мінска. Як вынік — дзірка ў сцяне дома, пабітае шкло ў вокнах. На шчасце, чалавечых ахвяр няма. Як паведаміла расійскае тэлебачанне са спасылкай на незалежную газету "Имя", адказнасць за выбух узяла на сябе Беларуская вызвольная армія, пра існаванне якой мы ўпершыню пачулі пасля выбуху на газаправодзе Таржок—Мінск—Івацэвічы.

СВЯТЫ

Пасеянае ўзыдзе

У нашай гісторыі ёсць імёны, пра якія лішні раз напомніць — толькі на карысць. Гэтыя імёны — святой Ефрасінні, Кірылы Тураўскага, Сымона Буднага, Васіля Цяпінскага, Францішка Скарыны — гучалі і будуць гучаць на штогодніх святах беларускага пісьменства і друку, што праходзяць у розных гарадах. Сёлетняе адбылося ў Нясвіжы і было прысвечана 480-годдзю беларускага кнігадрукавання.

Крочаць гаспадары і госці. На пярэднім плане: старшыня Нясвіжскага райвыканкама У. Дражын, У. Русакевіч, З. Прыгодзіч.



Ну і што нам пакажуць?..

Адкрывалася свята перад помнікам С. Буднаму. Праўда, урачыстасці напачатку не надта адчувалася. Мо таму, што месца выбрана няўдала (пляцоўка як бы "патанала" сярод людской грамады); можа, прамовы былі трошкі казённымі, а хутчэй за ўсё рэжысёры проста не знайшлі адпаведнага ходу, запеву, які стаў бы камертонам да ўсяго далейшага.

Паколькі свята гэтае ладзіцца сумесна з праваслаўнай царквой (у ранейшыя гады прысутнічаў сам уладыка Філарэт), то зусім натуральна прагучала блаславенне з вуснаў духоўнай асобы. Было падкрэслена, што горад Нясвіж шмат унёс у культурную скарбніцу Беларусі. Падзеі традыцыйна папярэднічала экспедыцыя "Шлях да святыняў". Ад кіраўніцы экспедыцыі Ніны Загорскай (акрамя яе, непагасную Лампаду суправаджалі В. Іпатава, З. Дудзюк, Н. Тулупава, І. Чарота, М. Матрунчык, С. Лаўшук і іншыя) я даведалася, што група творчай інтэлігенцыі разам з захавальнікам агню ад Гроба Гасподня айцом Сергіем Кузьмянковым прайшлі праз Мір, Івацэвічы, Косава, Целяханы, Пінск, Дастоева, Бярозу, Сноў, многія іншыя пасёлкі і вёскі. Усюды ладзіліся сустрэчы з прыхаджанамі, у цэрквах гучала не толькі беларускае слова, але і вершы. Манахіня Людміла Міхалкоўская так азначыла сваё ўражанне ад сустрэч з людзьмі: "Захапленне". У яе памяці захаваецца і воблік дзяўчынкі, якая, бы найбольшую каштоўнасць, несла праз дарогу запаленую свечку, і гасціннасць бацюшкі і матушкі з Івацэвічаў, і паважлівасць кіраўнічай вертыкалі з Косава. На жаль, усё гэта засталося "за кадрам" урачыстасці.

Асноўная дзея разгарнулася ў старажытным радзівілаўскім парку. Дзеля такога выпадку яго маляўніча афармілі высознымі снапамі, коламі, гірляндамі з рабіны. Памост для самадзейных артыстаў узвышаўся проста над стогам сена. Народныя майстры з'ехаліся не толькі з раёна, але і з іншых мясцін рэспублікі. Сямён Рыгоравіч Саўрыцкі, напрыклад, — лагайчанін. Керамікай заняўся ў сталым узросце па прыкладзе дачкі, якая скончыла мастацкае вучылішча. Уласнымі рукамі, "па сваім саабражэнні", зладзіўся ганчарны круг, а пасля і печ для абпальвання вырабаў. Ужо першыя яго глечыкі былі адабраны на міжнародную выставу ў Алжыры. Тут жа была выстаўлена і так званая абвараная кераміка яго зяця Рамана Раманчука. Цэлы сямейны падрад!

Гэта амаль што бой, вось толькі мячы не звіняць, а глуха бразгаюць. Тэатр!

Пра гісторыю свайго захаплення расказаў і Яўген Сцяпанавіч Бабкоў, афіцэр запасу, былы афганец. Колькі год таму, лежачы ў шпіталі, ён прачытаў у газеце пра выставу фларыстыкі ў мінскай бібліятэцы імя Пушкіна. Тое, што ён там пабачыў, пакарыла яго. А нас не могуць не пакарыць ягоныя кампазіцыі з каранёў, шышак, сухіх раслін. Яўген Сцяпанавіч, дарэчы, загарэўся ідэяй стварэння эксперыментальнай лясной школы для дзяцей, пра што не раз выказваўся ў друку.

Між тым у парку віраваў люд, а калі апоўдні лінуў дождж, усе пабеглі хавацца пад скляпенні княжацкага замка, пад густыя шаты дрэў. Старшыня аргкамітэта З. Прыгодзіч са скрухай канстатуе, што з-за ліўня давялося згарнуць свята дзіцячай кнігі "Напісанае застаецца". Не прыехалі самадзейныя артысты з Барысава, якія збіраліся выступіць з літаратурна-драматычнай кампазіцыяй аб жыцці У. Сыракомлі. Што ж тычыцца арганізацыйнага забеспячэння, то тут раённыя ўлады Нясвіжа, на думку першага намесніка старшыні Дзяржкамдруку З. Прыгодзіча, былі на вышыні.

З мастацкай праграмы, паказанай нясвіжцам і гасцям, трэба выдзеліць "Княжацкія забавы" — тэатралізаванае прадстаўленне з коньмі, збройнай дружынай, лучнікамі, якое чаргавалася з канцэртнымі нумарамі.

З таго, што пазначана ў праграме, многага паглядзець не ўдалося. Парк яўна не сталі псаваць "наглядной агітацыяй": ні ўказальнікаў, ні афіш-праграмак не было, і кожны бавіў час там, куды яго вывела сцяжына. У выніку агульнае святкаванне разбілася на астраўкі, крыху здрабнілася. На адным з астраўкоў мне падалося несправядлівым, што і старшыню пісьменніцкага саюза, і аднаго паважанага акадэміка забыліся назваць у ліку гасцей. Хто ж тады на свяце беларускага пісьменства найбольш паважаны?

Акрамя афіцыйных асоб, сярод якіх кіраўнік адміністрацыі прэзідэнта У. Русакевіч і старшыня аблвыканкама П. Пётух, у Дні беларускага пісьменства і друку ўдзельнічалі госці з Польшчы і Чэхіі, дэлегацыя з Украіны, пасол Украіны У. Жаліба, пасол Казахстана Ю. Клачкоў, аташэ па культуры Расійскага пасольства У. Жытнікаў. Асобна варта сказаць аб прэзідэнце чэшскага фонду імя Скарыны О. Кнотэку. Пад яго патранажам (а ён укладвае і асабістыя сродкі) 480-годдзе беларускага кнігадрукавання будзе адзначана і ў Празе, куды выедзе дэлегацыя нашай краіны.

У наступным годзе эстафету ад Нясвіжа прыме Орша.

Наш кар.

ІМПРЭЗЫ

У вялікім доме на Траецкай

Лічба "65" — не юбілейная, але знамянальная. Сёлета ёю пазначаныя афішы двух тэатральна-музычных калектываў, спакроўленых агульнай гісторыяй і... агульнымі сценамі. На пачатку верасня абодва гэтыя калектывы ўрачыста сустрэліся са сваімі гледачамі — у новым, 65-ым сезоне. Нацыянальны акадэмічны тэатр балета пад кіраўніцтвам Валянціна Елізар'ева адкрыў свой сезон ужо знакамітай пастаноўкай балета А. Мдзівані "Страсці" ("Рагнеда"). Праз некалькі дзён гаспадыняю свята ў доме на Траецкай гары паўстала нацыянальная оперная трупа: адбыўся адзін з нядаўніх прэм'ерных спектакляў — "Князь Ігар" А. Барадзіна.

У зале Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета — зноў атмасфера творчых фантазій, зменлівых эмоцый, чакання дзівосаў мастацтва, спадзеву на адкрыццё. Тым болей, што бліжэйшыя планы калектываў-"сваякоў" таксама сілкуюць спадзяванні ды фантазіі гледачоў.

Лідэр і кіраўнік Нацыянальнага тэатра балета Валянцін Елізар'еў рыхтуе прэм'еру шэдэўраў І. Стравінскага "Жар-птушка" ды "Вясна свяшчэнная". Падзеяй мае быць і творчая вечарына выдатнага нашага харэографа, прымеркаваная да ягонага 50-годдзя. А яшчэ — паказ працы маладых беларускіх балетмайстраў. Нацыянальны тэатр оперы зноў звяртаецца да геніяльных старонак "Барыса Гадунова" М. Мусаргскага. Адметна, што гэты добра знаёмы не аднаму глядацкаму пакаленню твор будзе ставіць наш вядомы "не оперны" рэжысёр М. Пінігін, які пазалетась дэбютаваў на акадэмічнай музычнай сцэне "Візітам Дамы" С. Картэса. Пакуль жа фанатам опернай класікі прапануецца зусім свежы, толькі пару разоў пры канцы мінулага сезона сыграны, спектакль "Травіята". Твор Д. Вердзі "перачыталі" (дарэчы, на мове арыгінала) музычны кіраўнік Аляксандр Анісімаў, рэжысёр Сусана Цырук, мастак-пастаноўшчык Людміла Ганчарова, салісты Наталля Кастэнка, Вікторыя Курбацкая, Сяргей Франкоўскі, Аркадзь Саўчанка, Юры Бастрыкаў ды многія іншыя.

Ва ўсім свеце "Травіяту" любяць і выканаўцы, і публіка. "Травіяту", класічную і абноўленую, чакалі ў Мінску. Пасля першых жа спектакляў пра "Травіяту" загаварылі: захапленне адных, спрэчкі другіх... Значыць, спектакль жывы. Значыць, мы абавязкова пра яго пагаворым.

А пакуль гаворым — "з новым годам!" З новым тэатральным годам гаспадароў, сяброў і гасцей вялікага дома на Траецкай гары!

С. Б.

На здымках: сцэны са спектакляў "Страсці" ("Рагнеда") і "Князь Ігар".

Фота Віт. АМІНАВА

ЭКСЛІБРЫС

Пакутнік за веру і Бацькаўшчыну

Т. Процька. Жыццё мітрапаліта Мельхісэдэка. Мінск, "Тэхналогія", 1996.

У жыццях і лёсах асобных людзей вельмі часта адбіваецца гісторыя ўсяго народа, краіны. Жыццё мітрапаліта Мельхісэдэка — яшчэ адно пацвярджэнне гэтаму. Айцец Мельхісэдэк, у свецкім жыцці Міхаіл Паеўскі, нарадзіўся ў сям'і беларускага праваслаўнага святара, царкоўнага гісторыка і краязнаўцы Льва Паеўскага. Па тагачаснай сямейнай традыцыі ён паступіў у семінарыю, а затым, як здольны вучань, і ў праваслаўную акадэмію, падчас вучобы ў якой прыняў манаскі пострыг.

Пачатак ягонага паслушання — у Магілёве, гэта і пачатак ягонай імклівай святарскай кар'еры. У 28 год ён — ігумен Брацкага Багаяўленскага манастыра ў Магілёве, у 29 год — пераведзены ў Бялыніцкі манастыр для годнага супрацьстаяння ксяндзу-казнадзею, які руйнуе тут пра адраджэнне каталіцкай парафіі. У 30 год ён архімандрыт, а яшчэ праз шэсць гадоў епіскап Таўрыцкі. У 39 год Мельхісэдэк — епіскап Ладажскі, вікарый Пецярбургскі. І толькі бальшавіцкі пераварот спыніў ягонае ўзыходжанне ў РПЦ.

У 1918 годзе ён вяртаецца на Беларусь напачатку ў чыне епіскапа Слуцкага, вікарыя Мінскага, але неўзабаве становіцца Мінскім епіскапам. Сямейнае выхаванне ў духу "тутэйшасці", павага да гісторыі Беларусі, асабістая абазнанасць і ўсведамленне сябе беларусам (у анкеце ГПУ за 1927 год епіскап Мельхісэдэк у графе нацыянальнасць уласнаручна напісаў: беларус) прывялі епіскапа разам з іншымі патрыятычна настроенымі святарамі-беларусамі да думкі пра ўтварэнне Беларускай аўтакефальнай царквы.

У чэрвені 1922 года з'яўляецца адозва, падпісаная епіскапам, у якой ён абвяшчае: "Захоўваючы еднасць у духу веры і любові з цэрквамі Расійскай і Украінскай, пакідаючы ў недатыкальнасці дагматы і строга трымаючыся кананічнага богаслужбовага парадку, Праваслаўная Царква ў Беларусі, якраз таму, што яна беларуская, жадае з гэтай веры ісці ўласным шляхам".

У выніку 10 ліпеня 1922 года была абвешчана аўтаномія Беларускай царквы, а епіскап Мельхісэдэк аб'яўлены мітрапалітам. Царква пачала актыўна працаваць дзеля духоўных і нацыянальных патрэб народа.

Камуністам таксама была непатрэбная Беларуская царква, пра што зноў-такі ў Маскву пісаў сакратар Багуцкі: "асабліва заўзятае правядзенне беларусізацыі царквы можа мець адмоўныя вынікі... Мы лічым, што са святарамі-вялікарусамі і наогул з уплывам вялікарускім нам лягчэй будзе змагацца і хутчэй можна будзе трымаць іх на паводзе, чым беларускіх нацыянальных папоў". Мітрапаліт і сам выступае па-беларуску. Менавіта таму у 1924 годзе па сфабрыкаванай справе яго назаўсёды высылаюць з Беларусі ў Расію, дзе ён, па чутках, атручаны ГПУ, памірае падчас службы ў 1931 годзе.

Але Беларуская аўтакефальная царква, якая мела больш за 400 прыходаў, праіснавала да 1937 года, не ідучы на згоду з "сергіянцамі", што і стала прычынай поўнага знішчэння яе кліру ў 1937 годзе.

Тым не менш, ідэя духоўнага нацыянальнага служэння свайму народу застаецца ці не адзінай перспектыўнай ідэяй для сучаснай праваслаўнай царквы.

Алесь БЯЛЯЦКІ

ПАРАЛЕЛІ

У кожнага пакалення свая Орша

У той час, як Масква святкавала сваё 850-годдзе, прыхільнікі незалежнасці ў Мінску адзначалі чарговую гадавіну Аршанскай перамогі. Зразумела, што маштабы святкаванняў былі непараўнальныя: грандыёзная масоўка ў стылі "застойных гадоў" і адносна сціплая грамадская акцыя, здзейсненая на чыстым энтузіязме. Ды ўсё ж збег гэтых свят падаецца мне сімвалічным. Грандыёзная імпрэза ў Маскве мела мэтай давесці самой Расіі, яе бліжэйшым суседзям і ўсяму свету, што імперскія амбіцыі Расіі — рэч натуральная, асвечаная гісторыяй і самім Богам. У Мінску ж гаворка ішла пра тое, чаго каштавала Беларусі абарона дзяржавы ад імперскай суседкі. На мітынгу гаварылі пра тое, што ў сярэднявеччы мяжа паміж Беларуссю (Літвою) і Расіяй (Масковіяй) была мяжою двух светаў. На адным баку — маг-дэбургскае права; Канстытуцыя (Статут Вялікага княства Літоўскага), якая гарантавала, на колькі гэта было магчыма ў тую эпоху, грамадзянскія і эканамічныя правы асобы, росквіт культуры; рэлігійная талерантнасць. Па другі бок мяжы — тыпова азіяцкая тыранія, што вядзе радавод ад залатой Арды; неабмежаваная ўлада маскоўскага правіцеля над краінай, насельніцтва якой у афіцыйных дакументах іменавалася "халопамі гасударавымі"; духоўны ізаляцыянізм, дзяржаўная ідэалогія, пабудаваная на ксенафобіі.

Нездарма перамога беларускага войска пад Оршаю святкавалася ў свой час усім цывілізаваным светам прыблізна так, як нядаўняя перамога сіл Кааліцыі над Садамам Хусейнам у Персідскай затоцы. Як збройная перамога дэмакратыі над тыраніяй.

"У кожнага пакалення свая Орша", — сказаў на мітынгу Вінцук Вячорка, і дадаў, што наша "аршанская бітва" ўжо ідзе і наша перамога — наперадзе.

Святкаваннем Дня Беларускай вайсковай славы распачалася "Восень-97".

Насцярожвае тое, што ў Дзень беларускай вайсковай славы ў шэсці і мітынгу бралі ўдзел толькі сябры БНФ. Сцягоў сацыял-дэмакратаў і лібералаў я там не бачыў. Не іначай, як зноў вычэкваюць? Мінулай восенню яны таксама чакалі, спадзеючыся на Маскву і на Захад. І чаго дачакаліся?

Заключным акордам святкавання гадавіны Аршанскай перамогі было пашыранае пасяджэнне Управы Фронту, на якім з дакладамі выступілі вядомыя навукоўцы. Анатоль Грыцкевіч, у прыватнасці, нагадаў, што на пачатку вайны Масквы з Вялікім княствам Літоўскім мелася дамова паміж Васілём III, князем маскоўскім і германскім імператарам аб будучым падзеле Цэнтральнай Еўропы. Васіль III меўся ўзяць сабе Вялікае княства Літоўскае, германскі імператар — Польскае каралеўства. Усё гэта вельмі нагадвае "Берасцейскі мір" 1918 і пакт "Молатава—Рыбентропа" 1939 года. Перамога пад Оршай парушыла гэтыя планы, пакт распаўся, і пра дамову тую ніхто болей не ўспамінаў. Зноў Расія і Германія схаўрусаваліся на той жа глебе, толькі ў XVIII стагоддзі, калі падзялілі Рэч Паспалітую. Сёння Польшча мае намер увайсці ў НАТА і Еўрасаюз, Беларусь жа — у геапалітычным саюзе з Масквою.

Дзе ж нарэшце лягуць межы твае, Айчына?

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ

ФАКТ

Права на ўласнасць: па-віленску і па-мінску

Пісьменнікі Літвы даслалі на адрас Адміністрацыі прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ліст у сувязі з намерам забраць у беларускіх пісьменнікаў Дом літаратара. У лісце, у прыватнасці, гаворыцца: "Літоўскія пісьменнікі даведаліся аб планах Вашай Прэзідэнтуры ўзяць на свой баланс будынак Дома літаратараў Саюза беларускіх пісьменнікаў і скарыстоўваць гэты будынак для дзяржаўных патрэб.

Пісьменніцкая салідарнасць прымушае нас гэтым лістом засумняваецца ў мэтазгоднасці такога рашэння. Дом літаратараў за час сваёй дзейнасці ўжо стаў культурным і духоўным цэнтрам. Страціць сваю публіку, сваіх наведвальнікаў і трывалыя традыцыі лёгка, а вярнуць цяжка. Ваша рашэнне безумоўна абмяжуе магчымасці дзейнасці Саюза беларускіх пісьменнікаў.

У якасці параўнання — якое становішча ў Літве? Будынак пісьменніцкай арганізацыі стаў калектыўнай уласнасцю Саюза пісьменнікаў Літвы. Такую магчымасць (права на ўласнасць) стварыў Закон аб творчых работніках і творчых саюзах, прыняты нашым Сеймам у жніўні 1996 года".

ЗЪЕЗДЫ

"Цвік" праграмы — відовішчнасць

У мінулую суботу, 6 верасня, адбыўся ўстаноўчы сойм маладзёжнага аб'яднання "Малады фронт".

Праходзіў ён у Мінску, у Палацы культуры вытворчага аб'яднання "Сукно". Па звестках аргкамітэта, на 11 гадзін раніцы было зарэгістравана 206 дэлегатаў з розных рэгіёнаў рэспублікі. На з'езд былі запрошаны прадстаўнікі шырокага кола маладзёжных арганізацый Беларусі: ад сацыял-дэмакратаў да анархістаў.

Падчас работы сойм выпрацаваў і прыняў статут "Маладога фронту". Былі вызначаны асноўныя задачы і накірункі дзейнасці нованароджанае арганізацыі. Паводле статута, "галоўнай мэтай МФ з'яўляецца аб'яднанне і выхаванне моладзі на грунце беларускай нацыянальнай ідэі, развіццё нацыянальнай самасвядомасці і творчай ініцыятывы, садзейнічае адраджэнню і росту духоўна і фізічна моцнага пакалення". На практыцы гэта азначае, што МФ збіраецца займацца выключна праблемамі моладзі: арганізоўваць канферэнцыі, семінары, праводзіць агітацыйна-масавыя мерапрыемствы ў навучальных установах краіны. Плануецца стварыць моцныя інфармацыйныя цэнтры, якія будуць праводзіць сацыялагічныя даследаванні, выдаваць газеты, бюлетэні і іншыя інфармацыйныя матэрыялы.

Вялікую ўвагу МФ будзе надаваць працы ў рэгіёнах. Ужо зараз існуюць даволі моцныя суполкі ў Гародні, Магілёве, Лідзе, Барысаве і іншых гарадах Беларусі.

На сойме былі таксама абраны цэнтральная рада і ўправа "Маладога фронту". З'езд выказаўся за ўвядзенне інстытута сустаршынства ў сістэме кіравання арганізацыі. Былі абраныя, згодна з гэтым палажэннем, тры сустаршыні МФ: Сяржук Паўленка, хрысціянскі дэмакрат з Гародні; Алесь Асіпцоў, старшыня магілёўскага аб'яднання "Патрыёты Бацькаўшчыны. Рух у Еўропу"; Павел Севярынец, былы старшыня маладзёжнае фракцыі БНФ. Менавіта гэтыя людзі ў многім будуць вызначаць твар новай арганізацыі.

— Мы зацвердзілі ў сваіх праграмных дакументах і палажэннях, што не збіраемся быць "тусоўкай" пры Народным фронце, — зазначыў П. Севярынец. — Мы мусім працаваць не так, як БНФ, а лепей за БНФ. Тыя рэгіянальныя лідэры, якія здольны стварыць моцныя арганізацыі, — для нас лепшыя кадры. Фракцыя займалася ў асноўным арганізацыяй масавых акцый, прапагандай і рэкламай у прэсе, культурніцкімі праектамі. На рэгіёнах, як мне зараз падаецца, ні масавых акцый, ні пікетаў, ні колькі-небудзь значных і паўнацэнных палітычных мерапрыемстваў зрабіць немагчыма. Таму мы будзем рабіць ухіл на грамадскую працу і асабліва на культуру. Культурніцкая праца ва ўсіх формах, прымальных для моладзі, ва ўсіх яркіх, эфектыўных, відовішчных формах зараз павінна стаць прыярытэтам, так бы мовіць, "цвіком" праграмы нашай арганізацыі.

Мікола ШАКЕЛЬ

Цырк святкуе

Пачалося свята 5 верасня — адкрыццём чарговага сезона. Ярка, відовішчна. Новая праграма невыпадкова называецца "Усё гэта — цырк". Здаецца, прадстаўлены ў ёй усе жанры, якія толькі могуць быць у цырку.

Зразумела, не абышлося без клоунаў, якія для многіх і з'яўляюцца найпершым увасабленнем цырка, як віду мастацтва. А вяселяць публіку і робяць часам немагчымае ў магчымым Мік і Мак — пад такімі прозвішчамі на арэне выступаюць Андрэй Шаргін і Мікалай Кармільцаў — лаўрэаты клоунскага конкурсу імя знакамітага Л. Енгібарава.

Што да нумароў "сур'ёзных", дык гэта — выступленне каскадзёраў-эксцэнтрыкаў на мулах пад кіраўніцтвам Аляксандра Елісеенкі, "Конны дывертысмент" Барыса Лазарава, "Вышэйшая школа верхавой язды з рускімі хартамі" — да гэтага нумара мае дачыненне Ірына Асатуран...

І, канечне ж, знайшлося ў праграме месца дрэсіраваным звярам — з Расіі прыехалі пяць гіганцкіх мядзведзяў са сваімі "настаўнікамі" Раісай і Грантам Ібрагімавымі.

Н. К.

ЛіМ ЧАСАПІС

Ветэраны пішуць мемуары

"Памяць салдацкіх сэрцаў" — так назвалі сваю кнігу ветэраны маёй роднай 348-й Бабруйскай двойчы ардэнаноснай стралковай дывізіі. У кнізе чатыры дзесяткі публікацый, адна з якіх "На зямлі легендарнай", належыць, між іншым, і аўтару гэтай інфармацыі.

Успаміны ветэранаў, якія прайшлі са сваім вайсковым злучэннем баявы шлях ад Масквы да Берліна, — простыя і праўдзівыя. Шмат матэрыялаў, прысвечаных баям на беларускай зямлі. Асабліва хочацца вылучыць расказ камандзіра супрацьтанкавага разліку старшага сяржанта Васіля Здунава, цяпер — генерал-маёра ў адстаўцы, старшыні савета ветэранаў дывізіі.

"На Мінск!" назваў свае нататкі Уладзімір Бараноўскі, былы партызан, салдат 1170 стралковага палка. Дарэчы, у кнізе надрукаваны і яго верш. Самадзейная паэтычная творчасць прадстаўлена таксама вершамі Васіля Арцёмава.

Р. ТАРАСЕВІЧ

Пра зямлю і зямлян

"Прашу дараваць, Зямля!" — зборнік вершаў пад такой назвай пабачыў свет дзякуючы малому прадпрыемству "Натако". У кнігу, выдадзеную на дзвюх мовах (адпаведна арыгіналу), увайшлі творы вядомых паэтаў, у якіх гучыць трывога за заўтрашні дзень планеты, узнімаецца голас у абарону зямлі і зямлян. Поруч з іншымі прадстаўлены Эдуард Акулін, Рыгор Барадулін, Пятрусь Броўка, Анатоль Вялюгін, Вера Вярба, Ніл Гілевіч, Анатоль Грачанікаў, Уладзімір Дубоўка, Сяргей Законнікаў, Кастусь Кірэенка, Якуб Колас, Аркадзь Куляшоў, Мікола Мятліцкі, Пімен Панчанка, Юрась Свірка, Марк Смагаровіч, Браніслаў Спрынчан, Максім Танк, Люба Тарасюк...

Прэміі імя Алеся Адамовіча

Па традыцыі ў дзень нараджэння Алеся Адамовіча Беларускі ПЭН-цэнтр прысуджае свае прэміі, якія носяць імя гэтага выдатнага пісьменніка і грамадскага дзеяча. Імёны лаўрэатаў былі абвешчаны на канферэнцыі ПЭН-цэнтра, прысвечанай жыццю і творчасці А. Адамовіча. Чарговымі лаўрэатамі прэмій імя Алеся Адамовіча сталі журналіст Барыс Хамайда — за бескампрамісную публіцыстыку на старонках газеты "Выбар" і пісьменнік Герман Кірылаў — за кнігу "Гарт. Саюз беларускіх патрыётаў".

Памяці вялікіх артыстаў

Урад Беларусі прыняў пастанову аб увекавечванні памяці выдатных дзеячаў нацыянальнага тэатра, народных артыстаў СССР Глеба Глебава і Галіны Макаравай, якія, як вядома, найбольшага поспеху ў сваёй сцэнічнай дзейнасці дасягнулі на сцэне Нацыянальнага тэатра імя Янкі Купалы. Паводле гэтай пастановы, на доме N 4 па вуліцы Леніна, дзе жыў Г. Глебаў, і на доме N 36 па праспекце Скарыны, дзе жыла Г. Макарава,у наступным годзе будуць устаноўлены мемарыяльныя дошкі.

У "Крылаў" — юбілей

14 верасня ў 16.05 слухайце па першай праграме Беларускага радыё юбілейны выпуск мастацка-публіцыстычнай праграмы "Крылы", прысвечаны 10-годдзю перадачы. Бяруць удзел вядомыя дзеячы беларускай культуры. Аўтар і вядучая праграмы — Галіна Шаблінская.

АДГАЛОСКІ

Лепей быць самім сабою

Падчас адкрыцця помніка Паўлу Масленікаву перад абласным мастацкім музеем (у мінулым нумары мы паведамлялі пра гэтую падзею) адзін мясцовы журналіст запытаўся ў мяне, дзе, акрамя Магілёўшчыны, у Беларусі ёсць помнікі мастакам? Шчыра кажучы, дык не адразу і ўспомніў... Помнік Марку Шагалу ў Віцебску ды Язэпу Драздовічу ў Траецкім прадмесці Мінска (хоць назваць гэту камернага памеру скульптуру помнікам можна з вялікай нацяжкаю). Вось, бадай, і ўсё. Хіба што дадаць сюды помнік Напалеону Ордзе ў Янаве (Іванаве) на Берасцейшчыне, адкрыты 31 жніўня. Усе астатнія помнікі надмагільныя.

Да гонару магілёўцаў, адзначу: у іхнім горадзе два помнікі — В.К. Бялыніцкаму-Бірулі і Г.В. Масленікаву. Яшчэ адзін помнік Вітальду Каятанавічу ёсць у Бялынічах. А што датычыць Карціннай галерэі Паўла Масленікава, дык яна ўвогуле не мае ў Беларусі аналагаў. Цудоўны, адзін з прыгажэйшых у Магілёве, будынак, зручнае памяшканне; інтэр'ер, падпарадкаваны экспазіцыі, а не наадварот (як часта бывае). І, нарэшце, самі палотны, якія нібыта створаны для гэтых сцен.

Хоць твор мастацтва першасны, але ж і ўмовы экспанавання рэч не апошняя. Памятаю, як два гады таму я быў у Маскве на адкрыцці выставы твораў Уладзіміра Савіча ў Муніцыпальнай галерэі. Калі пасля гэтага я пабачыў у Мінску вялікую выставу "Пагоні" ў Палацы мастацтваў, уражанне атрымалася не тое, на якое разлічваў. І не таму, што творы былі кепскія. Проста Палац мастацтваў у параўнанні з Маскоўскай муніцыпальнай галерэяй падаўся мне, даруйце, кепска асветленай пуняй. Галерэя ж Масленікава ў Магілёве вытрымлівае параўнанні з самымі лепшымі заламі.

Колькі слоў пра жывапіс Паўла Васільевіча... Павел Масленікаў быў чалавекам выключнай мастацкай інтуіцыі, а да таго ж меў добразычлівы, але выбуховы характар. Ягоная эмацыянальнасць у спалучэнні з прафесійным і жыццёвым вопытам і спарадзіла феномен пад назвай "Жывапіс Масленікава". Па сутнасці, ён быў імпрэсіяністам. Гэта асабліва адгадваецца ў ягоных эцюдах. Але не апошнюю ролю ў ягоным жыцці і творчасці адыграў тэатр. Працуючы доўгі час тэатральным мастаком, ён пачаў падсвядома пераносіць пэўныя прыёмы і ў пейзажны жывапіс. Гэта асабліва бачна ў палотнах, "пабудаваных", зробленых на падставе эцюдаў, але ўжо ў майстэрні. Але зроблена палатно непасрэдна на прыродзе, альбо ў майстэрні,паўсюль адчуваецца ўпэўненая рука майстра і натхненне творцы, які, пражыўшы амаль усё жыццё ў горадзе сярод асфальту і бетону, захаваў усхвалявана-язычніцкае стаўленне да прыроды.

Калі б жывапіс Паўла Масленікава суцішыць і прыгладзіць, атрымаўся б, магчыма, Клод Манэ. Але навошта быць другім Манэ, лепей быць самім сабою.

П.В.

Здымкі з архіва — 1995 год: Павел Масленікаў у дзень адкрыцця сваёй галерэі. Зразумела ж, задаволены; 1997 год: "Другое нараджэнне" галерэі Масленікава. У залах галерэі госці і ўдзельнікі II Міжнароднага пленэру В.К. Бялыніцкага-Бірулі.

ВАРУНКІ

Прэзідэнт журналісту не абаронца

На мінулым тыдні прэзідэнт А. Лукашэнка зноў наведаў Маскву. На гэты раз падставай для візіту паслужыла 850-годдзе сталіцы Расіі. Адбылася сустрэча паміж кіраўнікамі дзяржаў, якая, нягледзячы на святочныя дні, насіла вельмі сур'ёзны характар. Адной з асноўных тэм размовы на вышэйшым узроўні стала становішча, у якім апынуліся журналісты ГРТ у Беларусі. Шмат хто чакаў, што пасля гэтага адбудзецца вызваленне з турмы Паўла Шарамета. Чакалася, што прэзідэнт Беларусі, зведаўшы ўпершыню вострую крытыку з боку расійскага кіраўніцтва, выкарыстае "святочны" візіт, каб прадэманстраваць сваё быццам бы лагоднае стаўленне да расійскіх СМІ, не наносячы шкоды ўласнаму іміджу бескампраміснага палітыка. Нават заўсёды песімістычныя журналісты незалежных газет былі ўпэўнены ў тым, што пасля размовы двух прэзідэнтаў без пасрэднікаў апальны журналіст выйдзе на свабоду. Асцярожна выказвалася думка, што калі гэтага не адбудзецца, адносіны Расіі і Беларусі значна пагоршацца.

Аднак нічога падобнага не адбылося. У суботу Барыс Мікалаевіч паведаміў аб тым, што ў час яго гутаркі з Аляксандрам Рыгоравічам пытанне аб "падрыўной дзейнасці ГРТ" разглядалася, але было "знята". Гэтыя не зусім зразумелыя словы Ельцына патлумачыў у інтэрв'ю радыё "Маяк" прэзідэнт Беларусі. Ён сказаў, што вырашаць далейшы лёс Шарамета і астатніх будуць праваахоўныя органы РБ без умяшання расійскага кіраўніцтва.

Такім чынам, Расія адмовілася ад свайго абавязку (не толькі маральнага) абараняць сваіх карэспандэнтаў, а беларускія ўлады атрымалі карт-бланш на адвольныя дзеянні адносна замежных журналістаў. Аб "незалежнасці" беларускіх судоў добра вядома. Ні адзін працэс над апанентамі прэзідэнта не скончыўся апраўданнем апазіцыянера, відавочныя парушэнні закона з боку вышэйшых дзяржаўных служачых не заўважаюцца, а спробы прыцягнуць увагу праваахоўнікаў да дзеянняў самога прэзідэнта або не маюць ніякага працягу (як у выпадку з іскам Г. Карпенкі), або забяспечваюць крымінальны пераслед ініцыятару (прыклад — В. Ганчар). І не вельмі верыцца ў тое, што кропку ў "справе журналістаў" паставяць у строгай адпаведнасці з законам.

Застаецца спадзявацца толькі на цуд. Ну, напрыклад, на прынясенне прабачэнняў кіраўніцтвам ГРТ. Але можна быць упэўненым, што калі яны не прагучалі пасля "прызнанняў" Адамчука і Завадскага, не прагучаць і надалей. Народнага пратэсту чакаць таксама не выпадае. Мітынгу ў падтрымку арыштаваных папярэднічалі белыя плямы ў газетах, некалькі анонсаў, але на плошчу Бангалор прыйшлі прыблізна дзве тысячы грамадзян.

"Зняўшы" пытанне аб журналістах, Ельцын не толькі "развязаў рукі" беларускім уладам, але і даў падставы ўсім жадаючым абвінавачваць сябе ў палітычнай нямогласці. З гэтага моманту можна і не прыслухоўвацца да слоў "цара Барыса". Калі ён не змог паўплываць на кіраўніка саюзнай дзяржавы, дык на што ён здольны ўвогуле? Сёння ўжо відавочна, што ўсе пагрозы перагледзець Статут Саюза, "націснуць" з дапамогаю эканамічных рычагоў — не болей чым блеф. Як бачым, Масква не жадае ахвяраваць сваімі геапалітычнымі інтарэсамі ні дзеля свабоды людзей, ні дзеля ўласнага прывабнага выгляду. Да таго ж, нельга скідваць з рахункаў стратэгічныя намеры Аляксандра Рыгоравіча ў дачыненні Расіі.

Вадзім ДОЎНАР

Святлану Алексіевіч асабліва прадстаўляць не трэба: чалавек яна, безумоўна, вядомы, у поўным сэнсе — нават сумна вядомы... Эпіграфам да гэтай гутаркі я б узяла словы самой Святланы Аляксандраўны, якія, на жаль, не ўвайшлі ў інтэрв'ю, але вельмі прыйшліся мне да душы: "Наша ж мастацтва зусім не ўмее радавацца! Калі заходняе ўзнімае такія пытанні: чаму я сплю з гэтай (!) жанчынай і навошта я жыву на гэтым свеце — пытанні Пазаліні, Феліні і іншых, дык нашыя пытанні гучаць так: што рабіць і хто вінаваты? А ў час рэвалюцыі яшчэ і: каго вешаць і ў каго страляць? Усё... Мы — проста заложнікі такой культуры".

Сама пісьменніца паставіла для сябе два пытанні, на якія спрабуе знайсці адказ на працягу ўсяго свайго жыцця. Пра гэта і іншае — нашая гутарка...

Святлана АЛЕКСІЕВІЧ: "Сэнс жыцця — у самім жыцці..."

— Святлана Аляксандраўна, у 95-ым вы сказалі: "Гадоў 25 таму я вырашыла, што напішу сем кніг. Нейкую энцыклапедыю нашага жыцця. Чатыры з іх я ўжо напісала"...

— Так, мне падабаецца гэтая магія лічбаў, хаця тут ёсць элемент выпадковасці... Але кніг сем: першая — "У вайны не жаночае аблічча", другая — "Апошнія сведкі" — гэта кнігі, якія паказваюць жанчын на вайне, дзяцей. "Цынкавыя хлопчыкі" адлюстроўваюць іншы вобраз вайны, поўную страту ілюзій свайго пакалення, свайго часу і, наогул, як бы цэлай эпохі... Чацвёртая кніга — пра час, калі ўся гэтая сацыялістычная атлантыда пайшла пад ваду, імперыя рухнула, а з ёю і сацыялізм, — называецца "Зачараваныя смерцю"... Праз самагубства людзі не проста адышлі ў іншы свет, яны пакінулі жыццё з-за ідэй, як бы не разумеючы гэтага новага жыцця. Бо яны выраслі на шкале зусім іншых каштоўнасцей. Гэта людзі эпохі ідэй — войнаў, рэвалюцый, эпохі, калі чалавечае жыццё было нечаму роўнае — ідэі, Радзіме... І потым мяне заўсёды цікавіла, як гэтыя людзі жылі, кахалі. Мяне цікавіў не толькі сацыяльны чалавек — чалавек у часе, але і як бы голы чалавек на голай зямлі, цікавіла інтымнае ў чалавеку, у яго падсвядомасці... А зараз я пішу кнігу пра каханне — "Дзівосны алень вечных ловаў". У Грына ёсць такія словы: "Любовь — это чудный олень вечной охоты" — сэнс такі: чалавек хоча быць шчаслівым, але ў яго гэта не атрымліваецца, і вось адсюль вынікае самота... І апошняя, сёмая — "О святло вечаровае" — гэта ўжо кніга пра адыход у небыццё, але адыход натуральны, калі чалавек пакідае жыццё праз старасць... А яшчэ я абмінула кнігу "Чарнобыльская малітва", у ёй чалавек застаўся сам-насам з Космасам. Сапраўды, мы, беларусы, аказаліся людзьмі, якія маюць гэты чарнобыльскі вопыт, мы — гэта д'ябальская лабараторыя, людзі атамнай вайны. Хаця і самі не ведаем, што з намі здарылася: здаецца, кахаем, нараджаем, хварэем як усе. На самай справе — не так, як усе... "Чарнобыльская малітва" ўжо выйшла ў Расіі, Швецыі, Германіі... Але ў нас, у Беларусі, яе не друкуюць, хутчэй за ўсё таму, што ў мяне зусім іншы пункт гледжання, чым у нашага прэзідэнта, які лічыць, што на забруджаных тэрыторыях можна жыць і садзіць бульбу... Такім вось чынам склалася, што колькі год таму я ўжо ведала: напішу гэтыя сем кніг... І я напішу іх.

— А наконт прэзідэнта... Яшчэ два гады таму вы казалі, што ў Беларусі "існуе глеба для таталітарызму і фашызму"...

— Так, у нас усё больш усталёўваецца дыктатарскі рэжым. Ад народа ўсё ўтойваецца, хаця, я думаю, за Чарнобыль давядзецца калі-небудзь адказваць тым, хто трымае ўладу. Адказваць, як за 37-ы год... А наконт рэжыму асабістай улады — тут шмат прычын... Была такая цікавая рэч, пра якую з часам усе забыліся: Лукашэнка, калі толькі прыйшоў да ўлады, тэлефанаваў Яўлінскаму: прыязджай і рабі што-небудзь! Канешне, у гэта сёння цяжка паверыць... Але праз паўгода ён, як чалавек дастаткова геніяльны (другое пытанне — з якім знакам гэтая геніяльнасць: з плюсам ці з мінусам), зрабіў крок назад, у мінулае... І да нас сталі ездзіць Зюганаў, Лігачоў, Гаварухін. Чаму так? Бо Лукашэнка, як палітык, рэальны палітык, адчуў, які народ яму падначалены, чаго той хоча. А беларускі народ, што ні кажыце, — народ з ваенным, потым сацыялістычным вопытам — вопытам паслухмянасці... І дарэмна нас блытаюць з Прыбалтыкай. Мы — не Прыбалтыка, бо ў нас няма такога вялікага пласта культуры, у нашым народзе няма гэтай нацыянальнай ідэі і да таго ж — няма культуры інтэлігенцыі... Калі б у нас была такая культура інтэлігенцыі, было б супраціўленне — і за пару гадоў нельга было б так "раздзелацца" з апазіцыяй... Вось пайдзіце зараз у народ — так, людзі ўжо разумеюць, хто такі Лукашэнка, але вы пачуеце элементарнае: а хто, хто іншы?.. Вось я зараз і хвалююся, што такое становішча ў нас будзе яшчэ доўга...

— "Я касмапалітка", — раней увесь час сцвярджалі вы ў друку. Ды і наогул, вы заўсёды былі прыхільніцай інтэграцыі Беларусі з Расіяй, выступалі за роўнасць рускай і беларускай моў... І ў той жа час разумелі, што "наш бедлам никто, кроме нас, чистить не будет". І зараз лічыце, што наш "бедлам" рэальна расчысціць з дапамогай Расіі?

— Складанае пытанне. Што датычыцца асабіста мяне, то я — беларуская пісьменніца, бацька мой — беларус, а маці — украінка... Але не ў гэтым справа. Я больш прытрымліваюся Салжаніцынскай ідэі — ідэі славянскага адзінства... Але гэта зусім не значыць, што я за тое, што робіць наш прэзідэнт, калі зноў з'яўляюцца рускія школы, забіраюць будынак беларускага ліцэя і забываюць пра інтарэсы цэлай нацыі... А наконт беларускай ідэі ў тым выглядзе, у якім яна развівалася ў нас... Для мяне з самага пачатку было відавочна, што гэты рух вырадзіцца ў сектанцтва. І перш за ўсё таму, што пачала разыгрывацца карта антырускасці, а антырускасці няма ў беларускім народзе! Потым пачалі з'яўляцца артыкулы, у якіх Ленін ужо прадстаўляўся як хворы сіфілітык... і гэтак далей. Я проста не магла прыняць гэтага фанатызму. Лічу, што шлях нацыянальнай ідэі павінен быць іншым: спачатку мы павінны былі заняцца дэмакратычнымі пераўтварэннямі, а потым ужо спаквапя гаварыць пра нацыянальныя ідэі... Гэта зусім не значыць, што я — антынацыянальны чалавек, часта я думаю, мы — драматычная нацыя, і ўсе нашыя беды — ва ўласным народзе. Мне не падабаецца, калі беларускі народ падаюць як нейкую міфічную істоту, — давайце ж вылазіць са сваіх акадэмій і разглядваць яго! Што гэта за народ і чаго ён хоча? У нас жа ўсё наадварот — і ў выніку, падабаецца нам тое ці не, — з народам гаворыць толькі Лукашэнка, а той яго слухае... Таму зараз я магу з упэўненасцю сказаць: нішто столькі шкоды не прынесла нацыянальнай ідэі, як фанатызм і сектанцтва Зянона Пазняка... Бо ў народзе гэтага фанатызму няма!

— Добра, Святлана Аляксандраўна, давайце крыху адыдзем ад палітыкі і звернемся да вашай творчасці, да вашых філасофскіх разваг. Я б хацела, каб вы пракаменціравалі некаторыя з іх. Першае: "Дзесьці ў глыбіні душы я павінна прызнацца, што расчаравана ў чалавеку, у чалавечым матэрыяле".

— Так. І не толькі я адна, зараз усё заходняе мастацтва расчаравана ў чалавеку. Вазьміце іх кнігі, што выйшлі пасля Фрэйда... Ды і наогул, як можна не расчаравацца ў чалавеку пасля Чачні? Калі вы бачыце гэтыя вагоны з адсечанымі рукамі і нагамі — з тым, што калісьці называлася рускім салдатам?! І гэтыя вагоны стаяць у тупіках, нікому непатрэбныя, іх адшукваюць толькі маці... Калі вы бачыце, як самі чачэнцы хаваюць рускіх салдат?! Ну як я не магу расчаравацца пасля гэтага ў чалавеку? І як я магу не расчаравацца ў ім, калі прыходжу ў хату да інтэлігента, а ён накрывае тэлефон: "Нас праслухоўваюць!"... Колькі ж чалавека ў чалавеку і колькі звера ў чалавеку — гэтыя два пытанні заўсёды цікавілі і цікавяць мяне.

— А зараз вы можаце хоць прыблізна на іх адказаць?

— Гэтага ніхто не ведае. Я думаю, што чалавека ў чалавеку няшмат. І яго было б яшчэ меней без мастацтва і без рэлігіі...

— Яшчэ адно пытанне: "Чаму ж з нас можна рабіць забойцаў?"

— Для мяне гэта вялікае пытанне: чаму адзін чалавек забівае другога. У нашым грамадстве, на жаль, існуе гэтая залежнасць ад дзяржавы, несвабода мыслення. Яшчэ калісьці Талстой пісаў, што лепей турма, чым ісці ў армію... і забіваць. Чалавек — масавая істота, і ён існуе ва ўмовах манапалізаванай палітычнай апрацоўкі. Калі радыё, газеты гавораць адно і тое ж, настаўнікі і ваенкамат — усё пра подзвіг, — ну як ён, гэты 18—19-гадовы хлопчык, можа быць абаронены? Ці можа ён сам ацаніць сітуацыю?.. На шчасце, зараз людзі сталі больш задумвацца над гэтым. Памятаеце маці, якія ездзілі ў Чачню ратаваць сваіх дзяцей, выкуплялі іх?.. Ды і самі хлопцы не хацелі ісці ў армію... А калі я пісала "Цынкавых хлопчыкаў", там былі два "отказника" — і гэта выклікала вялікае ЧП! Ужо зараз, паглядзеўшы па тэлебачанні, што робіцца ў Чачні, мяне сустрэла адна маці сына-"афганца" і сказала: "Святлана! А мы ж не верылі вам! Зараз я зразумела, што нашы хлопчыкі ў Афганістане забівалі людзей. Як сённяшнія — забіваюць у Чачні..." Разумееце? Але вось нядаўна была гадавіна гэтага афганскага помніка ў Мінску, і што я пачула зноў: "Айчына!, "святы доўг", "сувязь з бацькамі-героямі" — увесь той жа набор страшных міфаў і стэрэатыпаў...

— Святлана Аляксандраўна, мне здаецца, больш крыві, чым "Цынкавыя хлопчыкі", вам ніводная кніга не сапсавала: абвінавачванні, пагрозы, судовыя разборкі...

— Так, але я не люблю, калі пішуць, што я здзейсніла нейкі подзвіг. Я пісала тое, што чула, бо гэта — мая работа. Кніга "У вайны не жаночае аблічча" не друкавалася два гады. І ў чым мяне толькі ні абвінавачвалі — у натуралізме, у пацыфізме! Бо ў мяне жанчына забівае, а яна павінна шкадаваць і перавязваць салдат... Пасля афганскай кнігі маці крычалі, што я зрабіла іх сыноў забойцамі. А тое, што яны пайшлі ў суд... Гэта не яны пайшлі, проста яны сталі ахвярамі палітычнай гульні. Ведаеце, усё гэта палітычная гульня — і Афган, і сённяшні Чарнобыль... Мая работа — дадумваць рэчы да канца, і яна асуджана на рызыку. Гэта ўдар, на які я сёння і заўсёды павінна разлічваць, таму я падрыхтавана... Ведаеце, мяне ратуе адчуванне нейкай псіхалагічнай абароны.

— Неяк мяне ўразілі вашыя словы: "Сёння я, напэўна, іншую кнігу напісала б пра вайну". Чым бы яна адрознівалася?

— Я думаю, у ёй было б меней рамантызму, яна была б больш жорсткая. У кнізе "У вайны не жаночае аблічча" я яшчэ верыла, што можна неяк апраўдаць забойства другога чалавека, цяпер я так не думаю. Я лічу, што "Цынкавыя хлопчыкі" ўжо больш жорсткая кніга... Але для мяне ўсё гэта апусканне ў жах — не самамэта. Мне здаецца, чым прасцей забіваюць, тым больш жахліва робіцца. Хочацца, каб чытач зразумеў: гэта ўсё не я прыдумала, гэта ўсё чалавек робіць з чалавекам на вайне! Таму для мяне не існуе пытання: павінна гэта быць у мастацтве ці не. І мая мэта: зрабіць не так, каб чытача блажыла, а так, каб гэта яго ўзрушыла...

— Святлана Аляксандраўна, у мяне, можа, крыху нечаканае пытанне: як вы ставіцеся да помнікаў?

— Вельмі кепска стаўлюся да нашых помнікаў, асабліва да ваенных... За мяжой я бачыла помнік "Брэменскім музыкам", у адной заходняй краіне — помнік сабаку. Помнікі жывёлам мне падабаюцца... Напрыклад, у Чарнобылі я б паставіла помнік вожыку, помнік сабакам, якіх там расстрэльвалі... А ўсе ваяўнічыя помнікі мне не падабаюцца: няма чаго ганарыцца, калі адзін чалавек забівае другога...

— Як вы лічыце, што павінен адчуць чалавек, які адкрывае вашу кнігу, і што б вы хацелі, каб ён адчуў, закрываючы яе?

— Каштоўнасць чалавечага жыцця! Гэта самае галоўнае. Нельга рабіць замах на жыццё іншага чалавека з-за таго, што ў яго іншая форма носа ці іншыя ідэі ў галаве. Чалавечае жыццё не можа быць нечаму роўным — ніякай ідэі, ніякім поглядам... Гэта зусім іншая субстанцыя. Таму і сэнс жыцця — у самім жыцці...

— Дзякую вам за гутарку!

Гутарыла Раіса МШАР

ДРУК

Новае пра Хведара Ільяшэвіча

Імя Хведара Ільяшэвіча доўгі час замоўчвалася. Ён быў актыўным удзельнікам падпольнай камсамольскай ячэйкі, якая існавала ў Віленскай беларускай гімназіі, за што правёў у Лукішках каля двух гадоў. Пасля вучыўся ў Віленскім універсітэце. У 1936 годзе за дысертацыю "Друкарня дома Мамонічаў у Вільні" атрымаў навуковую ступень магістра філасофіі. У Заходняй Беларусі выйшлі кнігі паэзіі Х. Ільяшэвіча "Веснапесні", "Зорным шляхам", "Зафарбаваныя вершы", літаратуразнаўчая праца "Ядвігін Ш. (Антон Лявіцкі). Жыццё і літаратурная творчасць". Пісаў таксама апавяданні. У час нямецкай акупацыі ў Беластоку рэдагаваў газету "Новая дарога", быў кіраўніком "Беларускага аб'яднання ў Беластоку". У 1944 годзе падаўся на Захад, дзе ў Германіі ў 1946 годзе па яго ініцыятыве было створана літаратурнае аб'яднанне "Шыпшына". Х. Ільяшэвіч трагічна загінуў 7 лістапада 1948 года ў аўтамабільнай катастрофе.

Зразумела, што любыя звесткі, якія тычацца жыцця і творчасці Х. Ільяшэвіча, уяўляюць вялікую цікавасць. І для даследчыкаў беларускай літаратуры, і для чытачоў. Аказваецца, у Аддзеле рэдкіх кніг і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі Нацыянальнай акадэміі навук захоўваюцца некалькі яго пісем да рэдактара віленскага часопіса "Калоссе" Янкі Шутовіча. З адным з лістоў, датаваным 18 лютага 1938 года, Х. Ільяшэвіч выслаў у рэдакцыю і першую частку сваёй аповесці "Васіль".

Гэтыя матэрыялы адшукала супрацоўніца бібліятэкі Нацыянальнай акадэміі навук Яніна Кісялёва. Іх, пачынаючы з нумара з 4 верасня 1997 года, пачала публікаваць газета "Голас Радзімы", а публікацыі папярэднічае артыкул Я. Кісялёвай "З-пад палёў, дзе дым сцелюць Беласток і Супрасль...", у якім коратка расказваецца пра жыццёвы і творчы шлях Х. Ільяшэвіча, а таксама пра знаходку невядомых матэрыялаў пра яго.

Паяднанне з песняром

Зноў на плошчу імя Якуба Коласа ў Мінску прыйшло гарадское свята паэзіі "Песняй вітаю я вас!" Як заўсёды, яно прысвячалася песняру Беларусі і прымяркоўвалася да Дня ведаў. Школьную і студэнцкую моладзь прывітаў і павіншаваў з пачаткам навучальнага года галоўны спецыяліст па культуры Адміністрацыі Савецкага раёна горада Мінска Уладзімір Шавялёў. Затым рэй павяла дырэктар Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа Зінаіда Камароўская. Пра неўміручасць творчасці песняра, пра веліч ягонага таленту гаварылі народны паэт Беларусі Ніл Гілевіч, старшыня Саюза беларускіх пісьменнікаў Васіль Зуёнак, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі імя Якуба Коласа, галоўны рэдактар часопіса "Маладосць" Генрых Далідовіч.

Гучала музыка, праводзіліся розныя гульні, была разыграна віктарына па жыцці і творчасці вялікага дзядзькі Якуба. Пераможцы ад дырэкцыі музея атрымалі сувеніры.

Сцяпан ІВАНЧЫК

Падручнікі — маляўнічыя, разумныя, даступныя

Да новага навучальнага года для спецыяльных школ, дзе навучаюцца дзеці з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, выдавецтвамі "Народная асвета", "Полымя" ўпершыню выпушчана 27 найменняў вучэбных дапаможнікаў для навучэнцаў першых класаў і 17 падручнікаў для другакласнікаў. У сёлетнім навучальным годзе спецыяльныя школы рэспублікі для навучання сляпых дзяцей атрымаюць таксама трынаццаць новых падручнікаў. Гэта будуць першыя айчынныя падручнікі, выдадзеныя шрыфтам Брайля. Гэтыя маляўнічыя даступныя для разумення, разумныя кніжкі былі прадэманстраваны на прэзентацыі, якая адбылася ў Мінску ў Грамадскім прэс-цэнтры Дома прэсы.

Фота А.НІКАЛАЕВА, БЕЛТА

Шматлікія спрэчкі апошняга часу аб "традыцыяналістах" і "наватарах", аб "афіцыйных" і "вольных" літаратарах, урэшце, здаецца, страчваюць свой радыкалізм і супрацьстаянне. Прынамсі, гутарка, якая адбылася за "круглым сталом" у Наваполацку, узаемныя культурніцкія акцыі мясцовай арганізацыі Саюза пісьменнікаў і літаратараў з Таварыства вольных літаратараў, "Бум-бам-літа", іншых літаратурных суполак усяляюць надзею, што пераважаць пачынае агульны клопат пра родную літаратуру. Прынамсі, і падстава для гутаркі — 50-гадовы юбілей мастака Міколы Селешчука і 80-гадовы — народнага пісьменніка Беларусі Янкі Брыля была выбрана невыпадкова. У гутарцы бяруць удзел галоўны рэдактар альманаха "Край", старшыня Полацка-Глыбоцкай філіі Віцебскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў паэт Навум ГАЛЬПЯРОВІЧ, галоўны каардынатар Таварыства вольных літаратараў, выдавец і паэт Алесь АРКУШ, выкладчык кафедры філасофіі і культуралогіі Полацкага дзяржаўага універсітэта публіцыст Сяржук ШЫДЛОЎСКІ.

Два полюсы адной культуры,

або Погляд з "правінцыі" на сучасную літаратуру

Алесь АРКУШ: Мы сабраліся ў дзень юбілею. Сёння спаўняецца 50 год выдатнаму беларускаму мастаку Міколу Селешчуку, які, на жаль, не дажыў да гэтага дня, і 80 год нашаму класіку Янку Брылю. Гэтыя постаці як бы сімвалізуюць два полюсы беларускай культуры. Янка Брыль азнаямляе сабой класічную мадэль беларускай літаратуры, якая працягвае традыцыі Я. Купалы, Я. Коласа. А Мікола Селяшчук успрымаецца, як паслядоўны еўрапеізатар. Гэта беларускі сюррэаліст, які ўвёў новыя "зместы і сэнсы" ў наша мастацтва — не толькі на ўзроўні сваёй творчасці, але і на ўзроўні асабістага лёсу, ладу жыцця, творчага міру.

Сяржук ШЫДЛОЎСКІ: У спрэчцы "традыцыяналістаў" ды "наватараў" падставовыя тэзы былі агучаны яшчэ за часамі Максіма Багдановіча ды Томаса Стэрна Эліота. Валянцін Акудовіч ужо адцеміў кагадзе гэты факт у "Крыніцы". Неафіты беларушчыны — як чытачы, гэтак і літаратары — гэта галоўным чынам, патэнцыйныя аматары "карыды". Але што б сталася з літаратурным працэсам у Беларусі, калі б "класікі" ды "бурапеннікі" раптам паразумеліся?Межы гэтых дзвюх кастаў узаемапранікальныя — які "бурапеннік" не марыць каля сарака гадоў стацца "класікам". Бояьш прынцыповай падаецца барацьба паміж плынямі нечытэльнай ды чытэльнай літаратуры, ці, як паменаваў апошнюю Сяргей Дубавец, — літаратуры канверсуемай. Яна акурат аб'ядноўвае як "традыцыяналістаў", гэтак і "наватараў": Янку Брыля і Адама Глобуса, Васіля Быкава і Янку Маўра, Лявона Вольскага і Вінцэся Мудрова. Кожная шчасная літаратурная кар'ера мусіць шанавацца, не зважаючы на тое, што палягае ў ейным падмурку, — майстэрства дагадзіць кан'юнктуры або здольнасць фармаваць яе самому.

Навум ГАЛЬПЯРОВІЧ: Галоўнае, каб прысутнічаў пошук, і ён быў пазначаны талентам. Тады ў самай традыцыйнай форме абавязкова ёсць нетрадыцыйныя метады выказвання. А што датычыць сённяшняй палярызацыі, аб якой цяпер гэтак шмат гаворыцца, то яна, як той медаль, мае два бакі. Калі на адным баку будуць традыцыі, то на другім наватарства, пазначанае высокім густам і майстэрствам. У Маскве побач з авангардысцкімі часопісамі пачалі з'яўляцца і выданні, так бы мовіць, рэалістычнага кірунку. Але друкуюць яны адметныя імёны — і Ахмадуліну, і Аксёнава, і Гладзіліна, і Акуджаву. Бо гэта сапраўды высокае мастацтва. А тое, што пасярэдзіне, што самадастаткова, — знікае, губляе свайго чытача. Толькі літаратуразнаўцаў будзе яшчэ цікавіць — колькі там эпітэтаў ужыў на адной старонцы аўтар, апісваючы дарогу з вёскі да горада. У наш час, калі ў кнігарнях даступна як нізкаякасная, гэтак і высокая літаратура, — беларуская літаратура мусіць быць сапраўды высокага гарту. Таму і адзін, і другі полюс беларускай літаратуры павінны адпавядаць зараз патрабаванням людзей высокага густу — заўсёднікаў бібліятэк, канцэртных залаў ды карцінных галерэяў. Будучыня за тымі аўтарамі, якія здолеюць аб'яднаць вакол сваёй творчасці інтэлектуальнага чытача.

А. А.: У абнаўленцаў прысутнічае і пэўная паслядоўнасць,і арыенціры, і дынаміка развіцця, і нават ідэалогія ("La culture revolte"), і чытацкая цікаўнасць, як у краіне, гэтак і за мяжой. Менавіта гэтая літаратура сёння найбольш перакладаецца, актыўна ўводзіцца ў новыя культурніцкія абсягі. Адбываецца працэс структурызацыі і стварэнне ўласнай іерархічнасці. І гэткія асобы, як Селяшчук, — робяцца лідэрамі новага беларускага мастацтва. У адваротным жа полюсе, які прадстаўляе большасць сяброў Саюза пісьменнікаў, наадварот, назіраецца поўная дэструкцыя. Я прадказаў падобную сітуацыю ў сваіх артыкулах яшчэ на пачатку 90-х. Дзеля выратавання лепшага ў гэтым полюсе неабходна перагрупоўка, змена іерархіі. Яна павінна адбыцца пасля ўнутранага паклікання. Як разуменне ратавальнага шляху. Пакуль жа не адчуваецца намаганняў у гэтым кірунку. Хоць апошнім часам з'явіліся новыя імёны-дамінанты — Купрэеў, Станкевіч, але істотных зрухаў не заўважна.

С. Ш.: Здаецца, слова "іерархія" робіцца ў нашай сённяшняй гаворцы падставовым паняткам. Выдае на тое, што Алесь хоча прэзентаваць апошні найбуйнейшы праект пакалення "Тутэйшых" — аднаўленне агульнанацыянальнага інстытута класікаў. За апошнія пятнаццаць гадоў, не зважаючы на табу ды сыканне аўтарытэтаў, "Тутэйшыя" здолелі збольшага адаптаваць адраджэнскую традыцыю да сітуацыі постмадэрна, чым паспрыялі прыйсцю новай генерацыі. Што тычыць захадаў выбудовы чарговага Парнаса на месцы спляжанага капішча сацрэалізму, то іх можна ўважаць або віртуознай правакацыяй, або ахвярным жэстам гэтага пакалення на карысць будучыні беларускай літаратуры. Бо што яшчэ можа гэтак стымуляваць актыўнасць новай генерацыі, як магчымасць зруйнаваць чарговую іерархію.

Н.Г.: Хачу ўдакладніць сітуацыю, якая склалася на полюсе традыцыяналістаў. Тут ужо згадваліся імёны Купрэева і Станкевіча. Але варта дадаць яшчэ таксама і таго ж Няклаева, і Галубовіча, і Дранько-Майсюка, і таго ж Алеся Жыгунова. А гэта ўжо не мала. Іншая справа, што сярод 467, ці колькі сёння сяброў Саюза пісьменнікаў, значная частка губляецца на фоне згаданых тут імёнаў. Гэтая структура, гэтая генерацыя не здолела ярка і гучна сябе выказаць. І, згаджаючыся з Сержуком Шыдлоўскім, хачу сказаць, што, папершае, сапраўды нашая сітуацыя вымагае не столькі новай іерархіі, колькі якасці самой літаратуры, і па-другое, я акурат і хачу рабіць у "Краі" якасную літаратуру, заснаваную на лепшых нашых традыцыях, — тое, што робіць, скажам, і "Крыніца". Новыя авангардныя суполкі, каб азначыць сваё месца ў літаратуры, заўжды вымушаны былі жорстка, маніфестна вызначаць сваю эстэтычную пазіцыю. Гэта было заўжды іх моцным бокам. Ды побач існавалі пісьменнікі, якія менш рупіліся аб канцэпцыях, тэорыях, а стваралі традыцыйныя, нібыта простыя творы, што ўваходзілі ў залаты здабытак літаратуры. І, як гэта ні парадаксальна, сённяшнія цяжкія для нашай нацыянальнай культуры варункі ўсё ж спрыяюць стварэнню выдатнай літаратуры. Толькі такая літаратура выжыве, і яе будуць перакладаць з нацыянальнай мовы, нягледзячы на тое, колькі насельніцтва на ёй гаворыць. Так было ў прынцыпе з Караткевічам.

А. А.: Я не зусім разумею паняцце "якасць літаратуры". Я разумею актуальнасць, шчырасць, кан'юнктурнасць, алазіцыйнасць, банальнасць літаратуры. Што такое якасць? Гэта, напэўна, датычыць нейкіх філалагічных крытэрыяў — з пункту гледзішча стылю, адпаведнасці стандарту? Але стандарты для літаратуры кепскі арыенцір. Як гэта дастасаваць да жывапісу Пірасмані, ці дываноў Кіш, якая не мела аніякай мастацкай адукацыі. Яна стварала нешта прымітыўнае, у разуменні сучаснікаў, але сёння высвятляецца, што насамрэч атрымалася сапраўднае мастацтва. Прозвішчы некаторых акадэмікаў-перасоўнікаў сёння ўзгадае бадай толькі даследчык выяўленчага мастацтва Расіі XIX стагоддзя, а Пірасмані і па сёння застаецца неразгаданай таямніцай. Таму я і лічу, што для мастацтва тэрмін "якасць" не зусім адпавядае. Ён хутчэй стасуецца з вытворчасцю кашуляў. Трэба проста адмовіцца ад руціннасці, штампаў, рыторыкі ды дыдактыкі, у якія мы сябе ўвагналі. Літаратура не такая ўжо і сур'ёзная рэч. І ёй не ўласцівы функцыі выхавацеля ды наглядчыка. Літаратура, што фармуецца ў нашым полюсе, акурат і ствараецца па прынцыпах гульні. У творах тут мадэлюецца нейкая незвычайнасць, уяўнасць, непасрэднасць, або нават абсурднасць. Адны бакі жыцця тут могуць гіпербалізавацца, а іншыя — прыглушацца. Гэта не ёсць вучнёўска-стараннае адлюстраванне жыцця. Гэта спроба адштурхнуцца ад руціннага, будзённага, каб дасягнуць больш глыбокага разумення быцця.

Н. Г.: Мы ўжо згадвалі, што сабраліся тут у дзень двайнога юбілею. І якраз Іван Антонавіч Брыль і з'яўляецца для мяне прыкладам якаснай літаратуры. Ён народны талент і таксама, дарэчы, не мае вышэйшай адукацыі. Але яго творы ствараліся на мяжы інтэлектуальнай прозы і паэзіі, гэта, бадай, самы тонкі і дасведчаны наш пісьменнік. Сапраўды, і Алена Кіш, і Пірасмані — выключна адораныя самародкі. Але хутчэй гэта выключэнне, бо мы ведаем і іншыя прыклады, І Шагал, і Пікаса, і Сальвадор Далі, і іншыя геніі трацілі шмат часу, каб авалодаць пэўнай школай, прафесійным майстэрствам — якаснымі паказчыкамі.

С. Ш.: Хвалі еўразійскай экспансіі даўно паглынулі б выспу беларускай культуры, каб не вулкан маладой пасіянарнасці. Гэта плюс. А мінус у тым, што рэгулярныя выкіды маладога імпэту ў нас знішчалі і будуць знішчаць усе захады больш сталых, ды спазнаных выбудоўваць нейкія іерархіі. Лепш, чым напісаў у другім гумары "Фрагмэнтаў" Міхась Баярын, і не скажаш: "Ты малады, я — мёртвы".

А. А.: Адносна іерархіі ды лідэра я таму гэтак паслядоўна агучваю гэтую тэзу, бо цяжка, да прыкладу, уявіць сабе футбольную каманду без добрага капітана. Ці род без родавага знаку, татэму. Гэтак нельга ўявіць літаратуру іншай краіны, не згадваючы падставовыя імёны. Сёння немагчыма застацца, адседзеўшыся ў родных хмызах. Каб быць — трэба прысутнічаць у свеце. У савецкія часы мы не здолелі дэлегаваць у свет ані Караткевіча, ані каго іншага. Калі, напрыклад, згадваецца Гішпанія, дык любы адукаваны чалавек скажа — Сервантэс, Сальвадор Далі. Каб сцвердзіць міф нацыянальнай культуры, патрэбны імёны. Шмат нашых імёнаў мы ўжо не здолеем раскруціць ніколі, бо іх час мінуў. Зараз патрэбны новыя імёны, новыя знакі. Мікола Селяшчук акурат для мяне і з'яўляецца гэткім імем. Зрабіць яго беларускім знакам вельмі рэальна. Ёсць такія мастакі, творчасць якіх актуальная для нашай краіны, але банальная для свету. І з гэтага пункту гледзішча трэба адмаўляцца ад карпаратыўнасці, раздраю, калі кожны цягне коўдру на сябе, і кожны лічыць, што ён ёсць класік — першы і апошні. Трэба супольна адчуць тыя імёны. Для мяне, напрыклад, гэткай асобай з'яўляецца Алесь Разанаў, які як адкрыццё ўспрымаецца ў свеце.

Н. Г.: Згаджаючыся і з тым, што трэба пазбягаць карпаратыўнасці і са значэннем Міколы Селешчука, і са значэннем тых мастакоў ды літаратараў, што выконваюць часцяком чыста утылітарныя адраджэнскія функцыі, я ўсё ж супраць таго, каб прагматычна расстаўляць усё па сваіх ячэйках. І калі ўжо прызнаваць, што літаратура — гэта гульня (хаця гэта не бясспрэчна), то трэба быць гатовым да нечаканасцяў. Заўжды будуць людзі, якія гуляюць, як кошка, самі па сабе. І жыццё нас будзе вельмі моцна выпраўляць. Пушкін казаў, што паэзія "должна быть глуповатой". Трэба даць волю творцу, і вядома, можа ўзнікнуць такі чалавек, які раптам нечакана для ўсіх пачне ствараць якасную літаратуру, не беручы актыўнага ўдзелу ў нейкіх структурах, хаця мы заўжды будзем штучна яго далучаць да той ці іншай плыні.

С. Ш.: Памылкай Саюза пісьменнікаў узору 80-х было меркаванне, нібыта гэтая структура з'яўляецца апошняй інстанцыяй, якая мае права выдаваць ліцэнзіі на наватарства або наследаванне традыцыі. Але ўзніклі "Тутэйшыя" ды ТВЛ. Пазней з'явіўся Бум-бам-літ. Сапсее Бум-бам-літ — абавязкова ўтворыцца нешта новае, больш правакацыйнае, блюзнерскае ды разбэшчанае. Эмансіпацыю беларускай літаратуры ўжо не спыніць. Хоць часам і падаецца, нібыта літаратурны працэс у Беларусі развіваецца гэтак жа, як і фінансавыя піраміды.

А. А.: Аніхто не аспрэчвае наяўнасці свабоды. Свабода — апрыёрная неабходнасць. Але мы ўжо адзначылі наяўнасць двух полюсаў, і якім свабодным ты не быў бы, аб'ектыўна ты будзеш належаць да нейкага полюса. Або ты будзеш пісаць рэалістычна, выкары-

стоўваючы сённяшнюю нарматыўную мову, ці ты будзеш творцам-наватарам — у стылістыцы, мове, светабачанні. У любым выпадку нельга сядзець паміж двух крэслаў. Калі мы стваралі ТВЛ, мяне пыталіся — ад каго тая свабода? Шмат хто казаў, што ён свабодна вызначае свае тэмы, хоча — друкуецца ў "Маладосці", хоча — у "Полымі". Але цяпер відавочна, іх свабода ў несвабодзе, у варунках, калі росчыркам пяра можна, да прыкладу, забраць Дом літаратара. Афіцыйныя літаратары не стварылі глебу для сваёй свабоды. Калі няма на што абаперціся, не будзе і руху наперад, не з'явіцца новая (нонканфармісцкая) іерархія. Хутка месца ў ёй зноў будзе зарабляцца паслугацтвам. Чаго вартая такая свабода? Новая іерархія мусіць фармавацца на падставе кансенсуса — сіламі ўсіх суб'ектаў літаратуры. Зразумела, немагчыма загадам па Саюзу пісьменнікаў вылучыць, напрыклад, Дранько-Майсюка на класіка. Не зробіць гэтага ані Дубавец, ані Быкаў, ані нехта іншы. Гэта робіцца самой хадой літаратурнага працэсу, самім пісьменнікам — наколькі ён здолее стварыць і данесці свой міф (уласны лёс + творчасць інтэрпрэтатара) да чытача. У Расіі таксама вялікі раздрай, але там разумеюць важнасць таго, каб пралабіраваць міжнародную прэмію, каб паказаць сваіх па Еўрабачанні, ці вылучыць Бэлу Ахмадуліну на Нобелеўскую прэмію.

Н. Г.: Я заўсёды быў прыхільнікам такой талеранцыі агульнага служэння літаратуры. Алесь прыйшоў да гэтага крыху пазней. Аб гэтым даўно ўжо гаварылася на нашых наваполацкіх канферэнцыях Полацка-Глыбоцкай філіі Саюза пісьменнікаў. Там якраз ставілася задача ствараць літаратуру, што і рэалізавалася зараз з узнікненнем нашага альманаха "Край". У нашым горадзе гэта ўжо другі часопіс, які выходзіць не ў цэнтры, але праблемы з аўтарамі не ўзнікае. Праблема ў фінансавым забеспячэнні гэтых праектаў. В. Акудовіч трохі іранічна пісаў у "Культуры", што "Край" паставіў перад сабой задачу зрабіцца лепшым не толькі ў рэгіёне, але і ў Еўропе. Пры наяўнасці свабоды гэта рэальна, бо з'яўляюцца яркія асобы, якіх мы не маглі прадбачыць. Тут ужо згадваўся Купрэеў. Можна дадаць сюды нашага полацкага пісьменніка Германа Кірылава, які два гады працаваў над сваёй вельмі папулярнай цяпер кніжкай "Гарт", і мала хто пра яго ведаў. Ці тая ж Ірына Дарафейчук, выдатная, на мой пагляд, паэтка, студэнты нашага універсітэта Андрусь Храпавіцкі, Алесь Аляксандраў, якія абяцаюць вельмі шмат...

А. А.: Зразумела, што ўсё спрагназаваць ды пракантраляваць — немагчыма. Але ў той жа Нямеччыне існуе больш чым 100 літаратурных прэмій ды стыпендыяў. У Нямеччыне нямецкі Купрэеў даўно б жыў ва ўласнай віле. У нас жа ніхто не парупіўся стварыць хоць якую незалежную прэмію, бадай толькі ПЭН-цэнтр, але гэта яго функцыянальны абавязак. Хоць я ўпэўнены, што зараз гэта не такая ўжо праблема — стварыць некалькі прэміяў памерам у некалькі тысячаў даляраў. Жыццё Максіма Багдановіча або Жылкі ўзнавіць немагчыма.

Н. Г.: На жаль, існуе практыка лічыць літаратуру даходнай справай, якая дапамагае рабіць кар'еру, атрымоўваць кватэру і г.д. Для гэтага дастаткова толькі залучыцца афіцыйным прызнаннем. Пісьменнікі проста развучыліся клапаціцца пра сябе. А калі ёсць некалькі фондаў, то заўтра прэмію атрымаеш ты, а потым пастараюся і атрымаю я. Гэта своеасаблівая каса ўзаемадапамогі. Не сакрэт, што са знікненнем вялікіх дзяржаўных ганарараў многія проста перасталі пісаць. Навошта займацца такой нерэнтабельнай справай, калі можна пайсці ганлядаваць гарэлкай...

С. Ш.: Я хацеў бы закрануць яшчэ пытанне амерыканізацыі нашай культуры. Мяркую, што для нашай традыцыі, хоць я і лічу сябе заходнікам, не падыходзіць такая сітуацыя, калі грошы дыктуюць усё. Калі "зорка"-баскетбаліст, які не можа звязаць двух словаў, больш папулярны, чымсьці пісьменнік, або актрыса Галівуда больш папулярная, чымсьці паэтка. І на гэтым прыкладзе я хачу паказаць неабходнасць адбудовы інстытута аўтарытэтаў. А маладыя, якія прыйдуць заўтра, няхай пазмагаюцца за свой Пантэон.

Н. Г.: Я не з'яўляюся прыхільнікам панславісцкага шляху, але амерыканскія культурныя стандарты гэтак жа не прымаю. Калі адбываўся Маскоўскі кінафестываль, то адзін амерыканскі рэжысёр прызнаў, што той жа Андрон Канчалоўскі можа скласці сур'ёзную канкурэнцыю, нават творчую апазіцыю амерыканскаму кіно. Наш еўрапейскі, славянскі, беларускі менталітэт сапраўды не мае нічога агульнага з амерыканскімі стандартамі. Я ўвогуле дзіўлюся, як там яшчэ чытаюць кнігі!.. Той жа Стывен Кінг пачынаў як сур'ёзны пісьменнік, а ўрэшце вымушаны быў ператварыць сваю творчасць у індустрыю. Там усё раскладзена па паліцах — гэта фэкшан, гэта фэнтазі і гэтак далей. І толькі ад нас залежыць, каб літаратура, пісьменнік, навуковец, інтэлігент займалі ў нашым жыцці годнае месца. За спрэчкамі мы не павінны забываць пра наш агульны клопат. Урэшце, мы павінны не толькі ствараць літаратуру, але і захоўваць у сваіх душах і сэрцах беларускае слова, Беларусь. І тут хапае месца і традыцыяналістам, і наватарам, і членам Саюза пісьменнікаў, і сябрам розных літаратурных суполак. Калі, канешне, стаіць за гэтым Дух, высокае памкненне, а не дробязныя амбіцыі і мітульга, не знішчальныя, разбуральныя памкненні і нізкія мэты.

КНІГАРНЯ

...А без дабра — цяжка

"Казкі" — так стрымана, без прэтэнзіі на арыгінальнасць, названа чарговая кніга нашага слыннага пісьменніка, а цяпер ужо і лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Георгія Марчука — яе выпусціла выдавецтва "Полымя". Адразу прыходзіць на памяць народная прымаўка: "Казка — жыццю падказка". А калі казка не фальклорны твор, а належыць пяру сучаснага творцы, значыць у ёй абавязкова можна правесці аналогію з днём сённяшнім. А паколькі гэтым жанрам, як правіла, захапляюцца дзеці, тым больш відочна: аўтар можа дасягнуць належнага поспеху толькі тады, калі сваю багатую мастакоўскую фантазію падмацуе выхаваўчымі момантамі, у якіх не будуць абыдзены розныя надзённыя праблемы.

У Г. Марчука ўсё гэта ёсць. І смелы палёт фантазіі, і значны падтэкст, і пэўная дыдактычнасць, якая, на шчасце, не зводзіцца да звычайнага навучання, а яшчэ прысутнічае тое, без чаго казка, нават пры наяўнасці ўсіх гэтых умоў, перастае быць казкай — зладжанасць, займальнасць сюжэта.

У сваіх казках Г. Марчук ідзе двума шляхамі. У першым выпадку, умела адштурхоўваючыся ад фальклорнай асновы, будуе ўласны казачны каркас, у якім узяты, як кажуць, напавер толькі асобныя "дэталі", у другім — цалкам давяраецца сабе, ствараючы літаратурны твор, арыгінальны ва ўсіх адносінах. Бадай, няма патрэбы шмат пераконваць, што абодва шляхі аднолькава плённыя, калі за пяро бярэцца чалавек таленавіты.

Першым шляхам Г. Марчук ідзе, прабачце за таўталогію, у першым раздзеле. Сама назва яго "Несцерка" не выклікае ніякага сумнення, што галоўны герой твораў (а іх восем) той самы любімы народам герой нацыянальнага фальклору, якому ў жыцці нішто ні па чым і які з любой сітуацыі хутка можа знайсці годнае выйсце.

Так, у казках Г. Марчука Несцерка — герой фальклорны, але гэта і герой Г. Марчука, бо аўтар не "пракручвае" вядомыя сітуацыі, а ставіць Несцерку ў новыя. І дасягае поспеху. А адметнасць Несцеркі, пададзенага Г. Марчуком, яшчэ і ў тым, што пісьменнік паказвае яго найперш жывым чалавекам. А таму Несцерка, як і кожны смяротны, можа трапіць у такі пераплёт, з якога, як ні сіліцца, выйсці пераможцам яму не ўдаецца. Пацвярджэнне таму казка "Як падманулі Несцерку". Да чаго ўжо кемным быў Несцерка, а не разабраўся ў хітрыках вядомага злодзея, а ў выніку, як кажуць, застаўся з носам. Ды яшчэ трапіў у сітуацыю, калі з яго людзі пачалі смяяцца.

А раздзел "Жылі-былі дзед Васільчык і баба Кацярына" складаецца з сучасных казак, дзеянне якіх адбываецца на дарагой сэрцу аўтара Брэстчыне, а калі канкрэтней — у ваколіцах Давыд-Гарадка, куды да дзеда і бабулі прыехалі на лета ўнукі. Яны і адкрываюць для сябе ўсю непаўторнасць і харастко вясковага жыцця, вучацца разумець прыроду, спазнаваць сакрэты яе жывёльнага і раслённага свету. У гэтых казках нязменна прысутнічае аўтарская назіральнасць над рознымі праявамі паўсядзённасці, шмат досціпу, што і дадае займальнасці. Але Г. Марчук расказвае не толькі пра дзень сённяшні, ён кіруе позірк юнага чытача і ў далёкую мінуўшчыну, а тым самым у творах прысутнічаюць і гістарычныя моманты.

Ёсць яны ўжо ў самым пачатку, дзе расказваецца пра паходжанне вёскі Ляды, у якой і адпачываюць юныя героі. Дзеці даведваюцца, што вельмі даўно ў гэтых мясцінах уладарыў унук Яраслава Мудрага Давыд Ігаравіч. Нядобрую славу займеў сабе гэты князь. Таму і быў выгнаны ў гэтыя тады яшчэ маланаселеныя мясціны. Ён і заснаваў Давыд-Гарадок. Па-свойму вытлумачвае Г. Марчук і паходжанне назвы "палешукі", упэўніваючы, што ў аснове гэтага слова хаваецца мара людзей аб зямлі, дзе б можна было збіраць ураджаі — поле шукаць...

Падобнае ў творах для дзяцей вельмі важна, бо таксама прывівае любоў да Бацькаўшчыны, пашырае іх кругагляд, а яшчэ вучыць уважліваму стаўленню да таго, што адбываецца наўкола. Тым больш выклікае прагу даведацца, што і як было раней.

Заключны раздзел "За ваколіцай" складаецца з казак, сюжэтна не звязаных між сабой. Калі ў першых двух з поўнай на тое падставай можна гаварыць пра элемент аповесці-казкі, дык у дадзеным выпадку кожны твор завершаны. А героі — героі добра вядомыя і па іншых казках. Толькі кожны з іх трапляе ў сучасныя сітуацыі.

Як, для прыкладу, у казцы "Ці кормяць ваўка ногі". Мядзведзік Касалапік і зайка Прыг-Скок "хадзілі ў лясную школу і вучылі там фізіку і механіку". Хадзіла ў школу і ваўчанё Піліпаўка, ды толькі вывучала зусім не гэтыя прадметы, бо і школа была іншая — воўчая. Наведнікі яе вучыліся розным воўчым навукам. І як вартаўнікоў і сабак падманваць, і як авечак красці... А якое выхаванне — такое і навучанне. Скончылася ўсё тым, чым і павінна канчацца ў казках, у якіх абавязкова мусіць быць шчаслівы канец. Пасябравалі Касалапік, Прыг-Скок з Піліпаўкам. Але перш чым дасягнулі такой згоды, адбылося з імі нямала цікавых прыгод.

І іншыя казкі — "Кот і Певень", "Прыгоды тушканчыка Мікітулі", "Шчупак", "Як Васілёк ездзіў у госці", "Чаканне Тэафіла" — і дарослымі нават чытаюцца, як кажуць, на адным дыханні. Што ўжо казаць у такім разе пра дзяцей! Асабліва, калі хлопчыкі і дзяўчынкі возьмуцца за кніжку пасля надакучлівых тэлевізійных мультсерыялаў, у якіх не толькі незвычайныя прыгоды персанажаў, а нязменна прысутнічае жорсткасць, насілле.

У Г. Марчука — іншае. У яго творах дамінуе дабро, спагада, шчырасць, таму і нязменныя светлыя моманты. Таму і шмат аптымізму, без якога цяжка ў жыцці. І асабліва цяжка тым, хто толькі ўваходзіць у яго.

А яшчэ кніга "Казкі" цудоўна афармлена (мастак Марына Капілава), выканана на высокім паліграфічным узроўні. Што ў наш скрушны час таксама немалаважна.

Язэп ЛІТВІНОВІЧ

І каханне, і горыч, і боль...

Кожная новая сустрэча з вершамі нашай зямлячкі **Вольгі Русілкі** сапраўдным аматарам паэтычнага слова нясе душэўную асалоду, рамантычную ўзнёсласць, радасць светаўспрымання. Менавіта такія пачуцці ўзнікаюць пры знаёмстве з паэтычным зборнікам "Табе", які выйшаў з друку ў "Бібліятэцы часопіса "Маладосць".

Радзіма, роднае слова, маці, каханне... Толькі чатыры галоўныя тэмы. Але іх унутраная еднасць і ўзаемадапаўняльнасць, цесная знітаванасць і непрыкметны пераход ад адной да другой ствараюць той паэтычны мікра- і макракосм, у якім сплецены інтымнае і грамадскае, асабістае і агульначалавечае, пераходнае і вечнае. Філасофска-этычная насычанасць праблематыкі зборніка, яе шматпланавасць і шматсэнсоўнасць становяцца больш даступнымі і зразумелымі для чытача, дзякуючы актыўнай жыццёвай пазіцыі галоўнага лірычнага героя. Дыяпазон яго светаадчування, адзнак і адносін да акаляючай рэчаіснасці распаўсюджаны і ў часе, і ў прасторы, ад шчырай і глыбокай павагі да сваіх мясцін ("Самае мудрае: мама і сцежка да роднага дому"), да адчування чалавечай адзіноты ("Мы ўсё бліжэй да адзіноты, мы ўсё далей ад нас саміх"); ад разумення яго вялікасці Слова да пасціжэння недасканаласці чалавечых адносін; ад дачкоўскай любові да Маці і Бацькі да драматычнасці і нават трагічнасці непадзеленага ці адрынутага кахання. І над усім гэтым уладарыць бязмежна... белы колер. Так, той самы "непрактычны" белы, на якім "не схаваеш і плямкі бруду!" Але для героя В. Русілкі менавіта ён выступае і лекарам чалавечай душы ("Уратуй мяне, Божа, белым... Атулі мяне, Божа, белым"), і нашай памяццю і надзеяй ("Птушка трывожнай надзеі, белая птушка мая".). Ён напамінае чытачу колер "мамінай скроні", пра белы покрыў зімы і пра "взлюмаў колер звычайны" ("Мо таму і дзяўчаты, як вішні, і чаруюць бялюткія маем").

Дзе б мы ні жылі, дзе б ні знаходзіліся, але ў памяці заўсёды застаецца родная хата, блізкія і знаёмыя з дзяцінства людзі і мясціны. Нават вызначэнне з'явілася — "малая радзіма". Знаходзіць адметныя словы да сваёй "малой радзімы" і Вольга Русілка.

Вузее сцежка ад роднага дома —
На ёй ні з кім не магу размінуцца.
Бліжэй той страшны лес, у якім
Усё больш маіх родных і блізкіх.

("Я адчуваю усёю істотай...")

І, канечне, галоўная ўвага — маці, якая "ратавала ад самай дробязнай бяды" і якая вывела на сцежку "ад роднага дому"... Маці і бацька, бабуля і дзядуля — самыя родныя ўсім нам людзі. З намі яны заўсёды — і ў шчасці, і ў горы, з імі мы дзелім свае радасці і поспехі, адчуваем востры боль пры іх страце: "Сышлі ў нябыт мае дзяды, адвекавалі і бабулі. Хто не адужаў сам бяды, каго дагналі злыя кулі. Яны сваё перажылі: рабілі, плакалі, любілі. І, як радзімкі, на зямлі чатыры сціплыя магілы".

Таму зусім жыццёвым выглядае галоўны клопат паэтэсы: "...І цяжка думаю начамі: а як мне маму ўратаваць?"

І ўсё ж самая багатая палітра чалавечых пачуццяў — у вершах аб каханні, якім у кнізе адведзена галоўнае месца. Не зусім проста сухой мовай крытычнага радка разважаць аб такой узнёслай з'яве, як чалавечае каханне ("Як тысячы гадоў таму, паэт спявае пра каханне..."), тым больш, калі на ім ляжыць адбітак жаночага пяра, жаночай душы і светаўспрымання ("за тысячай халодных кіламетраў, за дзесяццю маўклівымі гадамі, за ніткаю адчайнай сівізны — каханне").

Што ж хвалюе тут гераіню В. Русілкі? У першую чаргу, як мне здаецца, гэта стан надзвычайнай душэўнай узвышанасці ад шчасця кахаць і быць каханай. Таму і нараджаюцца нечаканыя эпітэты і параўнанні ("Ты маё вечаровае сонца, найдарожшы апошні прамень". Ці яшчэ: "Твой вобраз — найсвяцейшы мой абраз. Я да яго і плачу і малюся"). Вершы гэтыя светлыя, радасныя, гучаць аптымістычна, сцвярджаючы веру ў шчасце і будучыню. І як жа бывае балюча, калі такое адчуванне праходзіць, затухае, яшчэ горш, калі адзін здраджвае другому. Не прамінулі такія адчуванні і гераіню лірычных вершаў В. Русілкі. Спачатку — раўнадушша ("Цёмны вір у мяне наперадзе. Ён маёю слязою поўны. А табе... Табе ўсё роўна"), потым — сумненне ў пачуццях ("Нашто табе мая самота? Нашто табе мая любоў?") і ўрэшце тое імгненне, калі двое разумеюць, што "сэрца вылюбіла да дна..." І вось тут у вершах В. Русілкі праглядваецца яшчэ адна адметнасць, яе гераіня вельмі тонка адчувае набліжэнне той мяжы, за якой знікае каханне. Сведчанне таму — стан душэўнага болю, які, як своеасаблівы камертон, настройвае, рыхтуе душу да сустрэчы з надыходзячай бядой ("Жыву заўсёды ў прадчуванні болю...").

Цяжка прызнавацца, што яшчэ нядаўна блізкія адзін другому "Ён" і "Яна" ("Ты быў маім, і я — "навекі тваёю") адчувалі сугучнае біццё сэрцаў, паразуменне, пяшчоту... І вось усё ў мінулым: "быў", "была", сэрца проста спакою просіць. Пачуццё разгубленасці і адзіноты, што ахоплівае душу, згубіўшую каханне, у В. Русілкі ўсё ж не вядзе да жыццёвай разгубленасці, не ператвараецца ў трагедыю.

Нельга пакінуць без увагі адносіны паэтэсы да роднага Слова, у якім знітаваны гісторыя і сучаснасць, дабрата і мудрасць, давер і спагада: "Да мяне прытулілася Слова, як дзіця да спагаднай рукі . Чым давер апраўдаю такі?" — задае сабе пытанне В. Русілка. "Вершаваным радком", — падказалі б мы адказ на яго. Радком, у якім дыялектычна спалучаюцца багацце чалавечых пачуццяў, супярэчнасць акаляючага нас свету і майстэрскае валоданне словам. Вершы, змешчаныя ў зборніку "Табе" — гэта не мудрагелістыя паэтычныя канструкцыі і не вершатворнае эксперыментатарства. Для В. Русілкі характэрна не толькі веданне і ўмелае выкарыстанне асноўных правілаў вершатворчасці, але і багацце, і разнастайнасць паэтычных форм, напрыклад, хоку, белы верш, верш-зварот, шырокае выкарыстанне сродкаў эмацыянальнага падкрэслівання душэўнага стану героя. Адносіны да верша, слова, паэтычнай творчасці вельмі ўдала, на мой погляд, выказаны паэтэсай у наступных радках:

Я вершаў не выспеўвала ніколі.
Яны прыходзілі, ратуючы мяне
Ад гора і ад горкае нядолі,
Што лёс, на жаль, ніяк не абміне...

Аркадзь РУСЕЦКІ,
доктар гістарычных навук,
прафесар

ЛіМ ЧАСАПІС

Яшчэ адно імя

Міхась Кулеш нарадзіўся ў Мінску ў 1962 годзе. Скончыў школу, служыў у арміі, а пасля паступіў у Беларускі дзяржаўны політэхнічны інстытут. Працаваў аўтаслесарам і майстрам па рамонце аўтамабіляў. Цяпер жыве ў вёсцы Крупіца Мінскага раёна. М. Кулеш з тых, хто не толькі любіць літаратуру, а і сам піша. Асобныя творы яго друкаваліся ў рэспубліканскіх газетах і часопісах, а цяпер у М. Куляша выйшла і першая кніга "Вялікдзень" — яна стала ліпеньскім зборнікам у "Бібліятэцы часопіса "Маладосць" за сёлетні год.

Апавяданне, якое дало назву кнізе, падказана аўтару самім жыццём, і ў гэтым творы, канечне, угадваюцца асобныя аўтабіяграфічныя моманты. Прынамсі, у тым, што галоўны герой Сцяпан, гараджанін ад нараджэння, перабраўся ў вёску, дзе пабудаваў сабе дом. Разам з тым у апавяданні схоплены і ўвогуле побыт сучасных вяскоўцаў. А піша М. Кулеш з гумарам, расказваючы пра сваіх аднагодкаў. Нездарма Анатоль Казлоў у прадмове да зборніка зазначае: "Калі чытаеш творы Міхася Куляша, то адразу ж узнікае адчуванне нечага светлага і ўзнёслага, што перапаўняе душу, падштурхоўвае да асэнсавання жыцця, да роздуму не толькі пра дзень сённяшні, а і пра наканаванае лёсам кожнаму з нас у дні заўтрашнім. Не, тут няма і намёку на нейкае прароцтва, але аўтар імкнецца сам асэнсаваць і скіраваць чытача да няпростай думкі: дабрабыт жыцця зямнога без душэўнасці і духоўнасці — дробязь".

Акрамя апавядання "Вялікдзень", увазе чытача прапануюцца яшчэ два творы "малога жанру" — "Аднойчы ў вайну" і "Выратуй і зберажы", а таксама невялікія аповесці "Хворы бацька" і "Алеся".

Пісаў пра Скарыну

Расія адзначае 190-годдзе з дня нараджэння фалькларыста, мастацтвазнаўцы, этнографа, гісторыка кнігі Івана Сахарава, які памёр 10 верасня 1863 года. Але І. Сахараў мае дачыненне і да Беларусі, паколькі ў сваёй даследчыцкай дзейнасці закранаў асобныя аспекты беларускага кнігадрукавання. У прыватнасці, у даследаванні "Агляд славянарускай бібліяграфіі ў дзвюх кнігах" ён апісаў пражскія і віленскія выданні Скарыны, а ў працы "Узоры славянарускага кнігадрукавання з 1419 года" прывёў рэпрадукцыі гравюраў, арнаменту, шрыфтоў з гэтых выданняў.

"Роднае слова", N 8

У раздзеле "Школа і нацыянальнае адраджэнне" змешчаны нататкі А. Саламевіча пра Мінскі дзяржаўны педагагічны каледж "Каб не згасла поўня" і выступленне дырэктара гэтай навучальнай установы А. Бялькевіча "Слова пра каледж". Друкуюцца таксама артыкулы выкладчыкаў гэтага каледжа І. Казлоўскага "Урок абагульнення і паўтарэння па тэме "Службовыя часціны мовы" і Л. Ісачэнкі "Гэтая салата крыху гаркавата..." у "Літаратурным ветразі" М. Скобла знаёміць з творамі навучэнцаў каледжа.

Змешчаны развагі Д. Бугаёва пра творчасць Я. Брыля "Служэнне Беларусі", артыкулы М. Прыгодзіча "У слаўным горадзе ў Празе..." (да 480-годдзя першага выдання "Псалтыра" Ф. Скарыны), А. Крывіцкага "Назва Палессе — свая ці чужая?", заканчэнне артыкула М. Тычыны "Ісці ў свет — і не губляць сябе" (беларуская проза апошніх гадоў).

М. Шавыркін выступае з эцюдамі "Тапаліны звон" і "Старана мая былінная", у якіх закранае сувязь творчасці П. Панчанкі і Я. Янішчыц з музыкай. В. Скорабагатаў працягвае "Анталогію беларускага раманса" — "Ўлі надзею добрым думам..." (дзейнасць Альбіна Ставовіча). С. Харэвіч ("Зіма з летам сустракаюцца, новай песняю вітаюцца...") разважае пра песні каляндарна-абрадавага цыкла.

У нумары — заканчэнне даследавання Т. Шамякінай "Культура Індыі", артыкула Т. Габрусь "Тут жылі некаранаваныя каралі", лірычныя ўспаміны Г. Бураўкіна пра П. Панчанку "З жаўранкам у душы" і шэраг вершаў народнага паэта, артыкул В. Скалабана "Хай ведаюць патомкі..." (Алесь Гарун — дэлегат і гісторык Усебеларускага з'езда 1917 года), старонкі з дзённіка Г. Каржанеўскай "Надыдзе хвіліна — і нашыя сцежкі сплятуцца..." і яе вершы, шэраг іншых матэрыялаў.

ПАЭЗІЯ

Віктар ШНІП

"І ўсё гэта пыл..."

Снег

1

снег гэта святло
якое падаючы з вышыні
памерла ад страху
але ўпаўшы на зямлю
адчула свой час
і ажыло

2

снег гэта белы пыл
з-пад колаў боскай вазніцы
і мы з гэтага пылу
можам стварыць свой свет
белы і часовы

3

снег гэта сон
які сніцца Снягурцы
што ўзляцела над вогнішчам
і знікла ў небе
з якога пасыпаўся снег
як попел

4

снег гэта квецень садоў
якія цвітуць у пекле
і сыплецца гэтая квецень
на чорную як цень зямлю
і сыплецца гэтая квецень
спакушаючы нас

5

снег гэта тое што будзе
але што будзе
ведае толькі снег

СВЯТЛО. 6

і стала светла
і холадна
і гэта было святло
якое мы бралі ў рукі
і яно знікала
як белы ветразь
пад якім адплывала зіма
на край святла
як на край свету

ПЫЛ. 7

і ўсё гэта пыл
і ўсё гэта сумна
і сыплецца гэты пыл
як у пясочным гадзінніку пясок
і пыл засыпае нас
і ўсё гэта пыл

СОН. 8

у гэтым сне
спяць чорныя дрэвы і травы
і вецер бяздомны злуецца
і я ведаю што гэта сон
і я іду праз яго
як праз белы прывід
і хочацца прачнуцца
і сон разгадаць

КВЕЦЕНЬ. 9

па квецені гэтай
мы едзем з табой
над квеценню гэтай
як пчолы вароны
і ў квецені гэтай
як у кокане матыль
драмае вясна

10

толькі ведае снег
чаму ён снег

●

Пыл уздымаючы ў цесным двары,
Вецер аб шэрыя б'ецца муры.
Неба над горадам, як цэлафан.

Лісце зрываецца з дрэў і ляціць.
Сумныя думкі, ды хочацца жыць,
А не знікаць, як пад сонцам туман.

Выйду на двор, нібы выйду з турмы,
Светлымі шэрыя стануць дамы
Толькі на міг і сцямнеюцца зноў.

Лісце зрываецца з дрэў і ляціць...
Можна і горад, як сон, палюбіць...
Толькі ці вечная будзе любоў?

●

Гартаю пажаўцелыя выданні,
Самотныя, як вершы аб каханні,
Якое адышло, як дзень вясновы...
Чытаю вершы, як цалую словы,
Каб словы ажылі і ў свет ляцелі...
Гартаю дні, якія адшумелі,
Як восеньская мёртвая лістота,
Якой і мёртвай
шчэ пажыць ахвота.

●

У чорным куфлі чорнае віно,
Нібыта ноч, якой чакаў даўно,
Нібыта цень, які слугуе нам,
Нібыта кроў, якой пазбыўся хам.
У чорным куфлі чорнае жыццё,
На чорных дрэвах чорнае лісцё,
І чорны вецер гоніць чорны пыл,
І, быццам німб, чарнее небасхіл...
У чорным куфлі чорнае віно.
Якое спакушальнае яно,
Бо ў белым куфлі ўжо віна няма,
А на дварэ цямнеча і зіма.

Шэсць дзён адзіноты

Людміле

●

за вокнамі дождж
птушкі спяваюць
яшчэ дзень адзіноты

●

скача вавёрка
сыплецца шыльнік
у кронах сосен вецер

●

у травах лазняк
туман над вадой
спіць страказа на карчы

●

вогнішча тухне
цені блукаюць
холадам вее з кустоў

●

мурашка на пні
на травах раса
сонца яшчэ за хмарай

●

прысніў дарогу
блішчыць гадзіннік
у шыбу б'ецца матыль

●

Знікае сцюдзёнае нуднае лета,
Як песня, якая ваўкамі прапета,
І, нібы ваўчынае ў полі выццё,
Такое і нашае ў леце жыццё,
Падхоплена ветрам і ў тлумнасці дзён
Ляціць і знікае, як мроя, як сон,
І будзе забыта, як гэтае лета,
Як гэта, што спалена мной, цыгарэта.

Жывём...

Жывём... А можа,
гэта ўсё нам толькі сніцца,
Што мы жывём
у гэтых цесных камяніцах,
З якіх, нібыта вязні,
мы глядзім на свет?

Спяшаемся,
але спазняемся заўсёды,
Стамляемся ад чэргаў,
ад дурной работы,
Не могучы без кавы і без цыгарэт.

І хочацца нам вечна свет
свой перайначыць,
І хочацца за горад выехаць і ўбачыць
Як сонца праз туман усходзіць
над жніўём.

Спяшаемся, ізноў спазняемся, гаруем,
І ўжо іконы ў храмах,
грэшныя, цалуем...
Жывём... Няўжо мы гэта
ўсё яшчэ жывём?

●

У белае мора зімы
адплывае наш човен...

Людміла Рублеўская

Снегам засыпана нашае ўчора...
І навакол толькі снежнае мора
Нам засталося ад роднай зямлі,
Дзе паміралі і дзе мы жылі.
Снежнае мора — у цэнтры Еўропы,
Тонуць у моры паны і халопы
І анікому ратунку няма.
Нашае сёння — вось гэта зіма,
Што пачалася з халодных вятроў,
З хмараў дажджлівых і жоўтых лістоў,
Жоўтых лістоў,
што з табой мы збіралі,
Чорных лістоў, што ў калюгі апалі.
Моўчкі праз вокны глядзім на зіму,
Моўчкі глядзім, бо вядома чаму
Снегам засыпана нашае ўчора...
Мора ў нас ёсць — гэта снежнае мора,
Нам праз яго д'яблам дадзена плыць.
Снежна навокал і хочацца жыць...

●

Мы ідзём невядома куды,
Мы ўцякаем ад сну і жуды
І не бачым наперадзе дня,
Толькі чуем — за намі гайня,
Ад якой анідзе не ўцячы,
І над намі, як лёс, крумкачы.
Мы ідзём невядома куды,
І снягі, быццам з раю сады,
І вятры, нібы ў пекле пажар.
Мы ўцякаем ад явы і мар,
Ды ўцякаем, напэўна, дарма,
Хто ўцякае — таго ўжо няма,
Як няма ў дамавінах цяпла,
Як няма ў галавешках святла...

●

Сёння вецер у Храм заляцеў,
Сёння з Храма ўзляцелі анёлы,
І мой дзень, як вада, пацямнеў
І пацёк праз мяне невясёлы.

Я ішоў, нібы цень, нібы сон,
І знікаў, нібы пыл, над травою,
І нябёсы шумелі, як клён,
Пад якім развітаўся з табою.

Я ішоў невядома куды,
Я ішоў так, як смерці шукаюць,
І знікалі за мною сляды,
Як сябры пасля п'янкі знікаюць.

Адзіноты я не разумеў,
І сябе праклінаў, невясёлы...
Гэта д'ябал у Храм заляцеў,
Гэта з Храма ўзляцелі анёлы.

●

Сцюдзёны вецер. Цемра, як вада.
Па вуліцы іду, нібы па дне
Рачным, і неба не відаць,
І не відаць на вуліцы мяне.
І быццам бы цыклоп, ліхтар стары
Праз ноч плыве няведама куды,
Сваім святлом абмацвае муры,
І цені чорныя, нібы каты,
Каля муроў хаваюцца ў кусты...
Сцюдзёны вецер. Цемра, быццам пыл,
Ляціць у неба і знікае там.
І праступае дзень праз небасхіл,
Нібыта Бог да нас ідзе праз храм.
І ў ліхтары, нібы матыль начны,
Хаваецца ліхтарнае святло...

●

Усё сплывае ў небыццё,
І мы, і нашае жыццё,
І гэты дзень, які, як сон,
Але нягледзячы на скон,
Жывём, і нашае жыццё —
Нібыта на вятры лісцё.
Сумуем, што знікаем мы,
Нібыта снег пасля зімы,
Нібыта дым пасля агню,
Які ляціць увышыню,
Не знаючы, што там нябыт.
Адно смяецца Вечны жыд,
Бо ён паверыў — вечны ён,
Як гэты дзень, як крык варон,
Як на кладах пясок, крыжы,
Як на палях трава, глыжы...

ПРОЗА

Алесь ДРАЯНКОЎ

ЗАБОЙСТВА ПА-ТУТЭЙШАМУ

АПАВЯДАННЕ

I

Тамашэнка нерухома стаяў ля вакна, утаропіўшыся лупатымі вачыма ў брудную шыбку, праз якую можна было ўбачыць шыхт міліцыянераў, які зухавата ўздымаў задушны пыл на небрукаванай местачковай вуліцы. Знянацку проста пад вакном міліцыянеры дружна і радасна загарлалі:

Казаки, казаки!
Едут, едут по Берлину
Наши казаки!
Америка, Америка,
Запомни этот день!
Казаки, казаки...

Песня ўспудзіла коціка, які на другім баку вуліцы асцярожна і ўважліва вынюхваў нешта на падмурку. Коцік стрымгалоў кінуўся ў двор. Схамянуўся і Тамашэнка. Ён разумеў радасць міліцыянераў: іхняя клопатная і небяспечная служба пакуль што скончылася, і яны шыбуюць да чыгункі, каб ехаць дадому. А для яго галоўнае толькі пачынаецца.

Вось насустрач строю марудна крочыць чыгуначны міліцыянер з недарэчнай шабляй пры боку. Ён стомлена шоргае па пыле стаптанымі ботамі, пад пахай адной рукі трымае бруднаватачырвоную форменную шапку, закаўрашам другой абцірае пот на загарэлым твары. І па ўсім ягоным выглядзе можна зразумець, што нічагусенькі новага гэты стомлены да абыякавасці чалавек Тамашэнку не скажа.

Значыць, трэба далей шукаць нейкія пераканаўчыя ці, хутчэй, хітрыя доказы начальству сваёй адхіленасці ад справы, каб не абрынулася ягоная кар'ера, а мо і жыццё. Гэткая ўдалая кар'ера... Усім нутром ён, нібы звер, адчуваў небяспеку. Здаецца, нават большую за тую, што вызначыла пачатак ягонага шляху ў самастойным жыцці.

II

А пачатак і сапраўды быў проста жахлівы. Тамашэнка толькі паспеў здаць іспыты за сярэднюю школу і збіраўся паступаць у медыцынскі інстытут, калі пачалася вайна. Яго мабілізавалі і накіравалі ў вучэбную вайсковую часць. Але навукі не атрымалася, бо прыйшла вестка, што нямецкія танкі прарваліся і пруць да іх. Спыніць іх загадалі курсантам. Увечары яны выкапалі акопчыкі, а ўначы дрыжэлі да ранку ці то ад золі, ці то ад жаху, бо з усёй зброі ў іх на двох з напарнікам была адна граната, дый тая без запальніка.

Танкі пайшлі іншым шляхам, хлопцаў адвялі ў тыл на размеркаванне па часцях. Перажыты жах надаў Тамашэнку гэткай смеласці, што ён назваў сябе студэнтам-медыкам. Медыцынскі начальнік, да якога трапіў уяўны медык, адразу раскрыў падман, але пашкадаваў хлопца і паслаў яго на вучобу.

Вайна ішла, а Тамашэнка спачатку вучыўся, потым увішна здолеў трапіць да наноў фармуемай часці на Паўночны Урал. Тут таксама пашанцавала: пераканаў начальства, што жаўнерам вельмі карысныя багатыя на вітаміны тутэйшыя ягады. Яму амаль штодзённа давалі роту жаўнераў, яны збіралі дармовую страву, палову якой Тамашэнка прадаваў нарыхтоўшчыкам. На гэтыя лёгкія грошы ён добра тады папіў-паеў, дый яшчэ і падсілкоўваў начальства, каб зычлівейшае было.

Але ўсё на свеце мае канец. Давялося ехаць на фронт, а там ужо не быў патрэбны тамашэнкаўскі спірт, бо кожнаму належала па 100 грамаў гарэлкі на дзень, перад атакай — і ўсе 200, а калі ў заяўцы заставаліся "мёртвыя душы", дык яшчэ атрымліваўся немалы навар. І пайшоў бы ўрэшце нікому ўжо непатрэбны Тамашэнка мо і пад трыбунал, як нежаданы сведка ўсялякіх махлярстваў, але выручыў стары сябра па пляшцы, асабіста. Вельмі своечасова "па сваіх каналах" уладкаваў ён Тамашэнку на вакансію ў фільтрацыйным лагеры.

Ды сядзець у лагеры нявесела нават вольнаму. Тамашэнка і тут выкруціўся: перайшоў з медыкаў на "асноўны профіль", а тады ўжо трапіў на вучобу ў вышэйшай школе гэтай установы. А там і вайна скончылася.

Чалавек — творца свайго лёсу. Тамашэнка вызначыў свой лёс, калі пасля вучобы адвярцеўся ад пасады начальніка заставы на Паміры і дамогся прызначэння на радзіму, дзе заступіў на вакансію раённага ўпаўнаважанага МДБ.

III

Вакансія надарылася вельмі своечасова і — нечакана. Бо тады і ў гэтай мясцовасці нічога не пагражала ўладзе. Хаця ў суседнім раёне ўзарвалі супрацьтанкавай мінай старшыню калгаса разам з хатай, але тое злачынства было, відаць, не палітычнае. А ўвогуле сітуацыя была досыць спакойная. МДБ з дапамогай былых партызанскіх камандзіраў метадычна падчышчала тых, хто нейкім чынам спагадлівы да акупантаў, ды час ад часу карала тых, хто ўголас выказваў незадавальненне жыццём.

Дайшла чарга і да нейкага Зеленчука. Ён быў мабілізаваны немцамі для аховы чыгункі. Партызаны так заелі было "рэйкавай вайной", што ўсцяж палатна акупанты сталі ставіць праз кожныя 200 крокаў вартавых. Іх набіралі з сем'яў, у якіх было двое мужчын: нібы каб не перашкодзіць гаспадарцы, а ў сапраўднасці — каб мець заложніка. Бо які бацька не папярэдзіць сына, калі пачуе, што блізка партызаны, а які сын уцячэ, кінуўшы бацьку на расправу, калі не пажадае выконваць загад?

Так і прастаяў Зелянчук блізу паўгода на варце, гатовы кінуць стрэльбу і схавацца пры небяспецы. Але Бог засцярог яго, і ўцякаць не давялося. Не ўцёк ён нікуды, калі і фронт прайшоў праз раён. Прасіцца ў партызаны таксама не пайшоў, а каб не ўзялі на фронт, скасаваў сабе гады і ціха сядзеў дома, пакуль не пачалі браць і такіх, як ён.

Што рабіць? Знайшліся дарадцы са старэйшых, што параілі хавацца, бо, маўляў, хутка пачнецца вайна з Амерыкай, і тады ўсё пераменіцца. Зелянчук схапіўся за гэтую параду, бо яна вымагала найменшых высілкаў. Ён зрабіў пад страхой патаемнае выйсце з тыльнай сцяны хаты, на дворышчы — схоўку і пачаў чакаць змен.

Аднойчы ўвечары ў дзверы хаты пагрукалі.

— Хто там? — спытаўся бацька.

— Хама, сусед! Даруй, але скончыліся запалкі, пазыч хоць пару да ранку, калі магазін адчыніцца.

Бацька няспешна запальваў ліхтар, марудзіў, пакуль сын лез з сенцаў на гарышча, потым адчыніў дзверы, і адразу быў адштурхнуты ўбок людзьмі ў форме. Зелянчук з перапуду даў чаргу з аўтамата, што было і неабавязкова, слізгануў пад страхой за хату і пабег да блізкага кустоўя за пляцам. Наўздагон яму ляцелі кулі: ацалелы сяржант міліцыі спознена страляў у цемру, на гук. А райупаўнаважаны быў забіты, стварыўшы такім чынам вакансію.

IV

Вось за гэта і давялося адразу ўзяцца новаму ўпаўнаважанаму. Справа пасоўвалася нечакана цяжка. Ужо забілі другога ўцекача такога ж гатунку. Ён недзе шлындаў уначы, а зранку ўлёгся адсыпацца ў лесе дый дапяў легчы на сухое між хмызняку, а тое сухое было дарогай, па якой вельмі дарэчна ехалі на вахту міліцыянеры на возе. Ён падхапіўся, але запозна, і яго застрэлілі. Прынамсі, так распавядалі самі міліцыянеры. Забіралі і іншых, каго належала. А Зелянчук усё заставаўся нязлоўным.

Тамашэнка апраўдваўся, што не хапае людзей, што ён новы работнік, не разгарнуў сваю агентуру, што іншыя справы патрабуюць увагі. Нарэшце яму прыслалі падмогу. Але ж клопатаў паболела, бо памагатых трэба было ўладкаваць, карміць, даваць ім загады. Міліцыянеры сядзелі ў схоўках, прачосвалі лясы, нават з сабакамі-знайдамі, але — безвынікова.

Вось тады і заявіўся "назіральнік" — занудлівы, зацяты тып гадоў 30—35, у круглых акулярах. На ягоным бледным твары ніколі не праяўлялася нават ценю ўсмешкі, а пільны позірк імгненна патухаў, калі напаткоўваў позірк суразмоўніка.

Тамашэнка адразу ж пачаў плакацца і яму, але прадстаўнік з пагардлівай кпінай працадзіў:

— Вы бы исчо дивизию заказали на одного преступника. Щас! Сматри, какой быстрый! Работать надо головой, а не языком! Не числом, а умением!

Якое менавіта ўменне патрэбна, ён не растлумачыў, але хутка адбылося нешта, што паскорыла падзеі.

V

Адным ранкам хлапчукі з райцэнтра наладзіліся ў лес па арэхі. За імі ўнадзіўся і сын райваенкама. Яго чураліся, але — не пасмелі адмовіць. Хлапчукі пільна выглядалі ў лістах арэхі, а сынку ваенкама хутка абрыдзеў гэты занятак, і ён больш паглядаў па баках, напяваючы любімую бацькаву песню: "Из-под дуба, из-под ели, из-под дубова коренья..." Таму і заўважыў першым дзяўчыну, якая, пужліва азіраючыся навокал, паставіла пад хваіну свой клуначак і стрымгалоў пабегла прэч. Усчаліся між хлопцаў гаворкі, выказваліся розныя здагадкі ды жарцікі, ажно пакуль старэйшы, як што засцяміўшы, не цыкнуў на ўсіх загадаўшы маўчаць і нікому пра бачанае — ні слова.

Ды за абедам ваенкамаўскі сынок ляпнуў бацьку пра тое загадкавае здарэнне. Бацька тут жа кінуў лыжку, накінуў кіцель і пабег з хаты. Прадстаўнік, выслухаўшы, задаволена сказаў: "На ловца и зверь бежит!"

Ужо на наступны дзень не толькі вязніца, але і яе падворак былі поўныя жанчынамі, якія нічога не разумелі і адно галасілі. Мужчынскай палове, што прыбегла на паратунак, прадстаўнік растлумачыў: усе бабы затрыманы за "пособничество врагу" і атрымаюць па 25 гадоў, калі не дапамогуць злавіць ці абясшкодзіць злачынца.

Праз пару дзён на рынак у райцэнтры заехаў грузавік. Калі адкінулі барты, людзі ўбачылі ў кузаве забітага. Гэта быў Зелянчук. На яго напаўраспраненым целе былі бачны тры дзірачкі ад куль. Спачатку людзі жахнуліся, ды цікаўнасць перамагла, і яны пацёху акружылі машыну. Пайшоў туды і Тамашэнка — паслухаць, што будуць гаварыць. На ганку да яго памкнуўся міліцэйскі камандзір: маўляў, дазвольце збірацца дадому. Дазволіў. Спакутаваны бабскімі слязамі дзяжурны спытаў, што з гэтымі бабамі рабіць. Ён загадаў адпусціць. Шафёр прасіў дазволу парамантаваць-агледзець ужо не новую службовую машыну, якой у апошні час занадта дасталося. Таксама дазволіў і павольна пайшоў да пляца.

Першымі пры ім падышлі два вельмі падобныя адзін да аднаго хлопцы ў бобрыкавых паліто, што ніяк не пасавалася з цёплым надвор'ем, і ў кепках. Яны самавіта і няспешна абышлі машыну, пільна і сурова ўглядаючыся ў забітага. Крокі іхнія былі запаволеныя, нібы ў жаўнераў на парадзе, шыі ўцягнуты ў плечы, рукі — у рукавы. Моўчкі адышліся, бесстаронна гледзячы перад сабой.

Падышла старая, тужліва падперла твар рукою. "Ах, гора, гора... Такі маладзенькі... І хто ж яго так?" — "Міліцыя, бабка, міліцыя, — строга сказаў Тамашэнка. — З усімі бандытамі вось так будзе..." Старая спуджана і разгублена глянула на яго і дробна падыбала прэч.

За ёй набегла зграйка выпушчаных з-пад арышту жанчын у хустачках. Жанчыны безупынку стракаталі, паспяваючы адначасова гаварыць і слухаць усіх іншых. Ля машыны жанчыны змоўклі, адно ціха войкалі ды ўздыхалі, пакуль адна не прамовіла спуджана:

— Глянь на галаве колькі крыві! А на жываце дык няма...

Тамашэнка зіркнуў на іх. Жанчыны сумеліся і неяк ціха разышліся-разбегліся, ледзь не збіўшы мужчыну ў куфайцы і гумовіках, склееных з аўтакамеры.

Больш нічога цікавага Тамашэнка не пачуў і пакіраваў да бліжэйшай, чыгуначнай, крамы.

Тут народу было больш, чым ля машыны на рынку. Не зважаючы на іх, Тамашэнка рашуча накіраваўся да прылаўка.

— Манька, дай бутэльку і бляшанку крабаў! Грошы — пасля!

Прадаўшчыца паспешліва падала яму і адно, і другое, і ён працісну́ўся вонкі, хаваючы на хаду ў кішэнях макінтоша пляшку і бляшанку.

У канторы самотна і задумліва сядзеў прадстаўнік-назіральнік. Тамашэнка паставіў перад ім гарэлку і кансервіну, дзве брудныя шклянкі. Выняўшы з кішэні нож, сказаў:

— Адзначым заканчэнне справы! І нашае знаёмства.

А сам сабе падумаў: "Каб ты здох!"

— Окончание? — здзівіўся прадстаўнік і адсунуў тамашэнкаўскае частаванне. — Да все только начинается по-настоящему. Мы напали на след крупной антисоветской организации и сейчас, значит, начнем ее раскрывать. Я продумал схему. Вызывайте на допрос этих женщин. По одной. Начнем с...

— Якіх жанчын? Я іх адпусціў.

Прадстаўнік змяніўся тварам і пачаў павольна падымацца, і чым вышэй ён падымаўся, тым больш знясільваў Тамашэнка.

— То есть как? Вы понимаете, что вы натворили?! Разберемся... Кому вы служите...

— Яшчэ не запозна. Можна іх перахапіць, — замямліў Тамашэнка. І раптам з жахам прыгадаў, што машыну ж ён дазволіў разбіраць. Ён кінуўся тэлефанаваць у райкам, выканкам, усім, хто меў машыны. Прадстаўнік маўчаў, толькі пагардліва назіраў за ягонымі намаганнямі. Урэшце машына знайшлася, але толькі каб адвезці. Тамашэнка паабяцаў, што ягоны ўсюдыход будзе тэрмінова наладжаны, і сабраўся ехаць з прадстаўніком, але той непрыязна адхіліў ягоны намер, параіўшы паскорыць рамонт машыны.

Прадстаўнік паехаў. Паехаў адзін, не чакаючы збору міліцыянераў, што паспелі разысціся. Тамашэнка ж падняўся ў свой пакой, прагна праглынуў пару шклянак гарэлкі і доўга змрочна сядзеў, пакуль не заснуў проста за сталом.

Зранку Тамашэнка стаў чакаць навін. Але іх не было, прадстаўнік не з'яўляўся, а шукаць яго Тамашэнка не жадаў. Але патэлефанавалі з вобласці. Уздыхнуўшы, ён узяў слухаўку і папрасіў станцыю даць яму патрэбны калгас. Тое, што ён пачуў, адразу ацверазіла яго. Прадстаўніка там не было, і дзе ён — невядома. Але ўчора прыязджаў і назад той жа машынай не паехаў. Та-а-к...

Тамашэнка загадаў пашукаць прадстаўніка па вёсцы, даў даручэнне чыгуначнай міліцыі праверыць, ці не паехаў прадстаўнік цягніком проста ў горад, бо да раз'езду ад вёскі было не так далёка — кіламетраў сем.

І вось цяпер ён стаяў і глядзеў у вакно на чыгуначнага міліцыянера, разважаючы, што ж рабіць далей...

VI

Машына падкаціла да будынка праўлення калгаса, калі ўся вёска была ў полі.

— Камандзір-начальнік, пільны назіральнік! — узрадавана падхапіўся з прыступак вядомы паўраёну дурань-прыпадачны. Ён звіхнуўся яшчэ падчас фінскае вайны, калі кавалерыю, дзе ён служыў, паслалі лаваю захапіць доты, якія ніяк не магла ўзяць пяхота. "Пачакай, дабяруся калі-небудзь да цябе", — падумаў Тамашэнка і прайшоў у кантору.

Жанчына, што старанна перапісвала нейкія спісы, напалохалася, убачыўшы яго, ціхенька адказала на прывітанне. Да вайны жанчына была настаўніцай.

(Працяг на стар. 12)

ЧАСАПІС

"Мастацтва праз стагоддзі"

Такі дэвіз вячэрняй школы-семінара па жывапісе, музыцы, скульптуры, архітэктуры ўсіх часоў і народаў, якая прадаўжае заняткі (другая і чацвёртая серада кожнага месяца, пачатак а 18 гадзіне) у мінскім Палацы культуры прафсаюзаў.

Заняткі ў школе-семінары даюць унікальную магчымасць набыццё грунтоўных ведаў на ўзроўні праграмы ВНУ спалучаць з эстэтычным задавальненнем і культурным адпачынкам. Практыкуюцца рэгулярныя сустрэчы з віднымі дзеячамі мастацтва. За многія гады работы выпрацаваны ўстойлівыя традыцыі і сфарміравана атмасфера творчай садружнасці слухачоў і выпускнікоў школы.

Выпускнікі школы атрымаюць дыплом мастацтвазнаўцаў-аматараў.

Абанементы прадаюцца ў пакоі 205 Палаца (тэл. 27-59-29). Кошт разавага білета — 10 тыс. руб.

Хто ёсць хто

У Аддзеле навуковай інфармацыі па гуманітарных навуках Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі выйшаў тэматычны зборнік "Гуманитарии и обществоведы Национальной академии наук Беларуси". Гэта — першы такі зборнік пра вучоных гуманітарыяў і грамадазнаўцаў НАН Беларусі.

На яго старонках не толькі бібліяграфічныя дадзеныя, але і падрабязная інфармацыя аб навуковай дзейнасці і творчых здабытках 16 акадэмікаў, 25 членаў-карэспандэнтаў, 76 дактароў навук, а таксама звесткі пра 210 кандыдатаў навук, якія працуюць у сістэме Аддзялення гуманітарных навук НАН Беларусі.

Прыемна адзначыць, што ў іх ліку народныя пісьменнікі Беларусі, акадэмікі НАН Беларусі Іван Навуменка, Іван Шамякін, ганаровы акадэмік НАН Беларусі Янка Брыль. Пісьменнікі-акадэмікі НАН Беларусі: Васіль Івашын, Віктар Каваленка, Міхась Лазарук; члены-карэспандэнты Уладзімір Гніламёдаў, Алег Лойка, Міхась Мушынскі, Леанід Яўменаў; пісьменнікі, дактары філалагічных навук Мікалай Арочка, Васіль Жураўлёў, Генадзь Кісялёў, Арсен Ліс, Алесь Яскевіч; кандыдаты філалагічных навук: Ірына Багдановіч, Уладзімір Казбярук, Сцяпан Лаўшук, Міхась Тычына, Вячаслаў Чамярыцкі, кандыдат гістарычных навук Кастусь Цвірка.

В.ВІЛЬТОЎСКІ

З днём нараджэння, "Книжный мир"!

"З'яўленнем на свет выдання — газеты ці часопіса — сёння нікога не здзівіш. Нават калі яно вельмі арыгінальнае, цікава і прыгожа афармленае. Мэты і задачы ў кожнага друкаванага органа свае, як правіла, чыста прафесійныя, накіраваныя на глыбокае асвятленне праблем той ці іншай галіны, або камерцыйных. Газета ж "Книжный мир" у гэтых адносінах — неардынарная. Яна разлічана на тое, каб аб'яднаць усе грамадскія сілы, адпаведныя дзяржаўныя ўстановы, выдаўцоў, паліграфістаў, кнігараспаўсюджвальнікаў і рэкламістаў, не даць ім замкнуцца ў рамках сваіх ведамасных інтарэсаў, а дбаць пра агульную справу: знаходзіць магчымасці, нават у складаных эканамічных умовах, прыдаць індустрыі кнігавыдання Рэспублікі Беларусь новы якасны накірунак," — так гаворыць у артыкуле "Непарыўная сувязь вякоў", прадстаўляючы новую газету "Книжный мир", намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь па друку, прэзідэнт Беларускай асацыяцыі кнігавыдаўцоў і кнігараспаўсюджвальнікаў Станіслаў Нічыпаровіч. А заснавальнікам гэтай газеты, першы нумар якой нядаўна з'явіўся ў кіёсках, і з'яўляюцца Беларуская асацыяцыя кнігавыдаўцоў і кнігараспаўсюджвальнікаў сумесна з ТАА "Завігар" (апошняе выступае ў якасці выдаўца).

Як вядома, адна "кніжная" газета ў нашай дзяржаве ўжо ёсць — гэта "Кніга і мы". Тым больш прыемна, што з'явілася новае выданне. А, як відаць з першага нумара, "Книжный мир" імкнецца ісці сваёй дарогай. У газеце расказваецца пра кнігі, якія не толькі выйшлі, а і яшчэ рыхтуюцца да выхаду ў выдавецтвах краіны, рэкламуюцца розныя выдавецкія і паліграфічныя паслугі. Тут жа можна пазнаёміцца з актуальнымі развагамі аб перспектывах кнігавыдання. А Анатоль Сульянаў пад рубрыкай "Нататкі пісьменніка" дзеліцца меркаваннямі наконт таго, "хто ён, герой сучаснай літаратуры?".

ТЭАТР

Колер Баніёніса, або Чалавек раскрывае чалавека

"Толькі не пытайцеся пра мой гараскоп, пра шлях у артысты і як я разумею шчасце", — мовіў Данатас БАНІЁНІС, пагадзіўшыся адказаць на колькі пытанняў. Калегі-журналісты, скарыстаўшы ягоны прыезд у Мінск (работа ў першым беларускім тэлесерыяле "Пракляты ўтульны дом"), атакавалі акцёра... з пераменным поспехам; мне давялося апраўдвацца:

— Разумею, Данатас Ёзавіч, што самае ідыёцкае пытанне, якое прапануюць акцёру, — маўляў, што вы больш любіце, тэатр або кіно...

— Ну, пачатковец, думаю, зробіць выбар! А калі за спінай пяцьдзесят з гакам фільмаў, больш за сто вялікіх тэатральных роляў, дык... выбар залежыць ад якасці створанага. Ад якасці, ад узроўню дачыненняў. Калі я сустракаўся й працаваў з Таркоўскім, з Козінцавым, я мусіў ацаніць вартасці кіно. Дзесяць фільмаў лічу лепшымі, астатнія так-сама далі сёе-тое, перадусім грошы на жыццё. Чытаю сцэнарый — усё, здаецца, спраўдзіцца выдатна, аж не! Ад рэжысёра залежыць усё, ад рэжысёра, нават не ад сцэнарыя, бо трымаў ды чытаў выбітныя, а здымалі паводле іх глупства, пасрэднасць. Балазе, было па-рознаму.

— Патрабаванні на пляцоўцы ў Козінцава, у Таркоўскага, у Жалакявічуса — асаблівыя? Яны вам прапаноўвалі нешта вызначанае, вымагалі строга падначаліцца або давалі магчымасць імправізаваць, вырашаць па-свойму?

— Мне здаецца, што калі акцёру даць шмат волі і магчымасць канчаткова вырашаць твор, нічога вартага не будзе. Калі ж рэжысёр настойвае, вымагае, тлумачыць задачы не ўвогуле, не прыблізна, а пэўна, дакладна, калі хочаце, выпакутавана, тады і будзе плён. Асабліва на пляцоўцы, хоць і на сцэне таксама. Калі рэжысёр вызначальна не ведае пра што ды як, дык па ходзе справы, дайце веры, нічога само не вырашыцца. Усё разбурыцца. Бывала, рэжысёр мяне падпарадкаваў, проста змушаў да нечага, і я ў выніку... выйграваў! Бо выйграваў фільм. Былі і такія фільмы, як "Мёртвы сезон" — мы вельмі адыходзілі ад сцэнарыя і фільм закрывалі, мяне здымалі з ролі, але мы з рэжысёрам трымаліся разам, да канца. Жалакявічусу, напрыклад, ніколі нічога не варта навязваць. Ён і ўхваліць, але скажа, што для ягонага фільма гэта не падыходзіць. І — падпарадкуе. І — будзе поспех! Часцей за ўсё ён нязмушана падбухторвае зрабіць так, як яму трэба... нібыта гэта сам акцёр так хоча або да такога дадумаўся.

— Вы працуеце і заўжды працавалі ў знакамітым Тэатры Мільцініса, але ж ваш Паневежыс слаўны тым, што мае некалькі тэатраў. Такі маленькі горад...

— Калі іх усе з адказнасцю можна назваць тэатрамі, тады — мае. Ведаеце, лепш быў бы адзін, а не пяць, не дзесяць, але ўзроўню... Мільцініса. Колькасць — няблага, але колькасць нічога не дае.

— Колькі гадоў таму я брала інтэрв'ю ў аднаго з вашых вядучых крытыкаў Вальдаса Васіляўскаса, — якраз падчас нашумелых маскоўскіх гастроляў Вільнюскага маладзёжнага тэатра. Маскоўская публіка так прагнула трапіць на спектаклі Някрошуса, што знесла дзверы ў тэатры; Даля Тамулявічутэ, як кіраўнік гасцей, мусіла нават прабачацца перад гаспадарамі. Васіляўскас сфармуляваў адметна, чаму, маўляў, людзі не рвуцца на літоўскае кіно? Літоўскаму тэатру яно — няроўня. Штонебудзь змянілася ў літоўскім кіно за восем гадоў ад таго інтэрв'ю?

— Я не крытык, я не скажу. Здымаюся няшмат. І ў Літве цяпер здымаюць няшмат, і ў Расіі. Цяпер я заняты ў Булата Мансурава. Серыял пра дзевятае-дзесятае стагоддзе з княгіняй Вольгай, князьмі Уладзімірам, Святаславам... Усё Русь хрысцяць. Я там іграю шведа.

— Колісь нашы балтыйскія акцёры скардзіліся, што на іхнюю долю выпадаюць адны немцы, шведы, аўстрыякі, заходнія заваёўнікі, шпегі, дыпламаты...

— Я іграў усіх і больш за тое. У кіно — "Уцёкі містэра Мак-Кінлі", "Мёртвы сезон", "Прыгоды прынца Фларызеля", але ніколі не меў вузкага амплуа. Мяне займалі ад камедый да трагедый.

— А ў тэатры вы заняты шчыльна?

— З алебардай стаяць ды абвяшчаць "кушать подано" даўно не прапануюць, узрост не той, фактура, характар. Калі ўжо выходзіць на сцэну, дык заставацца на ёй увесь вечар. Таму ролі вялікія. У "Метэоры" Дзюрэнмата, у "Коле" Моэма, "Ля залатога возера" Нормана, — восем буйных роляў, бо інакш працаваць цяпер мне не мае сэнсу. Са мной хацеў рабіць спектакль ваш Мікалай Пінігін — "Касцюмера" Рональда Харвуда, але надарылася неспадзеўка, непаразуменне. Мікалай дамаўляўся не асабіста са мной, а з нашым тагачасным кіраўніком, прывёз цудоўны макет мастака Марголіна, меў цікавую ідэю пастаноўкі... Але я быў дужа заняты выпускам іншага спектакля! Ну, уявіце, з ролі Нормана ("Ля Залатога возера") пераскочыць адразу на ролю сэра Джона ў "Касцюмеры"! На ролю сэра Джона, якая вымагае хоць бы засяродзіцца, аднавіцца (у тым ліку і фізічна). Бянтэжыла мяне і тое, што Адамайціс выступаў у гэтай самай ролі ў Вільнюскім акадэмічным тэатры. Так што зманлівая прапанова Пінігіна была трохі не да часу; Пінігіну я сам прапанаваў спачатку ўзяць іншага акцёра, але на іншага ён не пагадзіўся. Ішла гаворка і пра адтэрміноўку, скажам, на год, але — ну не спраўдзілася... не з-за мастацкіх разыходжанняў (а я патрабавальны), не!



— Цяпер у тэатры новы дырэктар...

— Рымас Тэрэсас. Я сам прымаў яго ў тэатр (акцёрам) у 1984 годзе як кіраўнік тэатра. Трупа абрала яго дырэктарам і ён парадак навёў, вярнуў у тэатр гледача. Наш былы мастацкі кіраўнік вельмі дзіўна разумеў эстэтыку: акцёр для яго быў нікім...

— Марыянеткай?

— Во-во! Я адмовіўся з ім працаваць. Ён, бачыце, пачынаў рэпетыцыю з таго, што нагадваў, маўляў, нічога індывідуальнага ў акцёра не павінна быць, менш адметнасці, я, маўляў, ствараю візуальны твор, мне рупіць тэатр будучыні... А як на маю думку, дык будучыня — якраз акцёрскі тэатр!

— А Ёзас Мільцініс? Кажуць, што ён ставіўся да тэатра, як да рэлігіі, строга; панавала не толькі любоў да сцэны, да мастацтва, але і адметная дысцыпліна, падпарадкаванасць нават у дробязях...

— Мільцініс... Гэта можна назваць і рэлігіяй, і фанатызмам, — ён быў настолькі ў мастацтве, што для яго тэатр быў рэальней за жыццё. Ён, кажучы па шчырасці, з'ехаў у Парыж, пасварыўшыся з калегамі з Шаўляй (дзе тады працаваў). Ён мэтанакіраваны, моцнай волі, ён здолеў трапіць вучыцца да Шарля Дзюлена! Яны з Дзюленам былі добрымі сябрамі, я пераканаўся ў гэтым асабіста, калі Баро, Вілар, Мадлен Рэно (сакурснікі ды калегі Мільцініса) наведвалі Расію. Так што гэта не легенды, а праўда жыцця. Заўважце, Мільцініс, вярнуўшыся з Парыжа, не лез у чужы, іншы, чыйсьці тэатр. Ён пэўна ведаў, чаго хацеў, ён здужаў ства-

рыць свой тэатр! (А выпадкаў, калі хтосьці прыходзіў на створанае ды пачынаў перарабляць на свой капыл, літоўскі тэатр зведаў багата). Мільцініс не прыняў да сябе ніводнага акцёра або рэжысёра з іншага тэатра, — як гэта назваць? Мільцініс быў выключным чалавекам і тэатр стварaў як сябе — выключны.

— А цяпер? Легенды і праўда жыцця падтрымліваюць тэатр?

— Ну... Наш тэатр і зачынялі, і прыпынялі дзейнасць; Мільцініса звальнялі (ён пяць гадоў не працаваў), усім хапіла мітрэнгаў, крыўдаў, роспачы, — у 1954 з-за таго, што Мільцініс касмапаліт і буржуазнага мыслення! Так казалі, так пісалі, так вінавацілі. Вы не ведаеце, але аж да смерці Сталіна ў нас не было ніводнай партарганізацыі ў тэатрах. З цяжкасцю змушалі сабрацца па тройцы тэатральных камуністаў, каб утварыць пярвічную арганізацыю. Для Мільцініса тэатр быў усім. Вышэй за палітыку, за выжыванне. У яго не было сям'і, — хіба мы. Ён прымаў да сябе толькі тых, хто яшчэ нідзе не іграў, нідзе не вучыўся. Я прыйшоў з рамеснай школы, як, дарэчы, некаторыя мае калегі. Але тэатральнай студыі, як такой, мы ў яго не канчалі, бо вучыліся, пакуль быў жывы Мільцініс, увесь час...

— А на здымкі ён адпускаў спакойна?

— Па-рознаму. Не сказаць, каб ахвоча. Але дамаўляліся, прасілі, каб ён сам паўдзельнічаў у здымках. Я сам прасіў яго пра гэта, хацеў, каб Мільцініс убачыў, як робіцца кінастужка, як я працую на здымачнай пляцоўцы, каб параіў... Ён удзельнічаў, напрыклад, у "Мёртвым сезоне" (і яшчэ сям-там), ён сам здымаўся, але не быў задаволены й здаволены кіно. Хоць кіно, як мастацтва, ніколі не адмаўляў. Высока цаніў Таркоўскага. Мы яму таемна паказалі забароненага "Рублёва", — каб адпусціў мяне на здымкі "Салярыса".

— Таемна?

— А вы думаеце! За такі паказ маглі пакараць. Вялікае, высокае кіно Мільцініс цаніў як прыклад адметнай акцёрскай ігры, звяртаў нашу ўвагу на яе асаблівасці, прасіў паглядзець тое і тое. Для мяне былі ўзорамі Жан Габэн, Марлон Брандо, Гэкман, Дасцін Хофман. І рускія, вядома, адзін Лебедзеў чаго варты!

— А з тэатральных рэжысёраў каго вы любіце, каму аддаяце перавагу? У вас жа, пэўна, ёсць права запрашаць кагосьці да сябе на пастаноўку?

— Ёсць права. Але такіх рэжысёраў у Літве цяпер няма. Які там рэжысёр можа быць пасля Мільцініса? Не!

— Нават Някрошус?

— Крый Божа, да яго не пайшоў бы. Ды ён бы мяне і не запрасіў, бо я не буду іграць, як ён хоча.

— А Оскарас Каршуновас? Ён адметна паставіў Хармса.

— Ведаеце, мы, старыя акцёры, людзі дзіўныя, спецыфічныя. Мне сябры кажуць, — не хадзі, мы цябе ведаем, ты ўцячэш з паловы спектакля, а ўцякаць жа будзе сорамна. Мы робім, што можам, як разумеем, але — сваё. Мы існуём, жывём побач, мы не супярэчым новаму, найноўшаму, моднаму, але аддаём перавагу свайму. Ну няможна ж сказаць, што зялёны колер добры, а чырвоны — благі. А я люблю свой колер, і свой колер любіць іншы.

— А вы маглі б вызначыць свой колер?

— Чалавек! Складаная індывідуальнасць, асоба раскрывае на сцэне глыбіню чалавечую. Чалавек раскрывае чалавека. Я не люблю на сцэне ні метафар, ні сімвалаў. Чалавек на сцэне, калі ён асоба, перадасць гледачу нязведанае пра чалавека, ягоныя глыбіні, вяршыні — дачыненні, стаўленне да жыцця, сям'і, людзей. Вывучэнне чалавека з сярэдзіны, а не звонку, — гэта не даецца, перапрашаю, звычайным спусканнем штаноў на сцэне, маўляў, благі персанаж! Вы пачытайце водгукі канадцаў на літоўскіх "Трох сясцёр". Чыталі? Разумееце мяне?

— Для мяне Някрошус раздвоіўся. На аўтара "Квадрата", "Пірасмані...", "Дзядзькі Вані" і — нібы іншы чалавек ставіў "Маленькія трагедыі", Чэхава...

— Вы мяне разумееце! Трукі, фокусы, вонкавая значнасць, дымавая заслона на сцэне — гэта не мой стыль, не той тэатр, які апавядаў Мільцініс. Калі хочаш вывучыць прыроду чалавечую, не прамінеш ні старажытных, ні Фрэйда, ні Фрома, ні Дастаеўскага, але ж усе яны толькі спрабавалі яе вывучыць, толькі падступаліся. А чалавека ведае хіба Спадар Бог... Мо акцёр дзесьці пасярэдзіне?..

З Данатасам БАНІЁНІСАМ гутарыла Жана ЛАШКЕВІЧ

Фота Віктара ЖЫЛІНА

ПАМЯЦЬ

Подзвіг жыцця і творчасці

Беларуская культура звязана з дзейнасцю мужных, паслядоўных, таленавітых яе дзеячаў-рупліўцаў, што і ў мінулым і ў нашым стагоддзі неслі і нясуць на сваіх плячах цяжар творчага абавязку перад нацыяй, перад яе гісторыяй і будучыняй. Рэдка калі хто з іх пры жыцці атрымоўвае належнае прызнанне, сапраўдную пашану сучаснікаў, як гэта павінна быць згодна з іх значнасцю, але такі ўжо гістарычны лёс нашай беларускай культуры і яе слаўных дзеячаў.

4 верасня перастала біцца сэрца вялікага збіральніка народнага мастацтва, мастака, мастацтвазнаўцы, этнографа, этнолага, педагога Міхася Хведаравіча Раманюка (1944—1997). Усё сваё нядоўгае жыццё ён прысвяціў ратаванню адыходзячай у нябыт каштоўнейшай нацыянальнай спадчыны, звязанай з традыцыйным касцюмам і іншымі відамі народнага мастацтва.

Не было той сцежкі на Радзіме, што вяла да адкрыццяў скарбаў мінуўшчыны, куды не ступала яго нага. Экспедыцыі па зборы палявога матэрыялу напаўняві яго дзейнасць і ў летні і ў зімовы час, у сонца і непагадзь ён з фотакамерай, з нататнікам крочыў ад вёскі да вёскі і паспяваў знайсці апошніх носьбітаў старадаўніх традыцый, каб зафіксаваць, атрымаць ад іх каштоўную інфармацыю. Вынік гэтага — яго альбом "Беларускае народнае адзенне" (1991 г.), які стаў эпахальнай падзеяй у гісторыі еўрапейскай этнаграфіі. Яму ўдалося ўзвесці гэткім чынам помнік народным традыцыям, перакананаць свет у тых каштоўнасцях, якія мае наша спадчына, абвясціць пра існаванне, самабытнасць і неўміручасць нашага беларускага этнасу. А далей — год за годам працягваўся апантаны творчы шлях і шырыліся публікацыі, энцыклапедычныя выданні, сенсацыйныя адкрыцці спадчыны. Па шырыні і маштабнасці даследаванняў Міхась Раманюк не меў сабе роўных, выконваючы ўласнаручна тое, што мог бы ўзяць на сябе вялікі калектыў навукоўцаў. Яму была дадзена надзвычайная энергія і прага дзейнасці, якую ён не змарнаваў. Апроч збіральніцкай дзейнасці, Міхась Хведаравіч вялікую ўвагу прысвячаў выхаванню, падтрымцы новых імёнаў у беларускім мастацтве. Кола яго сяброў-аднадумцаў множылася. Ён быў выдатным калегам, сябрам, настаўнікам і лідэрам творчага руху за Адраджэнне ў адной асобе. Шмат можна сказаць пра Міхася Раманюка як настаўніка. Скончыўшы Беларускую акадэмію мастацтваў, ён да канца сваіх дзён працаваў на кафедры гісторыі і тэорыі мастацтваў, стаўшы неўзабаве яе кіраўніком, прафесарам, згуртаваўшы вакол сябе маладых і старэйшых калег. Фіналам яго шматграннай дзейнасці стала падрыхтоўка фенаменальнай інфармацыі пра касцюм беларусаў усіх рэгіёнаў нашага этнічнага арэалу ў форме дакладнейшых мастацкіх рэканструкцый пры дапамозе пэндзля і фарбаў. Ён уваскрэсіў тое, што ўжо немагчыма было ўбачыць у натуры, абагульніў свой даследчыцкі і мастацкі вопыт. Нездарма такі велізарны поспех мела яго выстава рэканструкцый на пачатку 1996 года ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь, пасля чаго яго праца пачала выпускацца філатэлічнымі сродкамі, несучы гэты вобраз Беларусі па ўсім свеце. У канцы 1996 года Міхась Раманюк атрымаў ганаровае званне Чалавека года — аб'ектыўная адзнака яго працы, што дала яму светлы настрой у цяжкі час змагання з хваробай.

Слаўны сын нашай зямлі спачыў вечным сном на вясковых могілках у Старынках, што пад Дзяржынскам, дзе прайшло яго дзяцінства, адкуль ён рушыў у вялікі свет.

Разам з пахаваннем Міхася Хведаравіча Раманюка завяршылася вялікая эпоха руплівага збірання, прапаганды, замацавання ў свядомасці нацыянальных каштоўнасцей, выхавання новага пакалення творчай інтэлігенцыі, якой даражэй за ўсё найменне Радзімы і яе незалежнае квітненне, прагрэс у еўрапейскім свеце. Адышоў у вечнасць адзін з апошніх вялікіх еўрапейскіх даследчыкаў народных традыцый, пакінуўшы пасля сябе неацэнны скарб здзейсненага і ўдзячную памяць тых, што працавалі, тварылі разам і марылі пра новыя больш шчаслівыя для культуры часы на нашай зямлі.

Бывайце, наш дарагі Міхась Хведаравіч, дружа, калега, настаўнік! Хай вечная памяць пра Вас будзе звязана з развіццём і пашырэннем той справы, якую не стомяцца весці аднадумцы на славу і гонар нашае Беларусі!

Калектыў кафедры гісторыі і тэорыі мастацтваў Беларускай Акадэміі мастацтваў

Мы яго не забудзем...

Гэта было недзе з год назад. Ён ужо даўно пакутаваў, і ўрачы не сталі хаваць ад яго праўды. Яму наўпрост сказалі: "Максімум — пяць гадоў". Ён успрыняў гэта мужна і спакойна. Нават радасна. Так і гаварыў сябрам: "За пяць гадоў я столькі паспею зрабіць!" Не паспеў... Міхась Хведаравіч Раманюк памёр 4 верасня.

Блізкая смерць прымушае цаніць кожнае імгненне жыцця. Апошні год ён працаваў надзвычай плённа. А калі з трагічнай яснасцю ўсвядоміў, што жыцця засталося некалькі месяцаў, папрасіў сына звазіць яго на родную Койданаўшчыну, каб развітацца з роднымі і сваякамі. Там, у вёсцы Старынка, на старых кладах ён паказаў месца, на якім хацеў бы быць пахаваным. Потым развітаўся з мінскімі сябрамі — з кім пры сустрэчы, з кім па тэлефоне. Ён не гаварыў "адкрытым тэкстам", але і так было зразумела: чалавек развітваецца. Паніхіда ў Палацы мастацтваў сабрала шмат людзей. Сябры, калегі, вучні. Пры жыцці, як кожная актыўная асоба, ён камусьці замінаў, камусьці муліў вока, у кагосьці выклікаў зайздрасць — а вось памёр, і яго не хапае. Не хапае сябрам, калегам, вучням, краіне.

З Мінска труну павезлі ў Старынку. Жалобная працэсія ішла па вясковай вуліцы. Аркестра не было. Адзінае, што парушала цішыню, гэта вецер у кронах дрэваў. Сустрэчныя машыны спыняліся, чакалі, пакуль пройдзе працэсія, і толькі потым рухаліся з месца. Хавалі Міхася Хведаравіча па праваслаўным абрадзе.

Так сталася, што кніга, над якой ён працаваў у апошнія месяцы жыцця (яна падрыхтавана да друку) мае назву "Крыжы Беларусі". Яна прысвечана надмагільным крыжам і крыжам, што калісь ставілі на ростанях. Ды і апошні артыкул (для Энцыклапедыі) быў пра пахавальны абрад.

Дзейсненае Міхасём Раманюком яшчэ доўга будзе асэнсоўвацца. Ён нагадвае мне рупліўцаў Адраджэння 20-х гадоў. Іх было няшмат, але па інтэлекце і працаздольнасці кожны быў варты цэлага навукова-даследчыцкага інстытута. Міхась Хведаравіч з гэтай кагорты. Мы будзем яго памятаць. Мы жывём — значыць, і ён жыве.

П. ВАСІЛЕЎСКІ

Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь глыбока смуткуе з выпадку заўчаснай смерці прафесара, загадчыка кафедры гісторыі і тэорыі мастацтваў Беларускай акадэміі мастацтваў РАМАНЮКА Міхаіла Фёдаравіча і выказвае спачуванне родным і блізкім памёршага.

Сябры творчай суполкі "Пагоня" смуткуюць з нагоды смерці Міхася Хведаравіча РАМАНЮКА, рупліўца Адраджэння, выдатнага навукоўцы, і выказваюць спачуванне родным і блізкім нябожчыка.

ВЫСТАВЫ

Боль і скруха трыццатых

Калі згадваюцца трыццатыя гады і заходзіць гаворка пра ахвяры сталінізму, звычайна называюцца прозвішчы дзесяткаў рэпрэсіраваных пісьменнікаў. Але механізм знішчэння дзейнічаў і ў дачыненні да іншых прадстаўнікоў творчай інтэлігенцыі. Не выключэнне — і беларускія археолагі. У 1937 годзе найбольш вядомыя з іх таксама былі аб'яўлены "ворагамі народа". Абвінавачванне было традыцыйнае — нацыяналізм, шкодніцкая дзейнасць і г. д. У выніку на свабодзе застаўся толькі адзін К. Палікарповіч, а астатнія...

Пра лёс іх можна даведацца, наведаўшы музей гісторыі і культуры Беларусі. Там разгорнута выстава, прысвечаная выдатным прадстаўнікам беларускай археалагічнай навукі, якія развіваліся з жыццём у самым росквіце сіл.

Адзін з іх — Сяргей Дубінскі. З 1925 года быў членам гісторыка-археалагічнай камісіі, а з 1928-га — навуковым супрацоўнікам Інстытута беларускай культуры. З 1931 года Дубінскі працаваў у Інстытуце гісторыі Акадэміі навук, з 1933-га — у Акадэміі гісторыі матэрыяльнай культуры, што знаходзілася ў Ленінградзе. Дубінскі ў асноўным даследаваў помнікі ранняга жалезнага веку і эпохі сярэднявечча. У 1927 годзе склаў археалагічную карту Магілёўскай вобласці, але яна, на жаль, не захавалася. Склаў і выдаў "Бібліяграфію па археалогіі Беларусі і сумежных краін".

У 20—30-ыя гады добра было вядома імя і археолага Аляксандра Кавалені, які з 1932 года працаваў навуковым супрацоўнікам Інстытута гісторыі. Каваленя займаўся даследаваннем стаянак чалавека эпохі палеаліту, якія знайшоў у Бердыжы і Юравічах, вывучаў таксама стаянку эпохі жалезнага веку (Банцараўшчына), а таксама помнікі розных эпох, што захаваліся на Тураўшчыне. Яшчэ ў 1927 годзе праводзіў раскопкі на гарадзішчы ў Тураве.

Аляксандр Ляўданскі працаваў вучоным сакратаром, а потым загадчыкам секцыі археалогіі Інстытута гісторыі, адначасова з'яўляўся дацэнтам Беларускага дзяржаўнага універсітэта, арганізатар першых у БССР навуковых археалагічных экспедыцый. Менавіта ён першым выказаў думку, што гарадзішчы культуры штрыхавай керамікі ў цэнтры Беларусі належалі балцкім плямёнам. Ляўданскі вывучаў Полацкі Сафійскі сабор, Бельчыцкія храмы, даследаваў курганы ў Мінскай, Полацкай і Аршанскай акругах.

Усе трое былі рэпрэсіраваны і расстраляны ў адзін дзень — 27 жніўня 1938 года. А справядлівасць перамагла толькі праз два дзесяткі гадоў: Дубінскі быў рэабілітаваны ў 1956 годзе, Каваленя і Ляўданскі — у 1958-м. Пакручастым быў лёс і ў іншых беларускіх археолагаў, якім, праўда, удалося выжыць. Адзін з іх, Мікалай Улашчык, змог пасля перажытага займацца навуковай дзейнасцю яшчэ не адзін дзесятак гадоў.

Згаданая выстава — свайго роду рэквіем, і прымеркавана яна найперш да 40-годдзя гэтай страшнай трагедыі. У экспазіцыі не толькі матэрыялы пра археолагаў, а і шматлікія экспанаты, сабраныя імі — тое, што было знойдзена пры раскопках курганных могільнікаў, у час іншых палявых экспедыцый. Асобныя экспанаты, перш чым трапіць на выстаўку, таксама прайшлі няпросты шлях. Справа ў тым, што ў гады Вялікай Айчыннай вайны яны былі вывезены фашысцкімі захопнікамі ў Германію і толькі праз шмат гадоў вярнуліся на Радзіму. Напамінкам пра гэта — надпісы, зробленыя на іх панямецку.

Н. К.

ЛіМ ЧАСАПІС

На ніве роднага слова

МІХАСЮ ШАВЫРКІНУ — 50



Часопіс "Роднае слова", якому ў студзені 1998 года споўніцца 10 гадоў, добра вядомы ў нашай краіне. Асабліва ў асяродку выкладчыкаў роднай мовы і літаратуры, студэнтаў. У наш неспрыяльны для нацыянальнай культуры час часопіс робіць усё магчымае, каб ягоныя чытачы адчулі сваю прыналежнасць да роднай зямлі, асэнсавалі ўзаемасувязь асабістага лёсу і лёсу сваёй краіны, яе культуры. Часопіс карыстаецца немалым поспехам. Пра гэта сведчыць і ягоны тыраж, якому могуць пазайздросціць і іншыя газеты. Ён рэдка апускаецца ніжэй за 10 тыс. асобнікаў.

Усе гэтыя 10 гадоў кіруе часопісам Міхась Шавыркін, які быў як аўтарам ідэі выдання, так і яе паслядоўным і настойлівым увасабляльнікам. Ідэя, якая цалкам вахапіла гэтага чалавека, — паспрыяць нашай педагагічнай інтэлігенцыі ў справе выхавання гарманічна развітой, нацыянальна свядомай асобы, здольнай успрымаць сябе творчай адзінкай як у сваім грамадстве, так і ў Сусвеце. Трэба сказаць, што ідэю гэтую, у якую ён уклаў шмат сваіх сэрца і душы, М. Шавыркін і сёння ўвасабляе вельмі імпэтна, з уласцівым яму маладым запалам.

А ўвогуле на ніве роднага слова М. Шавыркін шчыруе ўжо не адно дзесяцігоддзе. На ягоным рахунку плённая праца ў Галоўнай рэдакцыі Беларускай Савецкай Энцыклапедыі, часопісе "Народная асвета". Міхась Шавыркін — чалавек глыбокіх энцыклапедычных ведаў і высокага прафесіяналізму і... заўзяты аматар беларускай песні. Усё гэта, дарэчы, знаходзіць добрае ўвасабленне не толькі ў часопісе "Роднае слова". Рубрыку "Анталогія беларускай песні", якую ён вядзе на старонках газеты "Звязда", даўно заўважылі і шчыра палюбілі чытачы.

15 верасня Міхасю Шавыркіну споўніцца 50 гадоў. Спадзяёмся, што плённая праца гэтага цікавага і творча адоранага чалавека з душою юнака падорыць нам яшчэ нямала сустрэч з неадкрытымі дасюль таямніцамі роднага слова і любімымі беларускімі песнямі.

Гісторыя блізкая і далёкая

Чарговая кніга "Школьнай бібліятэкі", якая пабачыла свет у выдавецтве "Юнацтва", аб'яднала пад адной вокладкай творы двух пісьменнікаў.

Першым прадстаўлены Платон Галавач з яго "Спалохам на загонах". Як вядома, у гэтым творы пісьменнік праўдзіва адлюстроўвае складаныя працэсы, што адбываліся на вёсцы пасля рэвалюцыі. Да гонару П. Галавача, ён змог падысці да гэтых падзей даволі аб'ектыўна, што з'яўляецца сведчаннем яго таленту і чалавечай сумленнасці.

Школьнікі атрымалі магчымасць пазнаёміцца ў гэтай кнізе і з двума творамі Барыса Мікуліча. У рамане "Адвечнае" асэнсоўваюцца падзеі 1812 года, а аповесць "Развітанне" — расказ пра тое, як Максім Багдановіч пасля доўгай разлукі завітаў на Бацькаўшчыну.

ПАМЯЦЬ

Смілавіцкі Астроўскі

ДА 60-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ ЭДУАРДА ЯРАШЭВІЧА

Мала знойдзецца людзей з такім шматпакутным і разам з тым гераічным лёсам, як у Эдуарда Ярашэвіча. Дзяцінства яго азмрочыла вайна. Сям'я засталася без бацькі, які пайшоў на фронт, а ў 1944 годзе хлопчык разам з усёй сям'ёй трапіў у Азарыцкі лагер смерці. Савецкая армія выратавала тых, хто застаўся жывым. Пасля вайны сям'я пераехала ў мястэчка Смілавічы, дзе будучы пісьменнік і скончыў сярэднюю школу.

Быў апошні школьны званок, развітальны вальс, а назаўтра.. Цяжкая хвароба зваліла з ног, поліямізліт, параліч ног.

Ішоў год за годам. Становішча не паляпшалася. Памерла маці. Паралізаваны юнак працаваць не мог. А пенсіі дзяржава яму дала аж дзесяць (!) рублёў у месяц. Як жыць? Знаход зяцца такія, хто, сутыкнуўшыся са значна меншымі цяжкасцямі, канчаюць з жыццём. Але пакуты (ён не мог нават павярнуцца на бок без дапамогі) не зламалі стойкасці юнака.

Як маглі, дапамагалі яму суседзі, знаёмыя, сябры. Ім, неабыякавым да чужога гора, быў Эдуард удзячны ўсё сваё жыццё. Па некалькі гадзін у дзень, змяняючы адзін аднаго па рэкамендацыі ўрачоў, рабілі мы Эдзіку масаж ног, згіналі іх і разгіналі, спадзеючыся, што гэта дапаможа паставіць яго на ногі. Але нічога не дапамагала: ні масажы, ні лекі.

Трэба было жыць, не чакаючы з мора пагоды. А як? І ён пачаў пісаць. Паспрабаваў паступіць у Літаратурны інстытут імя Горкага ў Маскве. Калі прыйшоў адказ, што завочнага факультэта няма, папрасіў прыслаць спіс літаратуры, па якой займаліся будучыя літаратары. Гэтую літаратуру, якую недзе дастаў і прывёз яму сябар Саша Халадзінскі, ён старанна праштудзіраваў. Увогуле, Эдзік Ярашэвіч быў чалавекам таленавітым: ён нядрэнна маляваў, іграў на баяне, акардэоне, гітары, добра гуляў у шахматы, шашкі. У карты ён таксама быў непераўзыдзены "баец". Эдуард нам дарагі не проста, як пісьменнік, а ў першую чаргу як Чалавек. Эдзік быў не толькі вельмі працавіты, разумны, эрудзіраваны чалавек. Ён быў выдатным субяседнікам, чалавекам рэдкай душэўнай прыгажосці, мужным і жыццярадасным.

Маленькая яго хатка была клубам, любімым месцам смілавіцкай моладзі, ды і не толькі моладзі. Ён умеў сябраваць з малым і старым, з сівабародым дзедам і юнай дзяўчынай. Ён быў душой Смілавіч. Да Эдзіка ішлі і з радасцю, і з горам. З першымі ён дзяліў радасць, а другім стараўся дапамагчы. Па просьбе людзей ён пісаў у розныя газеты, партыйныя і дзяржаўныя інстанцыі.

Мы любілі збірацца ў Эдзіка на святы, асабліва на дні яго нараджэння. У яго хаце было радасна, весела і вельмі цікава: чыталі вершы, пелі, танцавалі, гулялі ў шахматы, шашкі, карты. Гаспадар умеў рабіць так, каб ніхто не адчуваў, што ён прыкаваны да ложка. Спяваў разам з намі, акампаніраваў на гітары, а іншы раз, калі мы весяліліся, мог і пісаць, занатоўваючы свае думкі.

Тыя, з кім сутыкаўся Э. Ярашэвіч, станавіліся прататыпамі герояў яго твораў. А публікавацца Эдуард пачаў у 1954 годзе ў Чэрвеньскай раённай газеце, а з 1956 года — у рэспубліканскім друку. Першае яго апавяданне "Хто круціць, той і мае" было надрукавана ў 1956 годзе ў "Вожыку". Добры дэбют прыдаў сілы і акрыліў. У "Чырвонай змене" і часопісе "Беларусь" адно за другім выходзяць яго гумарэскі і апавяданні.

З цягам часу, калі прыйшоў літаратурны вопыт, узяўся за больш буйныя творы. У 1967 годзе выйшла аповесць "Сцены свайго дома". У сваіх творах пісьменнік паказваў сучаснікаў, якім верыў, якіх любіў усёй душой. Галоўнымі героямі станавіліся юнакі і дзяўчаты — аповесці "Дзень далёкі і блізкі" (1973 г.), "Дзімка застаецца ў Рабінаўцы", "Летняя практыка ў Вербічах" (1975 г.), "Высокае неба", "Святло імя твайго". У гэтых творах аўтар закранае праблемы маральна-этычных адносін паміж маладымі людзьмі, паказвае іх шлях да грамадзянскай сталасці.

Хоць і ў цяжкім стане быў Эдуард, але з ранейшай упартасцю змагаўся з хваробай. І (хто ведае?) што было б, калі б не чарнобыльская аварыя, якая канчаткова падкасіла сілы пісьменніка...

31 жніўня, у апошні дзень лета, грамадскасць Смілавіч адзначыла 60-годдзе свайго земляка. У Беларускі завочны сельскагаспадарчы тэхнікум, дзе праходзіў юбілей, завіталі жыхары Смілавіч — родныя, сябры, знаёмыя Эдуарда. З Чэрвеня прыехалі прадстаўнікі райвыканкама, з Мінска — пісьменнікі М. Аўрамчык, Я. Малец.

Пра жыццё і творчасць пісьменніка з цеплынёй і павагай расказала вядучая вечарыны Н. Лабанок. Успамінамі пра яго падзяліліся тыя, хто добра ведаў Эдуарда, — яго сябры і знаёмыя А. Халадзінскі, Г. Кучынская, Л. Блецька, М. Бурая, А. Шыдлоўская, пляменніца пісьменніка Г. Нежавец і іншыя.

Уладзімір ШУЛЯКОЎСКІ

г. Мінск

ЗАБОЙСТВА ПА-ТУТЭЙШАМУ

(Працяг. Пачатак на стар. 9)

За акупацыяй, каб пракарміць дзяцей, пайшла зноў настаўнічаць, за што далі дзесяць гадоў. Дзякуй Богу, было на каго пакінуць малых, не аддаваць у прытулак. Дзеці раслі з бабуляй, малодшая дачушка ўвогуле не памятала маці, а старэйшая прыгадвала яе толькі па паху рэчаў, што захоўваліся ў шафе. Калі ёй рабілася сумна, яна адчыняла шафу і ўдыхала пах рэчаў. Так па паху яна і спазнала матку, калі тая вярнулася дадому, адсядзеўшы ўсяго пяць. Вярнулася, напалоханая на ўсё жыццё, гатовая ўдаць каго заўгодна, абы не адрывалі больш ад дзяцей. Да настаўніцтва яе больш не дапусцілі, працавала справаводам у калгасе. Пра знікшага не ведала нічога: быў, спытаўся, дзе хто жыве, хто каму і як родны ды дзе яны цяпер. І ўсё.

Тамашэнка падумаў і пайшоў шукаць конюха. Той таксама сядзеў, хаця і крыху, за тое, што надумаў прылюдна ўшчуваць кіраўніцтва за жывёлу, загінуўшую ўзімку: салому пусцілі на корм, а посцілкі не было, каровы прымерзлі да гною, мусілі прырэзаць. На сваю бяду, ён прыгадаў і суседзяў, у якіх ад бяскорміцы сканалі коні. Атрымалася антысавецкая агітацыя, вось і сеў на год. Конюх прыцьмеў, убачыўшы Тамашэнку, адказваў неахвотна, кораткa — а што яму, ён сваё ўжо адсядзеў.

Больш надзеі было на старога, які ляпнуў летась, што немцы былі хаця і жорсткія, але справядлівыя, дысцыплінаваныя, не якія там "сундучнікі". Старога не пасадзілі, але таксама напалохалі і прымусілі супрацоўнічаць.

Тамашэнка не жадаў паказваць сваю сувязь са старым. Таму пайшоў не вуліцай, а загуменнем, а да хаты пайшоў праз агарод. Знянацку ў градах убачыў старую, яна ляжала ў баразне. Тамашэнка насцярожана прыпыніўся. Старая заўважыла чужога, паднялася на каленцы і збянтэжана прамовіла:

— Грады зараслі, думаю — прапалю, толькі сілы ўжо няма, дык я вось так — паўзком.

— Дзе стары? — спытаўся Тамашэнка, злы ад перажытага ўзрушэння.

— Не чую, сынок, я і глухая ўжо.

Тамашэнка нічога не сказаў і пайшоў да хаты. Старая, так і не падняўшыся на ногі, глядзела яму ў спіну выцвілымі ад старасці вачамі, апусціўшы долу вузлаватыя рукі. На дворышчы зайшоўся хрыпатым брэхам сабака, такі ж стары, як і гаспадары. У прабойчыку замест замка была ўваткнута трэска — дома няма нікога. Тамашэнка павярнуўся, моўчкі прайшоў паўз старую, якая ўсё гэтак жа стаяла, укленчыўшы, нібы ўвайшла ў зямлю, выйшаў на вуліцу і пайшоў да праўлення.

Нейкая жанчына гучна сварылася на кагосьці нябачнага за плотам:

— Ах ты, вадзіня! Скулле табе! Скулле!

Тамашэнка азірнуўся на яе. У поле зроку трапіла далёкая постаць, што шыбавала па полі да лесу.

— Хто гэта там? — павярнуўся да жанчыны.

— Хадора ў лес пайшла па ламачча на растопку, — адказала яна, нават не павярнуўшыся, каб паглядзець.

Тамашэнка здзівіўся гэткай дасведчанасці і накіраваўся да машыны, недаўмяваючы, што ніхто не бачыў прадстаўніка.

— Хадзем са мной, — загадаў шафёру.

Яны пайшлі да сенажаці, дзе людзі касілі атаву. Сцежка бегла па краі зарослага балотца, і трэба было пільна паглядаць пад ногі, каб не зачэрпнуць вады чаравікам. І тут раптам Тамашэнка ўбачыў, што ў траве нешта блішчыць, адбівае сонечны прамень. Ён нагнуўся і падняў асклепак шкла. Круглага шкла. Шкла, якое скрыўляла гарызонт.

Тамашэнка хуценька сціснуў шкло ў далоні, скасавурыўшыся на шафёра — ці не заўважыў? Але той быццам быў цалкам ахоплены клопатам не трапіць у ваду. Тамашэнка пакрочыў, ужо не разбіраючы дарогі, бо ўся ўвага яго была цяпер на балотцы. Балотца як балотца: кусты, трава, сярод іх — люстэрка чорнай вады. Пэўна, трэба было б працадзіць усю гэту ваду дый глей пад ёй. Асабліва, калі нічога там няма. А калі ёсць? Пра гэта нават думаць не хочацца. Тады — кранты. Лепей прыдумаць штосьці такое, чалавечае: выпіў лішняга, шуры-муры развёў, звар'яцеў урэшце. Хаця і гэта не соладка, але ўсё ж... Трэба падумаць.

На сенажаці сабралася, здаецца, палова вёскі — карысталіся добрым надвор'ем. Хто варушыў сена, хто пластаваў у копы, хто зносіў гатовыя копы да стога. Проста пчаліны рой. Дасканала распытаць, узяць тое ці іншае на зацемку проста немагчыма. Тамашэнка пагаварыў ці не з кожным, прайшоў з усімі ўвечары да вёскі ў надзеі пачуць што-небудзь, але — безвынікова. Зрэшты, ён не надта і стараўся пачуць, стрымліваўся ад адчування небяспекі. Побач з ім крочыў мужчына з такімі грудзямі і плячыма, што не саступалі тамашэнкаўскаму сейфу-сховішчу. На плячы ён нёс касу, якая ў ягонай руцэ была нібы аловак у руцэ вучня.

— Навошта табе каса? — пацікавіўся Тамашэнка. — Вы ж сена граблі.

— А прыхвачу па дарозе травы абярэмак.

— А ў чым жа ты панясеш?

— А ў роце, — зарагатаў асілак.

Тамашэнка ў думках мацюкнуўся і клікнуў шафёра, які таксама нічога не даведаўся. Але ехаць адразу не прыйшлося, бо пашанцавала павячэраць у старшыні калгаса: пасля ўчарашняга мутарна было ўсё ж на душы, хацелася пахмяліцца.

Ужо сутоньвалася, калі старшыня праводзіў гасцей да машыны, даўшы яшчэ і з сабою пляшку самагону.

VII

Шлях ішоў нізінаю, глеба была вільготная, глеістая. Машына загразла раз, другі, а потым стала зусім.

— Не далі як след адрамантаваць, зараз будзем длубацца, — сказаў шафёр, адкрываючы капот. Ён запаліў ліхтар і нібыта адышоў у іншае вымярэнне. Тамашэнка сядзеў, звесіўшы нос, і смактаў самагон.

Нечакана з цемры паявілася постаць чалавека ў фуражцы са стрэльбаю на плячы.

— Стой, хто ідзе? — занадта зычна, амаль нема, крыкнуў Тамашэнка і схапіўся за пісталет.

— Ляснік, — спакойна адказаў той і падышоў усё гэтак жа няспешна і ўпэўнена, па-гаспадарску.

— Ты чаго? — спытаўся Тамашэнка.

— Злодзеяў пільную. Што лес крадуць.

— Тут ёсць тэлефон блізка?

— Не, толькі ў лясніцтве.

— Слухай, пайдзі, патэлефануй у раён, каб прыслалі сюды машыну. Ты ведаеш мяне?

— Ведаю. Добра, пазваню, — адказаў ляснік і зноў знік у цемры.

Наплываў туман. П'янаваты Тамашэнка глядзеў у белую мройлівую сцяну і яму здавалася, што ў тумане паяўляюцца нейкія дзіўныя постаці. Вось сённяшняя старая з доўгім тварам у буйных маршчаках і амаль белымі вачыма, вось нейкі стары, што глядзіць на яго з прыжмурам, але подых ветру — і выраз твару змяніўся, ён пазірае ўжо злосна, бы асуджаючы... Тамашэнка скалеў, дрыжыкі трэслі яго, сагрэцца не памагала і самагонка. Ён не разумеў, што гэта трызніцца яму, таксама як не разумеў гэтых людзей, на зямлі якіх нарадзіўся. Не разумеў іхняй лагоднасці да ўладаў і адначасова іхняй адчужанасці ад іх, іхняй нязлоснасці, паслужлівасці, пакорлівасці, іхняй чэснасці і схільнасці да дробнага крадзяжу...

Ён яшчэ не ведаў, што знікшы прадстаўнік усплыве вясною зусім у другім месцы, чым ён думаў — у рэчцы суседняга раёна, і экспертыза не здолее вызначыць прычыну ягонай смерці; што сам ён, звольнены з пасады, будзе народным суддзёй... І гэта яшчэ добра, што ён своечасова паклапаціўся аб сведках, якія нібы бачылі, як той чалавек паехаў кудысьці на папутцы...

Наступаў ранак. На ўсходзе святлела...

г. Масква

ВАРУНКІ

Жэня К., сацыяльны сірата

ЖЭНЯ К. (зрэшты, ён яшчэ такі малеча, што можна без асаблівых паследстваў ягонае прозвішча называць цалкам — Кудрэйка) — гэта кропелька ў моры беларускага сіроцтва, адзін з 20 тысяч сённяшніх насельнікаў нашых дзіцячых дамоў і школ-інтэрнатаў.

Так, я не абмовілася: 20 тысяч! Такой колькасці сірот у нас не было нават у пасляваенныя гады, калі вакол панавала гора і галеча. Старыя людзі памятаюць тых паваенных сірот, іх часта можна было бачыць на вакзалах, рынках, у вагонах цягнікоў, на вялікіх і малых дарогах, па якіх яны вадзілі гэтакіх жа, як і самі, адзінокіх, непрыкаяных інвалідаў вайны — сляпых, бязногіх, бязрукіх. Горка, балюча было бачыць тых сірот-бедалаг, але ж і зразумець іх, так бы мовіць, наяўнасць таксама можна было, толькі што прайшла, пракацілася па краіне страшэнная вайна, тысячы, мільёны чалавечых жыццяў забрала яна, асіраціла, зрабіла бяздомнымі бадзяжкамі многіх і многіх дзяцей самага рознага ўзросту. Чаму ж сёння малых заложнікаў казённых дамоў больш, чым па вайне? Вынік якой трагедыі гэты ўсплёск сіроцтва? Імя гэтай страшнай трагедыі — п'янства, маральная разбэшчанасць, бездухоўнасць і звычайная людская безадказнасць.

Скаланёмся ад другой лічбы: 90 працэнтаў з гэтых 20 тысяч сённяшніх сірот — сіроты пры жывых бацьках! Так, так, кожныя дзевяць з дзесяці насельнікаў розных сірочых устаноў маюць бацькоў, часцей — маці, але нярэдка — і маці, і бацьку. Дзеці гэтыя — так званыя сацыяльныя сіроты. Паняцце гэтае — параджэнне нашага часу. Маці, а то і бацька жывыя, а дзіця іхняе — без прыгляду, без прытулку. Значыць, сірата? Не, сірата — гэта калі бацькі адсутнічаюць: памерлі ці загінулі. А тут жа бацькі — у наяўнасці. Ды толькі — ці лягчэй ад гэтага дзецям? Яны, па сутнасці, бацькоў сваіх не ведаюць, яны пазбаўлены бацькоўскіх клопатаў, ласкі, увагі і падтрымкі. Значыць, яны — сіроты, і клопат пра іх вымушана браць на сябе дзяржава. Вось і нарадзілася гэтае дзіўнае, недарэчнае і не зусім уцямнае паняцце — сацыяльныя сіроты.

Жэня Кудрэйка — якраз з іх. Маці нарадзіла яго ў турме, куды патрапіла за крадзеж. Неўзабаве яна выйшла на волю, але не пакінула ранейшых звычак, схільнасці да лёгкага жыцця, піла, гуляла. У Жэні былі яшчэ 3 старэйшыя сястрычкі і брацік. Нейкі час яны яго сяк-так даглядалі. Жылі ўпрогаладзь. Есці ўсім хацелася заўсёды. Сёе-тое выпрошвалі на ганку магазіна, часам нешта перападала ад суседзяў і іншых добрых людзей. Старэйшыя дзеці, ідучы ў школу, пакідалі Жэню аднаго. Калі вельмі хацелася есці, ён не вытрымліваў, выходзіў з кватэры і ішоў у магазін, дзе, ужо ведаў, яму можа сёе-тое перапасці ад той ці іншай добрай цёткі...

Сёння ў Жэні ёсць дах над галавой, ёсць чыстая і мяккая пасцель, ён накормлены, акуратна адзеты, дагледжаны — яго прытуліў мінскі дзіцячы дом N 2. Дом для дзяцей-сірот. Дырэктар дома Валянціна Зіневіч гаворыць:

— У нас 110 дзяцей. Вось такая ладнаватая сямейка. Пераважная большасць дзяцей — сацыяльныя сіроты, гэта значыць сіроты пры жывых бацьках. Такіх — 85 працэнтаў. У пятнаццаці працэнтаў дзяцей бацькі ў месцах зняволення. Ад шасцярых дзяцей бацькі наогул адмовіліся. Сямейныя сувязі між дзецьмі мы стараемся падтрымліваць — не раздзяляем брацікаў і сястрычак, незалежна ад таго, колькі ім гадоў, якая між імі ўзроставая розніца. Няхай малодшаму будзе 3 гадкі, а старэйшаму — усе дзесяць, яны ўсё роўна выхоўваюцца ў адной групе, крэўных сувязей стараемся не парываць. Вось і Жэня Кудрэйка жыве ў нас з сястрычкамі. У нас некалькі такіх "сем'яў" — па 3—4 дзяцей, а ў адной нават усе 5. Прыходзяць яны да нас, паўтаруся, пераважна з сем'яў, дзе бацькі пазбаўляюцца бацькоўскіх правоў...

Валянціна Пятроўна паказала мне "кватэру" сваёй вялікай сям'і. Уражанне было самае прыемнае: прыгожа, цёпла, утульна. Дзеці, якія бадзяліся па сметніках, выпрошвалі ежу ў суседзяў, а то і кралі, якія не мелі магчымасці ні спакойна спаць, ні кніжку пачытаць, знайшлі тут, бадай, усё, чаго былі пазбаўлены. Забяспечаны яны тут, мусіць, лепш, чым многія дзеці ў так званых нармальных сем'ях, дзе бацька і маці сёння пазбаўлены магчымасці асабліва пеставаць сваіх сынкоў і дачушак, частаваць іх прысмакамі ды адорваць падарункамі-цацкамі. Тут, у дзіцячым доме, матэрыяльна дзеці не пакрыўджаны, ведаюць яны, скажам, смак і бананаў, і апельсінаў. І выглядаюць зусім не горай за "бацькоўскіх" дзяцей, мо нават і лепей. Але...

Але глядзець у іхнія вачаняты — сумна, горка і вельмі цяжка. Бо ў вачанятах тых — мала радасці і шмат смутку. У іх — заўсёдны боль і заўсёдная мальба: забярыце мяне адсюль, я хачу дамоў, да мамы. Я ведала гэта, мне расказвалі пра гэта тыя, што бывалі ў дзіцячых дамах і сірочых прытулках, і ўсё ж ледзь не расплакалася, калі і да мяне кінулася маленькая дзяўчынка са слязамі і словамі: "Мама, ты знайшла мяне, пайшлі дамоў!.." Малыя дзіцячыя сэрцы не ўмеюць хаваць, таіць злосць, яны ўсё даруюць. Малое не памятае, што мама была п'яная, не карміла яго, не атуляла ласкаю, нават лупцавала. Іхняя памяць, іхні маленькі жыццёвы вопыт зафіксаваў, няйначай, толькі адно: боль і страх адзіноты, жудасць пакінутасці, забытасці. Гэтыя пачуцці цяжка пераадольваюцца і ў сталым веку, а ў дзіцячым... Як кажуць, і ворагу свайму не пажадаю...

А між тым, статыстыка сведчыць: тэндэнцыя да рэзкага павелічэння колькасці сацыяльных сірот — відавочная. Летась такіх дзетак было выяўлена 4006 чалавек, што ў 3 разы больш, чым у 1990 годзе. Летась жа ў выніку пазбаўлення бацькоўскіх правоў так званых татаў і мамаў дзяржава ўзяла на выхаванне 2868 дзяцей — амаль у чатыры разы больш, чым шэсць гадоў назад, у тым жа 1990 годзе. Чаму так здараецца, што маці пазбаўляецца мацярынскага права на сваё дзіця? Чаму гэта не скаланае кожнага з нас, не прымушае задумацца, што з намі робіцца, што мы за людзі, што гэта за маці жывуць побач з намі, як мы ўсе разам можам такое дапускаць?

Пісьменнік Уладзімір Ліпскі, старшыня Беларускага дзіцячага фонду, жыццёвым крэдо якога сталі ягоныя ж словы: "Калі боль нашых дзяцей не стаў тваім, то дарэмна прайшло тваё жыццё", сказаў у адказ на мае ламентацыі:

— Сіроцтва пры жывых бацьках гаворыць аб дэградацыі сям'і, аб ненармальнасці нашага грамадства. Без здаровай сям'і нармальнага грамадства не будзе. Эталон шчырасці, сумлення, дабрыні быў закладзены ў нашых мацярок. Сёння многае страчана. Страчаны лепшыя сямейныя традыцыі, колішні маральны грунт сям'і. Страчаны, ці загублены стрыжань, ідэя — ідэя бацькаўшчыны, роднай зямлі, мовы, культуры. Загінула, па сутнасці, вёска, якая выхоўвала дзяцей у лепшай школе — у школе працы. Там мела значэнне для выхавання літаральна ўсё. Найперш выхоўвалася сумленне. Загад, ці наказ бацькі і маці не лезці да суседа ў сад — дробязь, здавалася б, але з такіх дробязей пачыналася ўсё. А што сёння? Паслухайце, пра што гавораць бацькі, наогул старэйшыя пры дзецях. Паглядзіце, якія фільмы і тэлепраграмы глядзяць разам з дзецьмі. Калі гэта чуеш і бачыш, дык становіцца вельмі відавочна, што сапраўды стрыжань выхавання нашымі сённяшнімі бацькамі згублены. Адсюль і ўсе праблемы, звязаныя з дзецьмі. Успомнім такое слова, як падкідыш. Калісьці яно звязвалася, асацыіравалася ў нашай свядомасці найперш ці не з вядомым камедыйным фільмам. А сёння? Сёння гэтае слова напоўнена рэальным і самым жахлівым зместам. У скверах, падвалах, на гарышчах, у вагонах штогод мы знаходзім пад тысячу падкідышаў. Пакінутых, ці, проста, кінутых дзяцей. Трапляюць яны, прыкладна палова, у нашы сірочыя ўстановы — дамы дзіцяці, дзіцячыя дамы, школы-інтэрнаты. Ёсць яшчэ і спецыяльныя дзіцячыя дамы, у якіх выхоўваюцца разумова адсталыя дзеці, а таксама дзеці-калекі, інваліды. Людзі, якія там працуюць, робяць неверагоднае. Гэта самыя сапраўдныя самаахвярнікі. Кажу гэта і бачу, напрыклад, Івянецкую школу-інтэрнат. Там і дырэктар, і выхавацелі робяць усё для таго, каб дзеці-інваліды адчулі сябе карыснымі людзьмі. І яны шмат чаго дамагаюцца: дзеці і спяваюць, і малююць, і шыюць, у іх там і цяпліцы ёсць, і вялікі агарод, нават коні ёсць.

Нямала дзяцей — з так званых сацыяльных сірот — аддаецца ў апякунскія (прыёмныя) сем'і, у дзіцячыя дамы сямейнага тыпу, а таксама ўсынаўляецца. Сёння, скажам, каля 7 тысяч сацыяльных сірот выхоўваюцца ў прыёмных сем'ях і каля 200 — у дзіцячых дамах сямейнага тыпу.

— Уладзімір Сцяпанавіч, вам, несумненна, вядома і такая вось сумная статыстыка. Трэцяя частка "выпускнікоў" нашых дзіцячых дамоў трапляе на лаву падсудных, пятая — робіцца бамжамі, а многія канчаюць самагубствам. Усё гэта наводзіць на думку, што дзяржава наша клапоціцца пра сірот усё ж недастаткова?

— Сапраўды, самая вострая праблема — матэрыяльнае становішча і працаўладкаванне пасталелых сірот. Выхаванцаў дзіцячых дамоў нават пасля заканчэння вучылішчаў, тэхнікумаў, інстытутаў не хочуць браць на працу, бо па законе ім трэба прадастаўляць ільготы на жыллё. А каму ён патрэбен, гэты Васька? Мая даўняя мара, каб у аддзелах кадраў прадпрыемстваў усё ж вялі ўлік сірот, што прыходзяць да іх на працу, і ставіліся да гэтых маладых людзей з асаблівай увагай. Бо ў іх няма радні, у іх іншая, не хворая, але не такая, як у нармальных людзей, псіхалогія. Да такіх людзей на прадпрыемствах павінен быць асаблівы, скажам, вельмі датклівы падыход, іх павінны ведаць, бачыць і не забываць на іх. На жаль, вельмі часта здараецца так, што сірата — юнак ці дзяўчына — гадамі працуе ў калектыве, а ніхто на іх не звяртае ўвагі.

Я звярнуўся з адкрытым лістом да прэзідэнта краіны з просьбай і прапановай стварыць дзяржаўную праграму "Дзеці Беларусі". Такая праграма распрацавана і падпісана прэзідэнтам. Яна будзе фінансавацца з бюджэту. Гэта вельмі смелы і неабходны крок з боку кіраўніка краіны, з боку нашай дзяржавы. Галоўнае тут — дайсці да кожнага дзіцяці канкрэтна, аніводнага з іх не пакінуць занядбаным. Грамадскасць павінна кантраляваць выкананне гэтай праграмы.

— Уладзімір Сцяпанавіч, акрамя дзяржаўнага клопату пра дзяцей-сірот, ёсць жа, напэўна, і клопат дабрачынны — замежны і айчынны?

— Спачатку — пра замежны. Мы рыхтуем на дзіця-сірату, на дзіця-інваліда, ці проста на хворае дзіця нешта накшталт дасье, з фотаздымкам, з апісаннем яго — якія ў яго вочы, валасы, які характар, схільнасці, іншыя дадзеныя, і па гэтых дадзеных міласэрныя людзі за мяжой выбіраюць сабе аб'ект, скажам гэтак, сваіх клопатаў: дапамагаюць гэтаму дзіцяці як хто можа і чым можа. Напрыклад, прысылаюць штомесяц на ягонае імя па 10—20 долараў, пасылкі, падарункі... Такім індывідуальным спонсарствам у нас забяспечаны каля 400 дзяцей.

— А сярод нашых "крутых" суграмадзян такіх дабрадзеяў ці шмат?

— На жаль, няма наогул. Глухата наша сардэчная, абыякавасць пануюць і тут. Даўно ідуць гаворкі пра тое, каб, скажам, на кожнага сірату завесці спецыяльную ашчадную кніжку. Хай бы знайшлося б на 20 тысяч сірот 20 тысяч нашых "крутых", як вы кажаце, ды адшкадавалі б ім хоць бы па нейкіх 100—200 тысяч?.. Дык — не! Не знаходзяцца! Ім бы пра Саву Марозава прачытаць! Каб павучыліся... А вось згаданыя ўжо мною 400 замежных — дакладней, 397 — мецэнатаў з Канады, Амерыкі, Германіі, Італіі клапоцяцца аб нашых дзетках.

— Уладзімір Сцяпанавіч, газеты паведамляюць, што краіна дзяцінства ў нас з кожным годам змяншаецца. Якімі лічбамі валодаеце вы?

— Так, наша краіна дзяцінства, у якой зараз амаль 2 мільёны 700 тысяч насельнікаў, з кожным годам змяншаецца на 30—40 тысяч дзяцей. Ужо чацвёрты год, з 1993 года, ідзе па сутнасці выміранне нацыі: памірае людзей больш, чым нараджаецца. А няма дзяцей — няма нацыі, няма дзяржавы. Так што, як ні сумна гэта гаварыць, становішча вельмі трывожнае і перспектывы таксама не бясхмарныя...

Дык што ж чакае нашага Жэню Кудрэйку? Ягоны лёс — не выключэнне. Ён, як я ўжо казала, — толькі кропелька ў 20-тысячным сіроцкім моры Беларусі. Жэня трапіў у дзіцячы дом па віне маці-алкагалічкі, іншых "прыводзяць" сюды ў нечым адрозныя ці падобныя прычыны. Тут дзеці знаходзяць тое, з чым звязана паняцце "дом": дагледжанасць, ласку, цяпло рук і сэрцаў старэйшых. І дзеці — знявечаныя, ці пакрыўджаныя чалавечыя парасткі — ачуньваюць тут, адгаравацца, падрастаюць. І выходзяць адсюль "у людзі". Ды выходзяць усё ж, на жаль, квольмі. Найперш — без матэрыяльнага грунту, без самастойнага апірышча. І зноў на іх абрыньваюцца цяжкія выпрабаванні, а то і пакуты, пакуты...

Хай жа абмінуць яны малога Жэню, сённяшняга нашага сацыяльнага сірату!

Марыя МІХАЙЛАВА

Фота Анатоля Клешчука



ЧАСАПІС

Год нараджэння невядомы

А памёр беларускі і польскі драматург, педагог Міхал Цяцерскі 200 гадоў назад — 12 верасня 1797 года. У Забельскай дамініканскай калегіі, дзе выкладаў рыторыку, Цяцерскі стварыў з аднадумцамі школьны тэатр, для якога перарабіў камедыю Мальера "Лекар па няволі", увёўшы ў яе беларускіх сялян Хведара і Апанаса. Сцэны з гэтымі персанажамі нагадваюць традыцыйныя народныя інтэрмедыі. Тым самым мальераўскі сюжэт быў напоўнены беларускім нацыянальным каларытам. Цяцерскі напісаў трагедыі "Сапар", "Фемістокл", камедыі "Шлюб, пастаўлены дагары нагамі штучкамі арлекіна" і "Камедыя", празаічную частку тэксту камічнай оперы "Апалон-заканадаўца, або Рэфармаваны Парнас". Захаваўся рукапіс падручніка Цяцерскага па рыторыцы, напісаны на латыні.

Напісаў "Граматыку тувінскай мовы"

Добрая слава пра беларусаў па ўсім свеце ідзе. Пацвярджэнне таму і дзейнасць вучонага-цюрколага Аляксандра Пальмбаха, з дня нараджэння якога споўнілася 100 гадоў (памёр 22 кастрычніка 1963 года). Аляксандр Адольфавіч родам з Верхнядзвінска (колішняя Дрыса). У 1918 годзе скончыў Віцебскае аддзяленне Маскоўскага археалагічнага інстытута. Быў удзельнікам грамадзянскай вайны, затым да 1922 года настаўнічаў у Лёзне. З 1930 года працаваў у Тувінскім навукова-даследчым інстытуце мовы, літаратуры і гісторыі. А. Пальмбах стаў адным з аўтараў "Граматыкі тувінскай мовы" і "Асноў тувінскай арфаграфіі". Пад псеўданімам А. Тэмір выступаў як перакладчык, тым самым садзейнічаў станаўленню тувінскай нацыянальнай літаратуры.

З беларускага роду "Андравонж"

З гэтага роду паходзіў вядомы дзеяч нацыянальна-вызваленчага руху ў Польшчы, удзельнік паўстання 1830—1831 гадоў Пётр Яшак Высоцкі (нарадзіўся 10 верасня 1797 года, памёр 6 студзеня 1875-га). Быў ад'ютантам камандуючага польскімі войскамі М. Радзівіла, прымаў удзел у перамовах Нацыянальнага ўрада ў Варшаве з галоўным камандуючым рускімі войскамі І. Паскевічам і вялікім князем Міхаілам. Паранены ў баі, трапіў у палон. Суд у Бабруйску прыгаварыў яго да чацвяртавання, варшаўскі суд — да павешання. Але паводле амністыі пакаранне замянілі 20 гадамі сібірскай катаргі. За спробу ў 1835 годзе ўцячы атрымаў І тысячу шпіцрутэнаў. Далейшае пакаранне адбываў на рудніку, прыкаваны за нагу да тачкі. Сябраваў з дзекабрыстам М. Луніным, якому аказваў матэрыяльную дапамогу. Быў памілаваны ў 1857 годзе. Высоцкі з'яўляецца аўтарам "Успамінаў" пра паўстанне 1830—1831 гадоў.

Саладуха на гастролях

Аляксандр Саладуха пабываў з канцэртамі ў Кіраўскім, Быхаўскім і Крычаўскім раёнах Магілёўскай вобласці.

На здымку: Аляксандр Саладуха выступае ў Крычаве.

Фота Валерыя БЫСАВА, БЕЛТА

БЫЛО...

Уладзімір МЕХАЎ

Гісторыя адной рэцэнзіі

І

Ланцужок фактаў усплывае ў памяці. З фабульнымі завязкай, кульмінацыяй, развязкай. Сюжэт з гісторыі беларускага літаратурнага жыцця. Думаю, цікавы для тых, хто да гэтай гісторыі неабыякавы, але ні сведкам, ні хоць аддаленым "балельшчыкам" тых падзей па ўзросце быць не мог.

Тое здарылася ў час, калі пісьменніцкую грамадскасць, прынамсі, яе сумленную — большую! — частку раз за разам узбуджала інспіраванне ідэалагічным сінодам дзяржавы нападкаў на Васіля Быкава. На яго мужную і горкую ў праўдзе прозу.

У бібліятэчнай картатэцы я прагледзеў зарэгістраванае з тагачаснага крытычнага рэзанансу на "Мёртвым не баліць", "Праклятую вышыню", "Круглянскі мост". Ужо назвы газетна-часопісных вердыктаў — яскравыя: "Мёртвым не больно — больно живым", "Вопреки правде жизни", "Зачем же так оскорблять солдатскую память?", "Праклятая вышыня...Праклятая рота... Прыкры твор", "Странная история о странной роте", "Открытие нового как повторение старого", "Так что же произошло у Круглянского моста?".

У вачах чытача, у вачах калег Быкаў стаяў ужо вельмі высока. Чым большая пальба ўсчыналася па напісаным ім, чым бессаромней шалелі вакол яго персоны "мастацвазнаўцы ў цывільным", тым актыўней шырокая грамада выяўляла пачуццё салідарнасці з ім.

Любое арганізаванае не самой уладай калектыўнае выказванне хоць якога, хоць супроць чаго, пратэсту было тады акцыяй, на якую адразу рабіў стойку КДБ. Тым не менш блізка паловы тагачаснага складу Саюза пісьменнікаў рэспублікі ў 1966 годзе падпісала пісьмо ў кампартыйныя вярхі з аспрэчваннем афіцыёзнай ацэнкі аповесці "Мёртвым не баліць". Тэкст пісьма нарадзіўся ў рэдакцыі газеты "Літаратура і мастацтва". Я тады таксама быў работнікам рэдакцыі, і добра памятаю мітынговую атмасферу ў нашых кабінетах, куды заходзілі, па адным і купкамі, як цяпер гаворыцца, падпісанты.

Пазней, калі ў "Маладосці" з'явілася "Праклятая вышыня", сакратар ЦК КПБ Пілатовіч, тады галоўны ў рэспубліцы куратар ідэалогіі, даручыў падручным прыняць захады, каб гэтую ідэалагічную дыверсію сурова асудзіў беларускі друк. Аднак знайшоўся ў Беларусі ці не адзіны пісака, што падахвоціўся запатрабаванае выканаць, — рэдактар "Мінскай праўды" Агееў. Напісаў і апублікаваў у сваёй жа газеце памянёны ўжо артыкул "Праклятая вышыня... Праклятая рота... Прыкры твор". Ніхто з крытыкаў-прафесіяналаў, мовім так, на трубны кліч не адгукнуўся. Рэдактару "ЛіМа" Нічыпару Пашкевічу было патэлефанавана, каб опус перадрукаваў. Аналагічнае сваё, маўляў, "ЛіМ" не падрыхтаваў, няхай дасць плошчу вартаму чужому. Пашкевіч быў цвёрдым арэшкам для начальства, адгаварыўся. Перадрукавала тое агееўскае "Звязда" — вядома, па загадзе адтуль жа, адкуль званілі Пашкевічу.

Наступным годам выйшаў "Круглянскі мост" — адначасова ў "Полымі" і ў "Новом мире". Сітуацыя ўтварылася гэткая ж: у службах ідэалагічнага кантролю забурапеніла, а талака беларускіх крытыкаў як затаілася — ні слова асуджэння аповесці. Успрыняўшы гэта як дэманстратыўны палітычны сабатаж, Пілатовіч сам пазваніў у рэдакцыю "ЛіМа". Не жадаючы і слухаць спробы новага галоўнага рэдактара газеты Прокшы адкруціцца ад таго, што было рэдакцыі несімпатычным, загадаў абавязкова перадрукаваць з "Литературной газеты" езуіцкі артыкул Мацяшова "Дык што ж адбылося каля Круглянскага моста?".

Яшчэ праз год "Новый мир" запусціў у зорны лёт "Сотнікава". І гэта і ёсць завязка сюжэта, які ўзнаўляю.

2

Факты для характарыстыкі Леаніда Януаравіча Прокшы раскладаю на два бакі. У адзін — тое, што было аб ім пры жыцці вядомае шырэй і стварыла яму для кагонікаго адпаведную рэпутацыю. У другі — тое, што вядома менш, можа, толькі нам, хто разам з ім у "ЛіМе" працаваў, і што ў гады, калі ён быў нашым шэфам, аб'явілася малапрыемнай нечаканасцю для інстанцыі, якая ставіла яго на гэтае пісьменніцкае выданне як архінадзейнага.

Ну так, ён пераведзены быў на "ЛіМ" з пасады рэдактара "Голасу Радзімы". Газета гэтая — для беларусаў у дыяспары, найперш для эмігрантаў ваеннай хвалі, уцекачоў ад пакарання за супрацоўніцтва з акупанцкім рэжымам (часта супрацоўніцтва, якое шкоды нікому не прынесла, вымушанае, дзеля хлеба). Як рэдактар той газеты, ён не мог не быць не звязаным з КДБ.

Ну так, пры пазбаўленні савецкага грамадзянства Салжаніцына Прокша прыняў удзел у адабральным галасе на старонках "Литературной газеты". Выступіў з малакроўнай зацемкай. Пазней, праз гады, расказаў мне, што напісаць зацемку было сказана яму ў аддзеле культуры ЦК КПБ. Аддаючы туды напісанае, толкам нават не ведаў, куды яно будзе перададзена.

Ну так, раней да таго было, што пасля шпігавання тамсама ў ЦК кіраўнікоў сродкаў інфармацыі напісаў ён здзеклівае пра змешчанае ў "Маладосці" эсэ Уладзіміра Караткевіча "Званы ў прадоннях азёр". Падпісаўся псеўданімам Л. Жога. Ды не бывае тайнага, што не сталася б яўным. Хто насамрэч гэты Жога, даведаліся ўсе, каму даведацца хацелася. Гадоў праз дваццаць чытаў я ў архіве пісьмы Паўліны Мядзёлкі да Зоські Верас, і нават у адным з тых пісьмаў сустрэў: ведаеце, шаноўная Зоська, аказваецца, Жога, які настрачыў у "ЛіМе" брыдкае пра Караткевіча, — рэдактар "ЛіМа" Прокша!.. Зразумела, адразу не стала гэта тайнай для самога Караткевіча. Аматар "плутовскіх" раманаў сярэднявечча, Валодзя зайшоў нападпітку ў рэдакцыю і, як па-руску кажуць, "на голубом глазу" спытаў у Леаніда Януаравіча: "Што за дурня Жогу вы друкуеце?" Вымавіўшы ў прозвішчы замест гуку "г" іншы, не цяжка здагадацца які...

Што было, тое было.

Аднак было таксама іншае. З другой групы фактаў.

Алесь Разанаў быў выкінуты з універсітэта мала не з воўчым білетам. Абвінавачаны ў нацыяналізме, у палітычнай нядобранадзейнасці. Дабіўшыся права закончыць педінстытут у Брэсце, панастаўнічаўшы ў вёсцы, паслужыўшы ў арміі, вярнуўся ў Мінск. Быў узяты Прокшам у штат "ЛіМа". Пра тое дакладзена было ў ЦК. Адтуль скамандавалі: звольніць! Не выканаць загаду наш галоўны не мог: быў наменклатурным нявольнікам. Схітраваў: папрасіў, каб Разанаў напісаў яму заяву аб звальненні "па ўласным жаданні", а сам змовіўся з пісьменнікамі, "уваходжымі" на больш высокія за той, адкуль атрымаў загад, цэкоўскія паверхі, каб выказалі там абурэнне яго, Прокшавымі, паводзінамі. Маўляў, от перастрахоўшчык! Пакінуў без працы за колішнія дзіцячыя грахі таленавітага паэта! І якога хлопца — дэмабілізаваны воін, выдатнік баявой падрыхтоўкі!.. Спектакль удаўся, апякун маладых талентаў з самавысокага цэкоўскага паверха "перастрахоўшчыку" пазваніў, прысароміў, сказаў, каб Разанаў у рэдакцыю быў вернуты.

Раздражнёных ушчуванняў нахапаўся Прокша і за Вольгу Іпатаву. Дазволіла сабе чортведама што, антысавецкую, па сутнасці, выхадку: адмовілася ад граматы ЦК камсамола. А зноў жа стала па ягоным лібералізме лімаўкай.

Зрабіў няўхвальнае па тым часе і я. Апублікаваў у "ЛіМе" нарыс пра славутую нарадаволку, мазыранку нараджэннем Гесю Гельфман. З працягам на тры нумары тыднёвіка. А героі з такімі імёнамі былі тады ў нас персонамі нон грата для літаратуры і мастацтва (быкаўскі Фішар з "Жураўлінага крыку" ў фільме па матывах аповесці стаў дзейнай асобай са славянскім прозвішчам). Дык не паспела мая публікацыя завяршыцца, як ЦК атрымлівае ананімку: тое, што Мехаў публікуе, напісана з мэтай "натхніць сіяністаў, якія кідаюць бомбы ў нашыя пасольствы".

Ідыёцкая пісуліна не была шпурнута ў сметніцу. Сакратар ЦК пераправіў яе на рэзалюцыю загадчыку аддзела, загадчык аддзела — загадчыку сектара, а загадчык сектара выклікаў няпільнага рэдактара правіннага выдання і сказаў яму ўсё, што палічыў патрэбным сказаць, як дабрадзею недавыкрытага адэпта сіянізму.

Леанід Януаравіч прыйшоў пасля праборкі разгублены, з чырвонымі плямамі на твары. Яўна адчуваючы няёмкасць за тое, што пачуў, за таго, з кім гаварыў. І пры слабасцях сваіх прыстойны, інтэлігентны, шляхетны, ён ніякага абмеркавання майго грэхападзення не правёў, хоць наказана было правесці. Непрыманне ж пазіцыі ананімшчыка, фактычна падтрыманай у апараце ЦК, выказаў у аддадзенай туды вельмі годнай тлумачальнай запісцы.

Ён дастаткова ў жыцці пабачыў, каб разумець: за непаслушэнства паплаціцца. І ён шчыра верыў сістэме, якой быў узгадаваны, верна ёй служыў. Ды ўсё-такі шанаваў справядлівасць. Як добры, чысты, зычлівы чалавек. Няхай між справядлівым і несправядлівым, здаралася, блытаўся.

3

Чаму "Сотнікаў" уразіў яго асабліва? Развярэджана было ў характары чуйнае на несправядлівасць, — у дадзеным выпадку на паказаную ў фабуле, створанай Быкавым, несправядлівасць лёсу да чыстага душой пакутніка? Павышанае ўражанне вынікла з таго, што ўсхваляванасць трагедыяй персанажа пісьменніка легла на пачуццё нязгоды з бушаваннем несправядлівасці вакол самога пісьменніка?

Чым тое ні тлумачыць, заходзячы па службовых абавязках да яго ў кабінет — а заходзіць даводзілася часта, я быў адказным сакратаром рэдакцыі, — колькі тыдняў бачыў я галоўнага за адным заняткам: зазіраючы ў разгорнуты "Новый мир", ён нешта пісаў. Часопіс разгорнуты быў на старонках "Сотнікава", і былі яны спрэс у алоўкавых падкрэсліваннях, адкрэсліваннях, клічніках, словах-паметах на палях.

Чаму з новым творам беларускага пісьменніка рэдактар "ЛіМа" знаёміўся ў перакладзе? Па-беларуску "Сотнікаў" з'явіўся ў друку пазней. Але пра гэта далей.

Прызнаюся: я думаў, наш галоўны выседжвае нешта накшталт таго, з чым выскачыў раней пра Караткевіча. За што зноў будзе нам, лімаўцам, сорамна. "Новый мир" не быў ужо часопісам Твардоўскага — перастаў быць, цытуючы Лакшына, бліжэйшага паплечніка Твардоўскага ў часопісе, "магутным магнітам для людзей, якія прагнулі праўды". На час выхаду нумара з "Сотнікавым" ішоў чацвёрты месяц, як "Новый мир" быў у Твардоўскага адабраны. Але пастаўлены рэдактарам Касалапаў, колішні галоўны ў "Литературной газете" (пры ім там убачыў свет слынны "Бабін Яр" Еўтушэнкі), імкнуўся, каб выглядала, што нічога жахлівага не здарылася, што "Новый мир" застаўся "Новым миром". Вось і аўтараў, згуртаваных вакол часопіса Твардоўскім, новая каманда, паказвалася, стараецца ўтрымаць. У іх ліку Быкава. Ды непрымальнікаў ранейшага "Нового мира" гэта якраз і страшыла — захаванне часопісам "ранейшасці". Што ж, як не пасквільнае, думалася, пра чарговага наваміраўскага Быкава можа ў "ЛіМе" вытыркнуцца? Пры падкантрольнасці газеты ў найдробязным.

Даруйце, Леанід Януаравіч! Я адчуў сябе не лепшым чынам, калі ўбачыў, што вамі напісана палярна процілеглае, калі ваш артыкул, поўны захаплення аповесцю, прачытаў. Няхай не ставала ў ім глыбіні аналізу твора. Няхай не дужа вызначаўся ён выхадам думкі ў крутыя віражы. Але сам факт безагаворачна станоўчай ацэнкі новай рэчы пісьменніка, якога ўлада каторы год на дух не пераносіла, — гэты факт, лёгка было прадбачыць, успрымецца літаратурным, і не толькі літаратурным, асяроддзем жаданым выбухам, бомбай, дадасць "ЛіМу" павагі людзей, чыёй павагі мы ў рэдакцыі хацелі.

Твар выдаў маю ўзрушанасць. Леаніда Януаравіча яна збянтэжыла — чалавек ён быў, паўтараю, далікатны і сціплы. За безагляднага смельчака выдаваць сябе не жадаючы, ён сказаў, як у апраўданне:

— Ходзіць чутка, "Сотнікаў" спадабаўся Суславу.

Суслаў быў тады галоўным у краіне ідэолагам. Нязменным у гэтай іпастасі трэцяе дзесяцігоддзе. Шэрым кардыналам пры Хрушчове і Брэжневе. Мой рэдактар, я зразумеў, трымаў тое, што сказаў, у галаве на выпадак, калі за зробленае не пахваляць.

Па-сакратарску я, натуральна, спытаў, калі

артыкул ставіць у газету — у нумар, што макетую, ці ў наступны? Рэдактар паглядзеў, мне падалося, здзіўлена. Нібы тое, што напісаў, друкаваць не збіраўся: паддаўся эмацыйнаму парыву, арганізаваў у нешта стройнае сваё чытацкае ўражанне, і кропка.

— Думаеце.., — няўпэўнена пачаў ён, і не закончыў, сам сябе перабіў. — Не, не, яшчэ папрацую. Падшліфую. Ды сям-там і паказаць трэба, параіцца.

Я сцепануў плячыма — гаспадарова воля. Леанід Януаравіч забраў машынапіс, прабег вачыма пару лістоў. Няўпэўнена прамовіў зноў:

— Можа, наогул не спяшацца? Пачакаць, што скажа Масква? Суславу, ходзіць чутка...

Я не ўтрымаўся:

— Капейка тады будзе цана і вашаму артыкулу, і "ЛіМу"!

Ён уздыхнуў, згадзіўся:

— Так, вядома, так...

"Сям-там" — што значыла, зразумела, у ЦК, — напісанае паказаў, на далёка не адкладваючы. Папярэдне ў машынапісе, што даваў мне чытаць, нешта выкрасліўшы, нешта ў яго дадаўшы. Вярнуўся з паказу настроены бадзёра.

— Адпраўляйце, Уладзімір Львовіч, у набор. Два чалавекі прагледзелі — не забаранілі. А хлопцы асцярожныя. Ты, сказалі, рэдактар, ты і мазгуй.

Я хуценька тое, на што атрымаў дабро, выканаў. Аддадзенае мне не перачытаўшы — чытаў жа! Перарабіў макет чарговага нумара. Замест нечага планаванага раней паставіў "бомбу".

Спешка ледзь не спрычыніла казусу. Дзяжурыў па нумары і, значыць, сядзеў з карэктарамі ў друкарні наш загадчык аддзела публіцыстыкі Міхась Замскі. Я пры вёрстцы газеты наязджаў з рэдакцыі ў друкарню заўсёды. Дык, чытаючы адбітак заўтрашняй газетнай старонкі з "бомбай", дзяжурны занепакоена раптам спытаў:

— Ты "Сотнікава" добра памятаеш? Тут, па-мойму, наблытана.

Я прачытаў радкі, на якія Міхась паказаў. Божачкі! "Шліфуючы" артыкул для паказу "сям-там", дапісваючы новыя абзацы, не адметны педантычнай уважлівасцю аўтар прыпісаў-перадаў Сотнікаву нешта з фактаў, якімі ў аповесці малюецца антыпод Сотнікава Рыбак — да свайго здрадніцтва малайцаваты, смелы чырвонаармеец і партызан. Прокшу пазванілі, ён прымчаўся, прывёз часопіс з падкрэсліваннямі-адкрэсліваннямі. Разгневаўшы карэктараў і друкарскіх рабочых бязбожным роспісам старонкі, блытаніну разам выправілі.

...Як там ні было, 28 жніўня 1970 года "ЛіМ" выйшаў з сенсацыйным артыкулам Леаніда Прокшы "Праўда партызана Сотнікава". Першым друкаваным водгукам на твор, якому наканавана было абляцець свет. Першым добрым словам у савецкім друку пра тое, што Быкаў пісаў пасля "Мёртвым не баліць", пасля шэрагу гадоў раз'юшанага і бессаромнага шальмавання аднаго з лепшых пісьменнікаў сучаснасці. "Паглядзім на праўду такую, якой яна ёсць, а не на такую, якой бы мы хацелі яе бачыць" — прадэкларавание ў рэцэнзіі гэткай пазіцыі было па тым часе НЕЧЫМ.

4

Кульмінацыя сюжэта, які выстройваю, — тое, што пагрымваннем блізкай навальніцы не замарудзіла вакол нашага шэфа закруціцца.

Недзе ў вышынях кіруючай партыйна-дзяржаўнай піраміды, у атачэнні, здавалася тады, вечнага, як несмяротны Кашчэй, Суслава, ці ў якой падпарадкаванай яму структуры, можа, і сапраўды, як дайшла да Леаніда Януаравіча пагалоска, завыспявала разуменне, што стаўленне да Быкава трэба мяняць. Але на ніжэйшыя ўзроўні піраміды, у нашым выпадку на тыя, якія кантралявалі "ЛіМ", каманды пра гэта, відаць, спушчана яшчэ не было. Тут кіраваліся звыклым, столькі часу нязменным: Быкаў — постаць паданафемная. А што двое з даступнай яму прыступкі піраміды, каму Прокша артыкул загадзя паказваў, "не забаранілі" неанафемнае публікаваць, дык у тамтэйшых службоўцаў невысокага чыну было гэта ў бальшыні няпісаным правілам: на сябе ў сэнсе вырашэння нічога не браць — як яно потым павернецца, хіба богу вядома.

Ужо ў дзень, калі газета з артыкулам выйшла, да Прокшы на рабоце зазірнуў Павел Кавалёў, галоўны рэдактар "Полымя".

— Ты хацеў зарабіць трыццаць рублёў? — пры не сама ўзорнай дыкцыі ў Паўла Нічыпаравіча атрымлівалася "трлыццаць". — Дык сказаў бы, я б так табе даў, без тваёй хлапечай бравады!

Ён быў беспярэчным выканаўцам уладай зажаданага, Павел Кавалёў. Вось не мог не разумець: не друкаваць напісанае і прапанаванае Быкавым, пагатоў беларускаму літаратурнаму часопісу, — ганьба. Ды "Сотнікаў" здадзены быў у "Полымя", пэўна, тады ж, калі ў "Новый мир", але ў "Новом мире" ўжо выйшаў да чытача, у "Полымі" ж вычакальна ляжаў.

На пасяджэнні калегіі Міністэрства культуры, членам якой Прокша мусіў быць па пасадзе — "ЛіМ" быў органам і гэтага міністэрства, — порсткі малады намеснік міністра, прачуўшы, трэба думаць, што над пышнакучаравай галавой лімаўскага галоўнага захмарылася, дазволіў сабе яго, чалавека ўдвая старэйшага, падкалоць:

— Пакуль вы яшчэ галоўны рэдактар...

Леанід Януаравіч не заўсёды бываў хуткім у рэакцыях. Але тут адпарываў уміг:

— Мы ўсе, шаноўны NN, на сваіх пасадах п а к у л ь я ш ч э. І ўвогуле на гэтым свеце.

Пачырванеўшы, падколшчык папрасіў прабачэння.

Урэшце, ён, Прокша, выкліканы быў на размову ў ЦК. Да загадчыка аддзела культуры. На цяжкую размову, пры якой яму сказана было, што ў Цэнтральным Камітэце мацнее сумнеў, ці ён той, хто партыі патрэбен на чале найважнай у ідэалагічнай рабоце газеты "Літаратура і мастацтва". Што складваецца аб ім думка, як аб рэдактары некіруемым, якога час памяняць на кіруемага. Сказана было, што ў аддзеле нават пагаворваюць, быццам не сам ён пазіцыйна хісткае напісаў: напісаў, падобна на тое, хтосьці іншы, а ён падпісаў. Сказана было, што можа так стацца — у бліжэйшыя дні яму прыйдзецца тлумачыць сваё ідэйнае крэда на пасяджэнні Бюро ЦК.

Зразумела, пасля выслуханага галоўны прыйшоў у рэдакцыю прыгнечаны. І, падалося, пад уражаннем ад пачутага, што неадобранае напісаў яму хтосьці. Маўляў, глупства, але з нечага от жа гавораць!..

Не па сабе стала і мне. Бо закід той, здагадацца было няцяжка, зроблены быў правакацыйна.

Легендарны "Сказ пра Лысую гару" тады яшчэ не з'явіўся. Аблёт рэспублікі ягонымі з'едлівымі радкамі быў яшчэ наперадзе. Сярод іншых — радкамі, у якіх успамінаецца і маё імя:

Калі да Прокшы "ЛіМ" даехаў,
Але ніхто не гараваў,
А Ул. Няхамкін, ён жа Мехаў,
Адзін газетай кіраваў.

Аднак бязглуздая плётка, што, нібыта, на бязвольнага Прокшу ў вырашэнні рэдакцыйных спраў занадта ўплывае хітры адказны сакратар рэдакцыі, суслілася ўжо тады. Прокша не быў бязвольны — вышэйзгаданае пра тое пераканаўча, па-мойму, сведчыць. Адказны сакратар усяго толькі стараўся добрасумленна і прафесійна выконваць службовыя абавязкі. Тым не менш, ведамствам, адкуль рэдактар прыйшоў адхвастаны, плётка была з насцярожнасцю прынята да ведама — сакратар, там лічылася, трымаўся няўхвальнай арыентацыі, быў, да ўсяго, беспартыйны.

Намёк у закідзе чытаўся найпроста. І ва ўскаламучаным сваім стане Прокша раптам паглядзеў на мяне недружалюбна, раздражнёна. Не так, як звычайна глядзеў — усмешліва-прыязна, — заходзячы да мяне ў кабінецік і бачачы, як я варажу над макетам ці заглыбіўся ў чытанне матэрыялаў. Быццам паверыў — і праўда не ён сам, а я напісаў яму крамольнае, што цяпер выходзіць бокам. Падштурхнуў жа на неадкладнае друкаванне рэцэнзіі, калі ён яшчэ вагаўся — друкаваць, не спяшацца?..

А рэха ад выбуху "бомбы" каціласа. Ва універсітэце студэнты-філолагі перадавалі газету з артыкулам з рук у рукі. У рэдакцыю з дня ў дзень хто-небудзь прыходзіў з просьбай: "У вас, кажуць, надрукавана было добрае пра Быкава. Дайце, калі ласка, прачытаць". Быкаў і сам, Леанід Януаравіч мне адразу пра тое расказаў, ці то пазваніў яму, ці то зайшоў да яго з падзякай. Але ўсё гэта як не радавала аўтара артыкула. Нават трошкі як палохала...

"Некіруемы" Прокша не быў тады, увосень 1970-га, памяняны ў "ЛіМе" на рэдактара "кіруемага" — гэта здарылася пазней. Не адбылося планаванай грознай размовы з ім на пасяджэнні Бюро ЦК.

Тыдні праз тры — падтокавыя для яго і ўсёй рэдакцыі тыдні — прыйшоўшы з работы дамоў, я выняў з паштовай скрынкі "Литературную Россию". Тады гэта была нармальная інтэлігентная газета, не чарнасоценна-шавіністычная, як цяпер. Разгарнуў і... кінуўся тэлефанаваць Леаніду Януаравічу. Бо ўбачыў вялікую, сур'ёзную, вельмі зычлівую рэцэнзію на "Сотнікава" крытыка У. Піскунова. Рэцэнзію, фрагменты якой пафасна ў трубку прачытаў.

Масква пацвярджала: пра Быкава можна пісаць і станоўча. Крамолай не лічыцца. Пад чутку, што ідэалагічны сінод дазволіў у гэтым паслабленне, аб'явіўся відочны грунт.

Узрушаны Леанід Януаравіч, падалося, усхліпнуў:

— Уладзімір Львовіч, дарагі! Гэта... Не знаходжу зараз слова сказаць, што гэта такое!..

5

У "Сотнікава" пачалося шэсце па планеце. Як ужо сказана, зорны лёт. Паводле бібліяграфічнага даведніка, аповесць перакладзена на англійскую, балгарскую, іспанскую, італьянскую, кітайскую, нямецкую, польскую, урду, французскую, хіндзі мовы. Праз паўгода пасля таго, як надрукавана была па-руску ў "Новом мире", з'явілася ў друку і па-беларуску: рэдактар "Полымя" перанастроіўся. Героі і негероі кнігі выйшлі, ды не ў адной інсцэніроўцы, на тэатральныя падмосткі. Ва ўяўленні Ларысы Шапіцькі яны зажылі на экране — праз нядоўгія гады задума стала выдатным фільмам "Узыходжанне". Паданафемны нядаўна пісьменнік заўганароўваўся знакамі афіцыйнага прызнання — пачэснымі званнямі, лаўрэацтвамі, ордэнамі, дэпутацтвам.

Але на першым часе пасля з'яўлення "Сотнікава" незычліўцамі Быкава — іх у яго хапала і хапае — карэкціроўка ўладавых адносін да таго, што ім пісалася, была ўспрынята як непаразуменне, нечае наверсе шкодніцтва, адступленне ў ідэалагічнай барацьбе.

У Магілёве ў абласным тэатры я глядзеў прэм'еру па "Сотнікаву" — потым рэцэнзаваў яе ў "ЛіМе". І сядзеў у глядзельнай зале побач з начальнікам абласнога ўпраўлення КДБ. Ужо не скажу — ці то выпадкова так пасадзіў нас адміністратар тэатра, ці то таму, што мы павіталіся, заўсміхаліся адзін аднаму, сутыкнуўшыся ў прыкасавай бакоўцы адміністратара. Да кадэбоўства чалавек, локаць да локця з якім я быў пасаджаны, сакратарыў у Мінску ў ЦК камсамола. А я ў тыя гады камсамоліў у "Чырвонай змене". Таму былі мы знаёмыя. Дык, мабыць, як здаўна знаёмага, палічыўшы мяне і аднадумцам, гэты нянізкага становішча кадэбовец, калі здрайца Рыбак на сцэне, вызмейваючыся, спрычыньваў сваё здрадніцтва акалічнасцямі, прасіпеў мне на вуха:

— Навучанне будучых здраднікаў!..

Праз паўтара года пасля нашумелага артыкула, ледзь толькі зрабіць тое дазволіў дасягнуты ім узрост, Прокшу спешна адправілі на пенсію. На газету пасаджаны быў кіроўца, з якім неспадзяванак, падобных на Прокшавы, можна было не баяцца, для ЦК было тое самае важнае, дробязі накшталт малапрафесійнасці прызначанага і яго не самых прывабных чалавечых якасцяў пад увагу не браліся.

Быкаў, які жыў тады ў Гродне, прыслаў у "ЛіМ" апавяданне "Круты бераг ракі".

Напомню змест апавядання. На ўпадабаную рыбацкай брацыяй прырэчную кручу штовечар прыходзіць стары. У вайну два яго сыны партызанілі ў пушчы на процілеглым беразе. Малодшы быў хворы на вочы, як змяркалася, кепска бачыў. Але і ён сышоў з дому ў атрад, памагаць партызанам адбіцца, калі пушчу абклалі карнікі. Вярнуцца хлопцы паабяцалі, як адаб'юцца. Дамовіліся: знакам, што ў вёсцы немцаў няма, будзе вогнішча, якое бацька запаліць на кручы. І вось дваццаць пяць ужо гадоў начамі тут паліцца вогнішча — малодшы ж, да ўсяго, кепска ў цемры бачыць! Аднак у вечар дзеі апавядання прышлы разумнік не шкадуе дзеда, што даўно не пры розуме. Адкрывае небараку праўду: маняць яму шкадоблівыя вяскоўцы, сыны яго даўно параць зямлю, вайна скончылася ўга калі. І не загарэўся ў той вечар дзедаў касцёр. З болем у патухлым паглядзе стары паклыпаў з кручы прэч.

Канчаецца апавяданне радкамі:

"Не загарэўся ён і ў наступную ноч.

І, мабыць, не загарыцца ніколі".

Здавалася, глядзі хоць праз лупу — што нябяспечнага тоіць гэты змест для савецкай улады? Якую падкладвае пад яе міну? Тым не менш, яшчэ ў рэдакцыі сакратарствуючы (апошнія месяцы!), я доўга не мог давесці новаму галоўнаму, што надрукаваць апавяданне для яго не рызыкоўна. Што газета, якую мы робім, будзе выглядаць не вартай павагі, калі шчымлівы абразок Быкава з'явіцца ў "ЛіМе" пасля таго, як будзе апублікаваны дзе-небудзь у аўтарытэтным маскоўскім выданні. А што апублікаванне там не задоўжыцца, не сумняваўся: слава Быкава ўвайшла ў зеніт, і залучыць яго як аўтара для разумных рэдактараў стала гонарам.

Ды для разумных. На старонкі ж "ЛіМа", якія мне даводзілася макетаваць, "зялёнае святло" ў тыя месяцы беспярэчна адкрывалася ўбогаму, шэраму, малапісьменнаму, а прысланае Быкавым з рэдактаравага стала не зрушвалася. Калі ж нарэшце зрушылася, і я атрымаў апавяданне для планавання ў нумар, то ўбачыў смешнае. Самы апошні радок у ім — "І , мабыць, не загарыцца ніколі" — рэдактаравай рукою быў выкраслены. Без гэтага журботнага заканчэння "Круты бераг ракі" і быў у "ЛіМе" 13 кастрычніка 1972 года змешчаны. Рэдактару ўчулася ў міноры фразы, калі не міна пад адзіна правільную ідэалогію, дык усё-такі нешта мінападобнае. Не магло ж, быў ён тымі, хто садзіў на пасаду, папярэджаны, у Быкава ды чаго-небудзь такога не быць. Вось і ўпільнаваў.

Цікава, што я нібы ў ваду глядзеў. У той самы дзень 13 кастрычніка 1972 года з апавяданнем "Круты бераг ракі" — па-руску яно названае было "На речном берегу" — выйшлі маскоўскія "Известия". Там фраза, западозраная рэдактарам "ЛіМа" ў падтэкставай антысавецкасці, выкінута не была...

Тым не менш, паўтараю, у гісторыі адносін улады з Быкавым (да месца, мяркую, ужыць тут медыцынскую тэрміналогію — у к а р д ы я г р а м е гэтых адносін!) пасля "Сотнікава" адбыўся пералом, пачалася новая, як бы паслякрызісавая стадыя. Але перад Леанідам Януаравічам Прокшам за вытрыманае ім пасля сумленнага, па тым часе мужнага і дзёрзкага артыкула — ніхто не павініўся.

Эдуард ВАЛАСЕВІЧ



2 верасня 1997 года пасля цяжкай працяглай хваробы памёр беларускі пісьменнік Эдуард Станіслававіч Валасевіч. Наша літаратура страціла таленавітага паэта-сатырыка, байкапісца, драматурга.

Нарадзіўся Эдуард Валасевіч 12 сакавіка 1918 года ў горадзе Магілёве. Вучыўся ў чыгуначнай сямігодцы, два гады працаваў грузчыкам. Потым паступіў на рабфак Магілёўскага педінстытута, перавёўся неўзабаве на яго літаратурны факультэт, які і закончыў у 1941 годзе. Актыўны ўдзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Ваяваў спачатку добраахвотнікам у знішчальным батальёне, затым у дзеючай арміі на Бранскім і Заходнім франтах. У 1943 годзе быў цяжка паранены і дэмабілізаваны як інвалід Айчыннай вайны. Працаваў у Дзяржархіве ў Батумі, а пасля вяртання на радзіму (1944 г.) выкладаў фальклор і рускую літаратуру ў Магілёўскім педінстытуце, загадваў аддзелам рэдакцыі абласной газеты "За Радзіму". У 1952 годзе пераехаў у Мінск, дзе многія гады працаваў у рэдакцыях часопісаў "Полымя" і "Вожык", у выдавецтве "Вышэйшая школа", у Белдзяржфілармоніі, быў дырэктарам Беларускага аддзялення Усесаюзнага агенцтва па аўтарскіх правах.

Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны 2-й ступені, медалямі.

Друкавацца пачаў у 1938 годзе ў газеце "Камунар Магілёўшчыны", першую кніжку "Вершы і байкі" выдаў у 1954 годзе. Асноўным жанрам яго творчасці была сатыра, з цягам гадоў Эдуард Валасевіч стаў адным з вядучых беларускіх байкапісцаў. Гэта засведчылі такія яго кніжкі, як "Залатая рыбка", "Як дбаеш — так і маеш", "Арліны суд", "Соль", "На вясёлай хвалі", "Казёл адпушчэння" і многія іншыя, якіх было выдадзена ім больш двух дзесяткаў. Творы яго вызначаліся высокімі мастацкімі якасцямі. Пяро сатырыка было вострым, крытыка недахопаў — смелая, надзённая, бескампрамісная. Многія вершы шырока выкарыстоўваліся прафесійнымі і самадзейнымі чытальнікамі, на некаторыя з іх былі напісаны песні вядомымі кампазітарамі.

Эдуард Валасевіч пражыў жыццё нялёгка, але прыгожа і сумленна. Як пісьменнік і грамадзянін ён верай і праўдай служыў свайму народу, сваёй Беларусі, здабыўшы тым самым права на нашу глыбокую павагу і на ўдзячную памяць сучаснікаў і нашчадкаў.

Саюз беларускіх пісьменнікаў

АБ'ЯВЫ

МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

ДЗЯРЖАЎНЫ МАЛАДЗЁЖНЫ ТЭАТР ЭСТРАДЫ

праводзяць конкурс

у творчы калектыў тэатра па спецыяльнасцях:

артысты-вакалісты эстрады;
артысты размоўнага жанру;
артысты-інструменталісты (па спецыяльнасцях: клавішныя, ударныя, духавыя інструменты і гітары);
артысты балета.

Конкурсны адбор — з 1 па 25 кастрычніка 1997 года ў памяшканні Дзяржаўнага маладзёжнага тэатра эстрады.

Умовы конкурснага адбору можна атрымаць у тэатры па адрасе: г. Мінск, вул. Маскоўская, 18-а.

Даведкі па тэлефоне: 222-82-96.

Вольгу ІБРАГІМАВУ мы ведаем па астралагічных прагнозах у рэкламнай газеце "Ва-Банк". Незалежна ад таго, хто як ставіцца да такіх прагнозаў, духоўны свет чалавека з экзатычнай прафесіяй заўсёды прываблівае.

Стварыя сябе

— Вольга, у вашага астралагічнага цэнтра ўсходняя, як я разумею, назва. Можа, расшыфруеце для пачатку?

— "Калагія" — санскрыцкае слова, і азначае яно — "стварыя сябе". Слова для мяне самой нечаканае, яно дзіўным чынам "упала" пры рэгістрацыі. Справа ў тым, што першапачатковая назва, якую мы падабралі, ужо праходзіла ў спісе. Давялося тэрмінова мяняць.

"Калагія" — гэта ідэя работы на эвалюцыю, гэта заклік да кожнага з нас выстройваць сваю будучыню. Калі мы чагосьці моцна хочам, калі маем мэту, задачу, арыенцір, — гэтая мэта нас фарміруе. Што, як не астралогія, падкажа нам шлях, зарыентуе на сваю праграму? Астралогія прапануе сістэму бачання, падключае людзей да новага мыслення, новага светаўспрымання.

— "Лухта ўсё гэта — вашыя зоркі і планеты, — скажа матэрыяліст. — Я сам ладжу сваё жыццё".

— І я буду паважаць яго меркаванне. Ёсць людзі, не гатовыя ўспрыняць новае, не гатовыя працаваць над сабой. Закрытасць, адмаўленне — іхняя абарона, і яны маюць поўнае права на такую абарону. Я катэгарычна супраць, каб некаму навязвацца і гвалтам прапаноўваць свае паслугі. Прыйдзе час, і жыццё скажа: "Пара прачынацца". Яно пабудзіць чалавека хваробамі, пакутамі, стратамі, незадаволенасцю...

— І зноў-такі — не ўсе "пачуюць", не ўсе зразумеюць, што ад іх патрабуецца.

— Патрабуецца не так і многа: задумацца пра сябе, змяніць сябе. Зразумець, што за ўсё ў сваім жыцці чалавек адказвае сам. Самае элементарнае, на што мы здольны, — аналізаваць ход падзей: якія вынікі якім учынкам адпавядаюць. Няправільнымі могуць быць не толькі дзеянні, але і пачуцці, і думкі. Незадаволенасць светам — першая прыкмета таго, што чалавек незадаволены сабой. Карані ўсіх нашых праблем — не ў знешнім свеце, а ў нас саміх. Усе мы прыёмнікі; усе падключаны да музыкі сфер, але кожны ловіць тую хвалю, на якую настроены.

— Тое, пра што вы гаворыце, больш стасуецца з псіхалогіяй, чым з навукай аб зорках.

— Астрапсіхалогія — зусім не маё адкрыццё. Існуе цэлы інстытут у Цюрыху, які працуе ў гэтым накірунку. Асаблівасць накірунку ў тым, што астралогія можа выкарыстоўвацца як ключ, як метад псіхалагічнага аналізу, г. зн. — як метад спазнання сябе і іншых. Мяне якраз і цікавіць сутнасць чалавека — усё, што назапасіў ён за жыццё. Гэта першасны зрэз, які відзён з дапамогай астралогіі. І калі я бачу, толькі тады магу адказаць на пытанне "чаму" — чаму так, а не інакш склаўся лёс.

— Мне спадабалася параўнанне з прыёмнікам...

— Прыёмнікі бываюць савецкія, аднахвалевыя. Трошкі папрацуеш, пачысцішся, гарманізуеш сябе, навучышся цярпенню, любові — і дыяпазон хваляў становіцца большым.

— Зыходзячы з таго, што ўсё мае свой пачатак, не магу не спытацца, калі вы ўпершыню адчулі "музыку сфер".

— З дзяцінства ўва мне жыло неўсвядомленае адчуванне: ёсць нешта такое, што не паддаецца разуменню; акрамя бачнага свету, ёсць свет нябачны. Мяне трывожыла тое, пра што дзеці звычайна не думаюць, — страх смерці. Я не магла даўмецца: як гэта так — мяне некалі не будзе? Гэтая болевая кропка і стала, мабыць, рухавіком маёй духоўнай эвалюцыі.

У юнацтве былі няўдалыя спробы пранаямы — дыхальных практык. Хутка зразумела — не маё. З гадамі цяга да незразумелага, патаемнага зрабілася свядомай. Памятаю, як у студэнцтве да мяне прыбегла ўзрушаная сяброўка з дзівосным адкрыццём:

— Душа матэрыяльная!

Не ўсе ведаюць, што ў 70-х гадах сектары, аддзелы, цэлыя інстытуты займаліся закрытымі даследаваннямі ў гэтай галіне. Вынікі іх асядалі ў архівах і бібліятэчных фондах, па кроплі прасочваліся ў свет, даходзілі да ўсіх, хто гатовы іх успрыняць.

— Але ж вы, Вольга, былі фізікам, а не лірыкам: закончылі фізфак БДУ.

— Так. І да ўсяго імкнулася дайсці розумам. Можа таму я не задаволілася Усходнім гараскопам і тым больш хірамантыяй, якой пэўны час займалася. Мяне не задавальняла "чыстая" містыка, па прынцыпе — веру, і мне даецца. Праз пошукі, праз асабістыя адкрыцці, праз кантакты з людзьмі і назіранні (а мне давялося чатыры гады жыць у Індыі) ішла напрацоўка вопыту, ішоў пошук свайго шляху.

— Чым жа прывабіла вас астралогія?

— У астралогіі аб'яднана ўсё: унутраныя патрабаванні, праца, індывідуальнасць. У ёй ёсць сістэма, ёсць логіка, ёсць творчы элемент. Шэсць гадоў я вучылася і вучуся па сённяшні дзень. У часы перамен у грамадстве дзякуючы таварыству "Веды" ў Мінску былі арганізаваны курсы Паўла Глобы. Праз іх прайшлі два патокі слухачоў у паўтары тысячы чалавек. Многім астралогія спатрэбілася для асабістага росту, і такіх большасць. Яны працуюць "для сябе" — так паэты-аматары пішуць "для сябе" вершы. А кожны, хто заняўся гэтай справай усур'ёз, хто адчуў да яе прызванне, праходзіць тры этапы станаўлення. Першы — засваенне азбукі, адназначнасць, катэгарычнасць. Вось знак, вось планета, вось ключ, кожны паказчык накладваецца на чалавека, і выносіцца вердыкт: вось гэта табе можна, а гэта — нельга. Другі перыяд — разгубленасць, усведамленне сваёй недасканаласці; на ім адбываецца праверка — ісці далей ці трэба спыніцца. Адным словам: перш навука, пасля вопыт, і толькі потым — трэці этап — сінтэз, калі мы прыходзім да адназначнасці праз індывідуалізацыю, праз адчуванне чалавека. Гэта і ёсць прафесіяналізм. Толькі з 1995-га года я пачала рабіць платныя гараскопы, а перад тым сотні гараскопаў зрабіла для сябе, блізкіх і сяброў.

— Вы ўпамянулі пра Індыю, а яшчэ раней я звярнула ўвагу на "ўсходняе" афармленне вашага пакоя. У гэтай краіне, кажуць, пабываць карысна. Дык чым была для вас Індыя?

— Паваротным момантам у маім жыцці. Разумееце, я была як усе — як заведзены механізм, як пружына, што асабліва ўласціва людзям Захаду. Індыя са знешніх мэтаў мяне перавярнула на ўнутраны лад, экстраверта, носьбіта "я" ператварыла ў тое, што я ёсць цяпер. Індусы нікуды не спяшаюцца, іх філасофія — прыманне жыцця, і гэта зусім неабавязкова ўсведамляць розумам. Здаровай істотай можна быць і без адукацыі. Гэта іншая форма жыцця, я сказала б — гэта і ёсць паўнавартае жыццё, калі сам час мяняецца, калі можна жыць кожным днём, кожным імгненнем, не прывязваючыся да мінулага і не забягаючы наперад. Я стала прыслухоўвацца да сябе, я перагледзела свае прынцыпы, іх адпаведнасць маім ідэалам. Такі вось момант, напрыклад. У мяне ніколі не было ўмення пастаяць за сябе, у тым ліку і ў матэрыяльным сэнсе. Я лічыла гэта нормай для прыстойнага чалавека. Але, аказваецца, калі ты сам не ацаніў сябе, то і для іншых ты сутнасна як бы не існуеш; людзі не бачаць рэальнасці, яны бачаць толькі тое, як ты сябе трымаеш. Усё гэта трэба было змяніць, правесці самарэвізію, самаацэнку. І ўсё гэта дала мне Індыя. А каб зняць пытанне, як я туды трапіла, скажу: там працаваў мой муж.

— З якімі праблемамі звычайна звяртаюцца ў ваш цэнтр людзі?

— Узроставы спектр самы шырокі. Прыходзяць і дзеці гадоў 18-ці з пытаннем "Як мне жыць?", і пажылыя людзі, якія жадалі б ведаць прычыны сваіх непамыслот. Часам карысна бывае зняць пытанні, не знятыя самім жыццём. У кожнага свая праграма; ведаць яе, ведаць русла, па якім цячэ лёс, — надзвычай важна. Гэта асноўныя, крайнія пункты адліку. А пасярод — пытанні асабовай і прафесійнай рэалізацыі, шлюбных узаемаадносінаў, матэрыяльнага забеспячэння (у тым плане, як стаць незалежным ад бацькоў, мужа і г.д.), здароўя. Чаму мы хварэем: ці яшчэ не займелі неабходнага запасу сіл, ці ўжо патрацілі, неэканомна, негарманічна выкарыстоўваючы? Энергія — як грошы, яе можна траціць па-рознаму...

— І апошняе, недалікатнае, магчыма, пытанне: ці можа астралагічная кансультацыя быць камусьці на шкоду?

— Памятаю выпадак, калі ў "Калагію" звярнулася дзяўчына толькі таму, што на гэтым настойвала яе маці. У мяне тады не хапіла рашучасці ёй адмовіць, але больш такіх збояў я не дапускаю. Я стараюся быць вернай прынцыпу — не будзіце спячага! Бо шкода можа быць адно для тых, хто пакуль што спіць...

Гутарыла
Г. КАРЖАНЕЎСКАЯ

ВЕРНІСАЖ

Малюе Алег Карповіч









ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА ЛіМ
ГАЗЕТА ТВОРЧАЙ ІНТЭЛІГЕНЦЫІ БЕЛАРУСІ

ЗАСНАВАЛЬНІКІ

Саюз беларускіх пісьменнікаў; рэдакцыя газеты "Літаратура і мастацтва"

ВЫХОДЗІЦЬ З 1932 ГОДА

Галоўны рэдактар
Уладзімір НЯКЛЯЕЎ

РЭДАКЦЫЙНАЯ РАДА:
Святлана БЕРАСЦЕНЬ,
Мікола ГІЛЬ — *намеснік галоўнага рэдактара*
Галіна КАРЖАНЕЎСКАЯ,
Жана ЛАШКЕВІЧ,
Алесь МАРЦІНОВІЧ,
Барыс ПЯТРОВІЧ — *першы намеснік галоўнага рэдактара,*
Юрась СВІРКА,
Віктар ШНІП — *адказны сакратар*

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220005, Мінск, вул. Захарава, 19

ТЭЛЕФОНЫ:
прыёмная рэдакцыі — 2332-461
намеснікі галоўнага рэдактара — 2332-525, 2331-985

АДДЗЕЛЫ:
публіцыстыкі — 2332-525
пісьмаў і грамадскай думкі — 2331-985
літаратурнага жыцця — 2332-462
крытыкі і бібліяграфіі — 2331-985
паэзіі і прозы — 2332-204
музыкі — 2332-153
тэатра, кіно і тэлебачання — 2332-153
выяўленчага мастацтва, аховы помнікаў — 2332-462
навін — 2332-462
мастацкага афармлення — 2332-204
фотакарэспандэнт — 2332-462
бухгалтэрыя — 2682-667

Пры перадруку просьба спасылацца на "ЛіМ".
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе.
Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі і думкамі аўтараў публікацый.

Набор і вёрстка камп'ютэрнага цэнтра тыднёвіка "ЛіМ"

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах

Друкарня "Беларускі Дом друку" (г. Мінск, пр. Ф. Скарыны, 77)

Індэкс 63856.
Наклад 5289
Нумар падпісаны ў друк 11.9.1997 г. у 17.30.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 715
Заказ 5134/Г

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12